№ 9 (463) 3 сакавіка 2006 www.nn.by

# Наша Ніва

П Е Р Ш А Я   Б Е Л А Р У С К А Я   Г А З Э Т А

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы

# «У іх свой сход, у нас свой»

Выступ Аляксандра Мілінкевіча. **Старонка 5.**

## Тэлевыступы, якія зьмянілі расклад

Мілінкевіч і Казулін. Вы за каго? **Старонкі 5—8.**

## Чаму прапусьцілі Казуліна?

Нашто ўладзе такі «бязбашанны» кандыдат Казулін? Каб любым коштам аслабіць галоўную альтэрнатыву — Мілінкевіча, мяркуе Віталь Тарас. **Старонка 5.**




МАЛЮНАК ГЕНІКА ЛОЙКІ

—Во Казулін маладзец! Во дзе рэзнуў праўду-матку пра Лукашэнку! Усё! Іду галасаваць за Мілінкевіча...

## Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»

**проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас.**

**Адначасова Рэдакцыя зьвяртаецца з просьбай ахвяраваць на выданьне.**

Дэталі — **старонка 17**.

### Тэхналёгіі ўзьдзеяньня на сьвядомасьць

«Сёньня мы спакойна бачым на прылаўках малако, мяса, масла, тлушчы і так далей…». **Старонка 31**.

### «Мікрафон уласьці»

«У нас у стране ня ўсе п’яніцы і алкаголікі. Ешчо давольна многа людзей, каторыя...». Цытатнік ад Тацяны Барысік — **старонка 37**.

### Менскае каханьне Лі Гарві Освальда

Апавяданьне Паўла Касьцюкевіча. **Старонка 38**.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## Міма галавы

«J_Mors-ы» спалохаліся рок-кароны. Рэпартаж Халімона і Андрэя Скурка. **Старонка 19**.



# у нумары


## палітыка

Чуткі: Віктара Лукашэнку — у Бабруйск ... 4

Аляксандар Мілінкевіч: «У іх свой сход, у нас — свой» ... 5

Мілінкевіч і Казулін. Вы за каго? ... 7

Лябедзька верыць у другі тур ... 7

Невідавочнае ў дэклярацыях прэтэндэнтаў ... 9

Мілінкевіча выпрабоўвалі полацкія вэртыкальшчыкі ... 9

2001—2006: выбары ў параўнаньні ... 10

## грамадзтва

Аўтуховіч уцёк са зброяй ... 4

Белмову прыбяруць з ВНУ ... 4

Забаранілі «Падарожжа дылетанта» ... 7

Рэдактар «Згоды»: Прыкра, што да хору прапагандыстаў далучаюцца незалежныя выданьні ... 9

Найбольшы тыраж «Нівы» быў 8,5 тысяч 20

## хроніка

«Neuro Dubel» у Варшаве, «Крама» ў Любліне, «Indiga» ў Кракаве ... 11

Акцыя салідарнасьці ў Нью-Ёрку 19 сакавіка 11

Сяброў СБП больш не запросяць у школы 16

Сьціслая хроніка рэпрэсій і супраціву ... 12

Мірон за Міронам, штандар за штандарам 14

Герой, падобны да Тома Круза ... 15

## мы самі

Шукаем падпісчыкаў «НН»!!! ... 18

Падзякі ахвярадаўцам 18

## культура

Міма галавы ... 19

Саюз пісьменьнікаў дзеліць лёс свайго народу ... 21

ДзДз: Чаго не хапала мне як носьбіту расейскай мовы ... 22

Эксьлібрыс Улашчыка 36

Да разнастайнасьці імёнаў ... 44

Новы «Дзеяслоў» ... 45

## аўтарскія рубрыкі

Павал Севярынец. Лісты зь лесу ... 12

Аляксандар Класкоўскі. Палітычная кухня ... 24

Лёлік Ушкін. Левым вокам ... 25

Віталь Тарас. Іншымі словамі ... 7

## пішуць чытачы

Пошта Рэдакцыі ... 26

## камэнтары

«Трапны удар, как говорят у нас в Белоруссии» ... 21

Табу на Беларусь ... 30

Тэхналёгія ўзьдзеяньня на сьвядомасьць ... 31

Хадун і луста: мовазнаўцы ў захапленьні ... 35

## наша страва

Кішка ... 34

## літаратура

Што ж ета за празьнік такой? ... 37

Менскае каханьне Лі Гарві Освальда ... 38

Генадзь Айгі. Памёр камандор паэзіі ... 41

Раб на рабе і рабом паганяе ... 42

## калі б…

Вясёлыя карцінкі ... 47


**50 РАДКОЎ РЭДАКТАРА**

# Правал сцэнару “кіраваных выбараў”

Казулін расказаў усё, што ведаў. Няма падставаў не давяраць ягоным расказам — ён жа ва ўсім гэтым удзельнічаў. Карціна адкрылася, скажам шчыра, жудкая. Трохі няясна, праўда, на што разьлічваюць сьпічрайтэры экс-рэктара: няўжо ж выбарцы захочуць памяняць аднаго прадстаўніка гэтай, як Казулін лічыць, “кодлы” на другога?

Казулін гаворыць гучна і пра ўсё, але ні слова — пра выхад народу на плошчу.

Дзіўнаватая гісторыя з вынікамі экзыт-полу (**старонка 24**) за месяц да выбараў пацьвердзіла: ніхто галасоў лічыць не зьбіраецца. У такіх умовах вынік палітычнага працэсу вырашыць толькі лічба ўдзельнікаў вулічнай акцыі пратэсту. Астатняе, што б ні гучала, будзе выпускам пары ў сьвісток.

Можна спрачацца пра крыніцы й мэты актыўнасьці Казуліна — пэўныя аналітыкі называлі яго кандыдатурай Расеі, — аднак адно зь яе вынікае безумоўна: сцэнар “хуткацечных кіраваных выбараў” праваліўся. Рэйтынг дэмакратычнага кандыдата вырас да такой ступені, што ўсім астатнім палітычным гульцам прыйшлося рабіць тэрміновыя захады.

ТВ-выступы кандыдатаў аказаліся самымі эфэктыўным спосабам агітацыі. Ці значыць, што тактыка Мілінкевіча “ад дзьвярэй да дзьвярэй” была памылкаю? Падаецца, менавіта актыўнасьць незалежнага грамадзтва вымусіла ўладу памяняць стратэгію і пачаць складанейшую гульню, прапусьціўшы на экран бесцэнзурныя словы.

Як спалохаліся ўлады сустрэчы Мілінкевіча з выбарцамі на плошчы Свабоды! Лідзія Ярмошына нават назвала яе “амаральнай”. Аляксандар Фядута на гэта заўважыў, што яна як чалавек на тэхнічнай пасадзе дарэмна пераймае на сябе функцыі Героя Беларусі Філарэта і ацэньвае, што маральна, а што не. “Тым больш, што маральнасьць самой спн.Ярмошынай дужа праблематычная”, — іранізуе А.Фядута. Яна, гэтая маральнасьць, напрыклад, маўчыць, калі побач у Палацы Рэспублікі за дзяржаўны кошт іншы кандыдат праводзіць фактычна агітацыйную сустрэчу з выбарцамі, не трывожаць яе і паводзіны дзяржаўных СМІ (nmn.org).

А ў сталіцы робіцца нешта новае. Сёньня я бачыў машыну з партрэтам Мілінкевіча на шыбе. У многіх крамках і ўстановах вісяць вялізныя партрэты Мілінкевіча — што гэта, калі не прыкметы сымпатый. Нарэшце давялося пабыць у адной сядзібе, што мае дачыненьне да ягонай кампаніі: цугам ідуць людзі, патусуюцца-патусуюцца, заграбуць у пакет 20—30 улётак і іншай “друкаванай прадукцыі агітацыйнага характару” і ідуць упрочкі. Кожны, трэба разумець, у свой пад’езд. Так і просіцца на язык: жыве Беларусь.

# Да 100-годзьдзя газэты «Наша Ніва»

**РГА «Беларускі ПЭН-цэнтар»**
**пры падтрымцы газэты «Наша Ніва», часопісаў «ARCHE», «Дзеяслоў», інтэрнэт-выданьняў «Літара.net», «Кнігі.com»**
**абвяшчае**

# КОНКУРС ДЛЯ МАЛАДЫХ ЛІТАРАТАРАЎ

Да ўдзелу запрашаюцца творцы ад 16 да 26 гадоў (на момант абвяшчэньня конкурсу). Ляўрэаты конкурсу будуць запрошаныя на літаратурны сэмінар і майстар-клясы, дзе перад імі выступяць знаныя пісьменьнікі, выкладчыкі ВНУ, вучоныя, сьпевакі, адбудзецца зацікаўленая гутарка аб творах маладых аўтараў і літаратурнай дзейнасьці.

На конкурс прымаюцца літаратурныя творы (вершы, апавяданьні, эсэ, п'есы, сцэнары, дзёньнікі і г.д.).

**Да разгляду будуць прымацца творы, дасланыя (паводле даты на паштовым штэмпэлі або даты адпраўкі электроннага ліста) не пазьней за 15 красавіка 2006 г. Падвядзеньне вынікаў першага туру адбудзецца 25 красавіка. Літаратурны сэмінар пройдзе ў Менску ў першай палове траўня.**

**Журы конкурсу:**

Уладзімер Арлоў, Андрэй Дынько, Ганна Кісьліцына, Барыс Пятровіч, Андрэй Хадановіч.

**Творы дасылайце на адрас:** e-mail: maladylitaratar@tut.by. **Паштовы адрас:** а/с 218, 220050, Менск, РГА «Беларускі ПЭН-цэнтар». У лісьце абавязкова пазначце дату нараджэньня і кантакты (паштовы і электронны адрасы, тэлефоны). **Даведкі праз электронную пошту ці тэлефон (017) 284-73-29.**



# Аўтуховіч уцёк са зброяй

Арыенціроўка на Аўтуховіча: «Варожа ставіцца да існуючага ладу».

У Рэдакцыю трапіла арыенціроўка на РОСШУК ваўкавыскага прадпрымальніка Мікалая Аўтуховіча, што распаўсюджваецца па каналах Міністэрства ўнутраных справаў.

Нагадаем: М.Аўтуховіча вінавацяць у парушэньнях падатковага заканадаўства. Зь яго хочуць спагнаць вялікія штрафы. Сам прадпрымальнік абвінавачваньняў не прызнае, лічыць іх помстай за самастойнасьць і нежаданьне «дзяліцца» з уладай.

Арыштаваны, ён дамогся вызваленьня шляхам 74-дзённай галадоўкі. Яго выпусьцілі пад хатні арышт, адкуль ён зьнік немавед куды.

У арыенціроўцы ўражвае пазнака: «Нэгатыўна ставіцца да існуючага дзяржаўнага ладу і Кіраўніка дзяржавы» (слова «кіраўнік» у тэксьце — зь вялікай). Ці то гэта абцяжваючая, ці то аблягчаючая акалічнасьць.

Зьвяртае ўвагу, што М.Аўтуховіч уцёк са зброяй.

Сябар прадпрымальніка Ўладзімер Асіпенка заявіў радыё «Свабода», што з часу зьнікненьня ён ужо двойчы дасылаў зьвесткі пра сябе на электронную пошту, у якіх проста паведамляў, што ягонае здароўе не паляпшаецца.

Сп.Асіпенка таксама расказаў, што жонка Аўтуховіча Алена зьехала некуды, а дачку Кацю глядзіць бабуля. Дарэчы, да школы Кацю возіць адзін з кіроўцаў — каб чаго ня вырвалася, зазначае Ўладзімер Асіпенка.

**Мікола Бугай**



Автухович Николай Николаевич, 1963 года рождения, уроженец г. Волковыска, прописанный по адресу: Гродненская обл. г. Волковыск, ул. Жолудева, 149-17, проживающий: г. Волковыск, ул. Красноармейская, д. 15, директор фирмы «ИП Автухович», обвиняемый в совершении преступления по ч. 2 ст. 243 УК РБ.

Автухович Н.Н. негативно относится к существующему политическому строю и Главе государства.

9.02.2006 года Автухович Н.Н. совершил побег из под домашнего ареста. Вооружен, имеет газовый пистолет «SUPER PP», 9 мм, охотничье гладкоствольное ружье «ТОЗ-34Е» кал. 12, №36640 1986 г., охотничье оружие с нарезным стволом «Classic Mannliher» кал. 30-06 Spr. (7,62 x 54) №1032599, предположительно штуцер ИЖ-18 МН.

Во время пребывания в СИЗО, до домашнего ареста, объявил голодовку, в ходе которой потерял 30 кг (учитывать при опознании по фото).

# Чуткі: Віктара Лукашэнку — у Бабруйск

Прыклад азэрбайджанскага прэзыдэнта Гейдара Аліева, які перадаў уладу сыну, блукае па Беларусі.



**Віктар Лукашэнка (справа) з бацькам.**

Пайшлі чуткі, што неўзабаве старшынём Бабруйскага гарвыканкаму стане ня хто іншы, як Віктар Лукашэнка — старшы сын кіраўніка краіны, ягоны памочнік па пытаньнях бясьпекі — фактычна кантралёр усіх сілавых структураў.

Бабруйск — горад ня бедны («Белшына»). Да таго ж на восень тут прызначаныя «Дажынкі», ёсьць таксама праект пабудовы лядовага палацу.

«Ды вы што?! Я такога шчасьця не хачу», — адказаў В.Лукашэнка на пытаньне «Камсамольскай праўды», ці ня думае ён пра пасаду прэзыдэнта. Гэта быў 2003 год. У 2011-м Віктару споўніцца 35 — мінімальны ўзрост, неабходны для балятаваньня.

Трэба адзначыць, што з год таму В.Лукашэнку ўжо сваталі на пасаду кіраўніка Баранавіч.

**Сяржук Г., Бабруйск**

# Белмову прыбяруць з ВНУ

З наступнага навучальнага году можа быць адмененае вывучэньне беларускай мовы на нефілялягічных факультэтах ВНУ. Такую інфармацыю атрымала «НН». Абавязковае вывучэньне роднай мовы ў гуманітарным курсе ВНУ — апошні здабытак беларусізацыі 90-х, які захаваўся да нашых дзён. Па камэнтар мы зьвярнуліся ў Міністэрства адукацыі.

Міністэрскія чыноўнікі з управы вышэйшай і сярэдняй спэцыяльнай адукацыі простага адказу на пытаньне не даюць. Начальніца аддзелу вышэйшай адукацыі Галіна Хацешава кажа, што «адбываецца перагляд курсу гуманітарных і грамадзкіх навук» у ВНУ: «Згодна з заданьнем прэзыдэнта, гэты курс будзе скарочаны, але на колькі гадзін, на якія прадметы — пакуль невядома. Яшчэ толькі распрацоўваюцца праекты».

Ня ўнесла яснасьці й кіраўніца сэктару выкладаньня грамадазнаўчых дысцыплінаў Надзея Ганушчанка: «Пакуль што мы карыстаемся нарматывамі, зацьверджанымі ў 1999 г. Наконт праектаў нічога сказаць не магу, бо праекты могуць мяняцца. Дарэчы, той праект, пра які згадвалі вы, таксама нядаўна быў зьменены».

Значыць, рашэньне аб выдаленьні мовы з унівэрсытэцкага курсу яшчэ не прынятае. Але калі такі дакумэнт і прымуць, мы даведаемся пра яго толькі постфактум. Ні пра якое публічнае абмеркаваньне няма гаворкі, калі ёсьць «заданьне» самага шматпрофільнага спэцыяліста краіны.

**АШ**

# Аляксандар Мілінкевіч: «У іх свой сход, у нас — свой»

«Сёньня ў Менску праходзіць «усебеларускі народны сход» — гэта прафанацыя, марная трата нашых з вамі грошай. Не зважайце на тое. Наш сход будзе 19-га — сапраўды народны і ўсебеларускі», — заявіў кандыдат ад дэмакратычных сілаў. 28 лютага ён запісаў праграмны тэлезварот да беларускіх грамадзянаў. Выступ будзе паказаны на БТ 2 сакавіка а 18.30. Для тых, хто не пабачыць яго, прапануем асноўныя палажэньні звароту.

### Чаму ўлада павінна зьмяніцца?

«Чаму 19 сакавіка ўлада мусіць зьмяніцца? Бо 12 год — дастатковы тэрмін. Кожны гэта разумее. Усё, што ён мог, чаго хацеў, за 12 год зрабіў. Болей, лепей ён ужо нічога не прыдумае і ня зробіць. Гэта закон жыцьця, палітыкі».

На ягоную думку, такое доўгае кіраваньне аднаго чалавека непазьбежна вядзе да злоўжываньняў і маральнае дэградацыі, а ў трэці тэрмін да гэтага дадасца яшчэ дзяльба ўласнасьці хаўрусьнікамі. «Як будзеце ў Менску 19 сакавіка — заедзьце ў Драздны, паглядзеце, якое там адбудавана царскае сяло», — заклікаў А.Мілінкевіч. І гэта толькі бачны бок, між тым многае застаецца схаваным ад людзей, бо «органы нагляду за законнасьцю падначалены выканаўчай уладзе і таму маўчаць», а «незалежная прэса забаронена». Ён прынёс з сабой у студыю стос забароненых выданьняў.

«Мы яшчэ за галаву схопімся, калі даведаемся пасьля выбараў існы стан рэчаў», — заявіў А.Мілінкевіч.

«Справа Жураўковай, справа Рыбакова, справа Іванова. Гэта ж прэзыдэнтавы людзі, ім прызначаныя. У любой якой іншай краіне прэзыдэнт мусіў бы несьці адказнасьць за такія прызначэньні. Чаму Жураўкова, што скрала мільёны даляраў, памілавана? Чаму памілаваны Іваноў? Пасьля 19 сакавіка мы вернемся да гэтых справаў і перадамо іх на паўторны разгляд у суд, калі трэба».

### Мы адкрыем рынак збыту

Далей кандыдат у прэзыдэнты расказаў пра сваю каманду і праграму.

«Да ўлады ідзе моцная каманда зь яснай і выгаднай для краіны праграмай. У камандзе 12 тысяч чалавек, 6 акадэмікаў і сяброў-карэспандэнтаў Акадэміі навук, 22 дактары навук, 114 кандыдатаў навук».

Ён назваў каманду А.Лукашэнкі «шклоўскім кланам», а аб'яднаўчымі прынцыпамі сваёй кааліцыі назваў «вернасьць прынцыпам свабоды, законнасьці і дэмакратыі».

Выступ па эканамічным блёку А.Мілінкевіч пачаў з энэргетычнага пытаньня. «Мы разумеем, што гэта будзе асноўная задача новага ўраду: забесьпячэньне бесьперапыннасьці паставак і прымальнасьці цэнаў на газ і нафту. Мы ўжо працуем над гэтай задачай, як з Усходам, так і з Захадам». Ён намякнуў, што гэтым былі абумоўленыя ягоныя візыты ў Маскву й Бэрлін перад пачаткам выбарчай кампаніі».

> Усё, што ён мог, чаго хацеў, за 12 год зрабіў. Болей, лепей ён ужо нічога не прыдумае і ня зробіць.

Ён назваў Эўропу «агромністым надзейным рынкам збыту на вякі для нашых заводаў, калгасаў, фірмаў і кампаніяў. Гэта будзе будучыня ня толькі наша, але і нашых унукаў». На ягоную думку, А.Лукашэнка няздольны адкрыць гэты рынак для беларускай эканомікі. «Такіх, як Лукашэнка, там ня прымуць. Эўропа ж бо прайшла дыктатуру Гітлера. Дыктатары былі ў Гішпаніі, Грэцыі — усе ад іх пазбавіліся».

А.Мілінкевіч паўтарыў сваё абяцаньне давесьці за пяць гадоў сярэдні заробак у краіне да 550 эўра. Ён таксама паабяцаў заканадаўча забараніць зацьвярджэньне пэнсіяў ніжэй пражытковага мінімуму.

### Асабістая мара — «фольксваген»

А.Мілінкевіч падзяліўся «сваёй асабістай марай» — пабудаваць у Беларусі завод легкавых аўтамабіляў. «Фольксваген» запросім. Новы, а не патрыманы аўтамабіль — такім я бачу сацыяльны стандарт для кожнага. Дарэчы, абяцаю: пакуль беларускага заводу па вытворчасьці легкавікоў ня будзе, мы скасуем мытныя пошліны на ўвоз аўтамабіляў.

### Гарадзенец сяла не папсуе

Пра сельскую гаспадарку А.Мілінкевіч гаварыў амаль столькі ж, колькі аб прамысловасьці. Ён паабяцаў аднавіць парытэт цэнаў на сельскагаспадарчую і прамысловую прадукцыю і бюджэтных укладаньняў у горад і сяло. «Вы мне паверце: ураджэнец Гарадзенскай вобласьці сельскагаспадарчую палітыку не папсуе», — пажартаваў ён.

Ён абверг думку, што эканамічнаму росту краіна заўдзячвае А.Лукашэнку: «Хай вам ня маняць. Багата што робіцца ў краіне незалежна ад дзяржаўнай улады. Рост эканомікі людзі робяць, вось і эканоміка расьце. Тут Лукашэнка ці Мілінкевіч ні пры чым, ня трэба спэкуляваць. Ведайце, у дамах як было цяпло, так і будзе. Што трэба мяняць, дык гэта палітычную сыстэму, стаўленьне да чалавека трэба мяняць. Зьменяцца дачыненьні дзяржавы і грамадства, у нас будзе ня ўлада сілы, а ўлада закону. Прэзыдэнт Мілінкевіч будзе заўсёды трымацца закону. Але прэзыдэнт Мілінкевіч ня будзе пераўтвараць сябе ў імпэратара, а грамадзянаў — у халопаў. Гэта не ў маёй традыцыі».

> У маёй камандзе 12 тысяч чалавек, 6 акадэмікаў і сяброў-карэспандэнтаў Акадэміі навук, 22 дактары навук, 114 кандыдатаў навук.

### Я беларус і гэтым ганаруся

А.Мілінкевіч падкрэсьліў: «Я працілегласьць Лукашэнку. Ён савецкі чалавек, ён сам гэта прызнаваў. Я беларус і ганаруся гэтым. Я пэўны, што наступным прэзыдэнтам Беларусі будзе не савецкі чалавек, але беларус. Сама гісторыя дыктуе гэта.

Ніякая ў нас цяпер не рэспубліка, ніякая не дэмакратыя. Беларусь пераўтворана ў абсалютную манархію. У манархію! 7 лістапада леташняга году хлопец у Гомелі выйшаў на мітынг з плякатам

Працяг на старонцы 6.

# Аляксандар Мілінкевіч: «У іх свой сход, у нас — свой»

Працяг са старонкі 5.

«Далоў самадзяржаўе». Што ж вы думаеце — яго арыштавалі!

Вось сёньня ў Менску праходзіць усебеларускі народны сход — гэта прафанацыя, марная трата нашых з вамі грошай. Не зважайце на тое. Наш сход будзе 19-га — сапраўды народны і сапраўды ўсебеларускі».

## Вы ведаеце мой род

А.Мілінкевіч асобна зьвярнуўся да некаторых групаў насельніцтва.

Зьвяртаючыся да настаўнікаў, ён прыгадаў свайго бацьку — дырэктара школы, кавалера ордэну Леніна. «Я ведаю, якая цяжкая ваша праца. Такая ж высакародная, як праца доктара ці хлебароба, — сказаў ён. — Зьвяртаюся найперш да вас, шаноўныя пэдагогі, бо вы, як ніхто, ведаеце, якую міну пад будучыню краіны закладвае цяперашняя падманная ўлада… Ведаеце, як хлусьня спараджае хлусьню. Як мана плодзіць ашуканства, зладзейства».

Пэнсіянэраў ён папрасіў 19 сакавіка «галасаваць сэрцам».

Кандыдат ад дэмакратычных сілаў заклікаў моладзь у гэты месяц «кінуць усё і аддаць сябе цалкам Бацькаўшчыне». «Не пашкадуеце! Паверце, такіх дзён, такога драйву ў вас, можа, за цэлае жыцьцё больш ня будзе». Ён агітаваў: «Кажыце сваім сябрам: ёсьць іншая музыка, ёсьць музыка Свабоды. Няма на сьвеце нічога лепшага за яе. І мы яе пачуем 19 сакавіка!»

Зьвяртаючыся да вернікаў, ён працытаваў словы зь літургіі: «Дай нам Бог стойкасьці ў веры, мужнасьці ў выпрабаваньнях і вернасьці свайму народу» — і зь Сьвятога Пісьма: «Па справах іхных пазнаеце іх». «Вы ведаеце мае справы, ведаеце справы майго бацькі, майго дзеда, які за арганізацыю беларускіх школаў сядзеў у польскай турме, маіх прадзедаў, што поплеч з Каліноўскім змагаліся за незалежнасьць Беларусі. Мае продкі пад кулі, у турму ішлі за Беларусь, за нашу мову, за нашу праўду. Хто будзе за праўду, калі ня вернікі?» Ён заклікаў усіх маліцца, каб 19 сакавіка Бог паслаў Беларусі прасьвятленьне.

«Час Свабоды блізкі. Вашы ахвяры ня марныя. Будзьце сэрцам з намі 19 сакавіка», — зьвярнуўся ён да палітвязьняў, пералічыўшы іх пайменна. Ён таксама заклікаў «маці і жанок вязьняў сумленьня — зьніклых, беспадстаўна арыштаваных, зьбітых, абылганых» — прыйсьці 19 сакавіка на плошчу і ўстаць поплеч зь імі. «Імёнамі самых дарагіх вам людзей будуць названы вуліцы нашых гарадоў», — паабяцаў ён.

> «Фольксваген» запросім. Новы, а не патрыманы аўтамабіль — такім я бачу сацыяльны стандарт. Абяцаю: пакуль беларускае вытворчасьці легкавікоў ня будзе, мы скасуем пошліны на ўвоз аўтамабіляў.

## Пазнаемся па сінім

Сваю пэўнасьць у перамозе А.Мілінкевіч грунтуе на зьвестках незалежных сацыёлягаў. Каб прыхільнікі пераменаў бачылі адзін аднаго, ён прапанаваў у якасьці знаку нашага адзінства — «сіні колер».

Ён папярэдзіў, што перад 19-м улада рыхтуе правакацыі з падкіданьнем зброі, валюты, падманных дакумэнтаў, і ўсклаў адказнасьць на А.Лукашэнку і заклікаў да стойкасьці: «Калі мы не адстаім свайго выбару 19-га, іншага шанцу на свабоду доўга можа ня быць» і краіну можа чакаць «лёс Паўночнай Карэі».

## Людзі пакляліся

А.Мілінкевіч папярэдзіў, што рыхтуецца фальсыфікацыя вынікаў галасаваньня. «19-га ад 10-й раніцы тэлебачаньне будзе абвяшчаць па ўсіх каналах, што Лукашэнка набірае 80% галасоў. Нахабна, ня лічачы, не дачакаўшыся канца галасаваньня».

«Але мы будзем ведаць рэальны вынік выбараў, — паабяцаў ён. — Мы абвесьцім яго на плошчы. Любымі спосабамі дабірайцеся да Менску, 19-га, да 20-й гадзіны. Будуць прысутныя ўсе сусьветныя і расейскія тэлеканалы. Будуць сотні незалежных назіральнікаў. І будзем мы, нас будуць дзясяткі тысяч. Толькі на плошчы вы даведаецеся сапраўдныя вынікі галасаваньня. І няхай улада на 74 тысячы чальцоў выбарчых камісіяў уключыла, нібы сьмеючыся над усімі намі, толькі аднаго нашага прадстаўніка. Але ў нас ёсьць свае людзі ў камісіях, якія пакляліся даведацца і сказаць праўду, чаго б ім гэта ні каштавала».

### З апэляцыяй да сілавікоў

А.Мілінкевіч заявіў рэзка: «Я вам скажу: для гэтага рэжыму ня важна, як вы галасуеце. Толькі людзі на вуліцах змогуць іх працьверазіць».

Ён амаль даслоўна паўтарыў словы А.Лукашэнкі, але з супрацьлеглым пасланьнем: «Толькі народ вырашыць будучыню сваёй краіны. Толькі беларускі народ! Калі мы прайграем, я тамсама, на плошчы шчыра прызнаю сваю паразу. Але калі я набяру болей ад паловы галасоў, пераход улады будзе ажыцьцёўлены згодна з Канстытуцыяй, пад пільным кантролем сілавых структураў».

> Толькі на плошчы вы даведаецеся сапраўдныя вынікі галасаваньня.

Выхад на плошчу ён таксама абгрунтаваў традыцыяй разам сустракаць вынікі выбараў, што існуе ў розных краінах і ў Беларусі.

Да сяброў сваёй каманды ён зьвярнуў наступныя словы: «Мая каманда вядзе выключна сумленную кампанію. Гэта наш прынцып. Што робіць улада? За час кампаніі сілавыя структуры затрымалі 220 нашых актывістаў. Тым ня менш, хлопцы і дзяўчаты — цярпім! Цярпім да 19 сакавіка. Я прашу сваіх актывістаў: нават калі вас будуць біць ніжэй поясу, не паддавайцеся на правакацыі. Мы ідзём на перамогу. Калі толькі што-кольвек зробіце несумленна, гэта будзе для іх зачэпкай. Мы выйграем сумленна».

А.Мілінкевіч паўтарыў сваю прапанову А.Лукашэнку правесьці тэледэбаты ў жывым этэры.

«Наша перамога непазьбежная, як сьвітанак», — так скончыў ён тэлезварот.

# Чаму Казуліна прапусьцілі

Нашто ўладзе такі «безбашенный» кандыдат Казулін? Каб любым коштам аслабіць Мілінкевіча, мяркуе **Віталь Тарас.**

Самым важным і знамянальным у выбарчай кампаніі ў момант, калі пішуцца гэтыя радкі, уяўляецца факт выступу апазыцыйных кандыдатаў па БТ. Нават ня зьмест сэнсацыйных выступаў абодвух кандыдатаў, але вонкавая адсутнасьць рэакцыі ўлады на яго. Зразумела, у недзяржаўнай прэсе водгукаў хапала. Але і тут палітыкаў і журналістаў цікавіў, здаецца, ня столькі аналіз выступаў, колькі той факт, што яны выйшлі ў этэр без купюраў. Усе пачалі задавацца адным і тым самым пытаньнем на розны лад: чаму?

## Загад ёсьць загад

Адным зь першых сваё тлумачэньне даў Янаў Палескі на сайце nmnby.org. На ягоную думку, прапагандысцкая сыстэма (сетка з буйнымі дзіркамі, паводле вызначэньня аўтара) проста дала збой. Нехта там на тэлебачаньні нешта недагледзеў, не зразумеў, паставіўся абыякава да сваіх абавязкаў.

Больш наіўнае тлумачэньне цяжка прыдумаць. Калі б «збой» адбыўся недзе ў канцельні камунальнай службы, работнік якой нападпітку забыўся ўключыць гарачую ваду, ці на чыгунцы, дзе стрэлачнік забыўся перавесьці стрэлкі, гэта было б цалкам натуральна. Аднак калі дае «збой» галоўная частка дзяржаўнай прапагандысцкай машыны, неаднаразова правераная ды нанова адладжаная адмыслова пад выбары, тут ужо выпадковасьці выключаюцца. Інакш трэба было б зрабіць выснову, што на прэзыдэнцкім тэлебачаньні ды ў адміністрацыі працуюць спрэс дурні. Гэткія фантазіі нагадваюць пасьляваенныя савецкія фільмы, дзе мужным партызанам і бліскучым выведнікам процістаялі дэбільныя карыкатурныя фашысты.

Так, у прафэсійным пляне журналісты БТ талентамі не вылучаюцца. Але ж ня трэба забывацца, што пераважная большасьць іх мае другую прафэсію, якая патрабуе зусім іншых талентаў. Ва ўсялякім выпадку, што такое субардынацыя і як трэба выконваць загады начальства, яны ведаюць дасканала.

Так што, выдаўшы ў этэр выступы Мілінкевіча і Казуліна, яны ўсяго толькі выканалі загад. Доказам можа служыць тое, што дзяржаўнае тэлебачаньне не адрэагавала на абодва выступы — ні ў той самы дзень, ні наступным днём не зьявілася нават камэнтароў з гэтай нагоды. Праўда, кіраўнік дзяржавы, гаворачы аб намеры нарошчваць моц узброеных сілаў і органаў бясьпекі, як бы ўскосна скрытыкаваў, не называючы імёнаў, прапанову Мілінкевіча паставіць дзейнасьць спэцслужбаў у цывілізаваныя рамкі. Асабістыя ж абвінавачаньні Казуліна ў свой адрас Лукашэнка прапусьціў між вушамі.

Не адрэагаваў і ЦВК. Без аніякіх тлумачэньняў камісія вырашыла «пакуль» не рабіць заўвагаў кандыдату ў сувязі зь ягонымі празьмерна «эмацыйнымі» заявамі ў тэлеэтэры. Дзіўная паблажлівасьць, калі ўспомніць, што падчас рэгістрацыі кандыдатаў старшыня ЦВК Ярмошына ня стала чакаць. Яна адразу зрабіла вельмі рэзкую заўвагу Казуліну ў сувязі зь ягонымі словамі, якія датычылі кнігі Алкаева «Расстрельная команда». Менавіта гэтыя пасажы, нагадаем, былі выразаныя на БТ з рэпартажу аб паседжаньні Цэнтравыбаркаму і менавіта яны зрабіліся ўдарнымі момантамі выступу Казуліна ў мінулую сераду. Не прадбачылі? Не пасьпелі выразаць? Не наважыліся «падкараціць» кандыдата, саромеючыся назіральнікаў БДІПЧ АБСЭ? Кожнае з гэтых меркаваньняў выглядае фантастычным.

Ці не прасьцей зрабіць выснову, што скандальны імідж, які ўжо створаны вакол Казуліна, дзякуючы СМІ і ягоным уласным паводзінам, задавальняе дзяржаўную прапаганду?

## Два імгненьні вясны

Выпадкова ці не, але першы выступ Мілінкевіча па тэлебачаньні папярэднічаў выступу Казуліна, а не наадварот. Як казаў герой «17-ці імгненьняў вясны» Штырліц, суразмоўца найлепш запамінае з размовы апошнюю фразу. І глядач таксама.

Эфэктная сцэна з разрываньнем газэты «Беларусь сегодня» з фатаграфіямі Лукашэнкі і Ярмошынай нібыта вянчала тэлевізійны міні-сэрыял. Яна стала свайго роду фінальным акордам у двухактавай п’есе, дзе паводле законаў драматургіі кульмінацыя й разьвязка наступаюць у апошняй частцы. Якім бы прадуманым, шчырым і сур’ёзным ні быў маналёг першага ўдзельніка, пра якія б важныя рэчы ён ні казаў, усё адно глядач мусіў быў запомніць і запомніў фінал. На наступны дзень толькі й гаворкі было пра казулінскія эскапады, ягоную манеру зьвяртацца да галоўнага апанэнта на «ты» і ўменьне «рэзаць праўдуматку». На тле такога героя адзіны кандыдат ад апазыцыі выглядаў куды менш эфэктна. Стала відавочна, што калі над тэкстам ягоныя памочнікі папрацавалі няблага, дык над сцэнаром ды іміджам трэба працаваць ня менш, выглядае, забыліся. (Між іншым, выступы кандыдатаў на дзяржаўным радыё, апублікаваныя загадзя ў Інтэрнэце, самі сабою пакідаюць даволі слабое ўражаньне. Усё-ткі вонкавы выгляд, інтанацыі, унутраны энэргетычны зарад адыгрываюць вельмі важную, калі не вырашальную ролю ва ўспрыняцьці асобы.)

У словах Казуліна скразілі шчырая крыўда на кіраўніка дзяржавы, імкненьне зьвесьці зь ім рахункі. Складваецца ўражаньне, што ў гэтым сваім жарсным жаданьні ён гатовы пайсьці да канца. Відавочна, улада не даруе яму асабістых выпадаў супраць вышэйшага кіраўніка, і кандыдат гэта цудоўна ведае. Фактычна, сваім выступам Казулін перайшоў рубікон, і ў асабістай мужнасьці яму не адмовіш. Гэтым ён адрозьніваецца і ад Уладзімера Жырыноўскага, хамскія эскапады якога заўсёды паблажліва ўспрымаліся прэсай і ўладамі, і ад Аляксандра Лукашэнкі, які нярэдка паводзіў сябе падчас сваіх першых прэзыдэнцкіх выбараў на мяжы фолу. Хаця рысы абодвух гэтых палітыкаў у асобе былога рэктара яўна прысутнічаюць. І можна не сумнявацца, што менавіта гэтыя рысы могуць запомн-

Працяг на старонцы 28.

### Што хочаш прыдумаюць

Улады Менску прыдумалі хітры спосаб, каб зашкодзіць выхаду людзей на сустрэчу зь Мілінкевічам на плошчы Свабоды 2 сакавіка. На гэты дзень і час, акурат а 18.00, практычна ва ўсіх школах Менску прызначаныя бацькоўскія сходы.

*belaruspartizan.org*

### Вяртаюцца часы «ахранкі»

Гарадзенскіх дворнікаў узброілі рацыямі, каб інфармаваць улады аб падзеях у мікрараёнах, — паведамляе сайт belngo.info. Мяркуецца, што дворнікі будуць паведамляць пра зьяўленьне ўсяго забароненага. Падобная практыка ўжо існавала ў царскай Расеі, калі дворнікі былі «добраахвотнымі памочнікамі» ахранкі.

**Мікола Бугай**

### Забароненае «Падарожжа дылетанта»

Праграму «Падарожжа дылетанта» зьнялі з этэру БТ. Вядучы праграмы Юры Жыгамонт заявіў, што кіраўніцтву БТ не спадабалася няправільная падача інфармацыі. Іван Жахлівы, аказваецца, вызваліў Беларусь ад усяго польскага і літоўскага, а Кастусь Каліноўскі быў польскім здраднікам, які хацеў прадаць Беларусь Польшчы. «Яшчэ мне было сказана, што звароту «панове» ў Беларусі ніколі не было, а трэба казаць «уважаемые зрители». На БТ кажуць, што прычыны закрыцьця праграмы ў тым, што яна мела нізкі рэйтынг і была слабай у прафэсійным сэнсе.

Ю.Жыгамонт пакуль ня ведае, ці ўдасца з «Дылетантам» перайсьці на іншы канал.

### Лябедзька верыць у другі тур

У камэнтары для расейскай газэты «Время новостей» лідэр Аб'яднанай грамадзянскай партыі заявіў: «Наша задача, каб Лукашэнка не набраў неабходныя 50%. Гэта дасьць ягоным палітычным праціўнікам усе падставы патрабаваць другога туру». На думку Анатоля Лябедзькі, Лукашэнка ўжо ня здольны заваяваць падтрымку большасьці, а А.Мілінкевіч не пасьпявае набраць яе да 19 сакавіка.

**Аглядальнік**

# Тры суб'ектыўныя правільнасьці

Ці правільна зрабіў Мілінкевіч, што выступаў на БТ на дзьвюх мовах? Адказаць на гэтае пытаньне мы папрасілі як інтэлектуалаў, так і падпісчыкаў «НН».

**Валер Булгакаў, рэдактар часопісу «ARCHE»:**

Думаю, так. Тэлевізійная аўдыторыя, якой была адрасаваная прамова, — зусім унікальная. Гэта не інтэрнэтчыкі і не чытачы апазыцыйнай прэсы. Каб зацікавіць яе, трэба выглядаць не звычайна.

**Пётра Рудкоўскі, філёзаф, манах-дамініканец:**

Наколькі «правільным» было такое рашэньне, ёсьць і застанецца пытаньнем адкрытым, бо ў гэтым выпадку само паняцьце «правільнасьці» неакрэсьленае. «Правільным» можна назваць жаданьне Мілінкевіча інтэграваць грамадзтва, яго беларускамоўную і расейскамоўную частку. «Правільнай» трэба лічыць установку на нерэвалюцыйнае, негвалтоўнае вяртаньне нацыянальных каштоўнасьцяў. «Правільнай» таксама трэба лічыць павагу да фактаў, якой кіруецца Мілінкевіч. Гэтыя тры суб'ектыўныя «правільнасьці» і абумовілі мову выступу. Для чалавека, адной з галоўных амбіцыяў якога ёсьць лагодзіць падзелы ў грамадзтве, такая тактыка апраўданая. Я перакананы, што Мілінкевіч, стаўшы прэзыдэнтам ці застаўшыся ў апазыцыі, застанецца верным сваім адраджэнскім перакананьням і будзе далікатна стымуляваць працэс беларусізацыі, унікаючы памылак радыкалаў пачатку 90-х гадоў.

**Ірына Бугрова, палітоляг, каардынатарка праграмаў у Менскім міжнародным адукацыйным цэнтры:**

Ён у гэтым сэнсе быў вельмі карэктны і дакладны. Калі б Мілінкевіч выступаў як просты грамадзянін, ён мог бы выбіраць мову, якой карыстаецца кожны дзень. Але як кандыдат у прэзыдэнты ён павінен быў будаваць свой выступ іначай.

**Вольга Ахрук, настаўніца з Горадні:**

Не, я за тое, каб ён выступаў толькі пабеларуску.

**Аляксей Крукоўскі, выкладчык Беларускага ліцэю:**

Думаю, што гэта не пашкодзіла яго іміджу, і мне спадабалася. Хоць пра яго практычна нічога не гавораць у прэсе, усё ж імідж «бээнэфаўца» за ім цягнецца. І выступ па-расейску — гэта апераджальны ўдар.

**Фёдар Квасавец (Талачын), 78 гадоў:**

Добра зрабіў. А як іначай? Пераламіць сытуацыю сёньня ня проста. Гаварыў ён парасейску, а на пытаньні адказваў і па-расейску, і па-беларуску. З часам усё пераменім!

# Мілінкевіч і Казулін? Вы за каго?

**Міхаіл Чыгір, былы прэм'ер-міністар Беларусі:**

— Аддам голас Казуліну. Ён — карэктны, ціхамірны, а Мілінкевіч зьвязаны з БНФ, яны шмат зрабілі памылак. А Казулін супрацоўнічаў з прэзыдэнтам, я мяркую, так будзе і надалей.

**Уладзімер Ваўчкоў, тэнісіст:**

— Аддам голас Аляксандру Рыгоравічу Лукашэнку. Бо я паезьдзіў па сьвеце, паглядзеў, як людзі жывуць, бачыў, што там дзеецца і што такое дэмакратыя.

**Уладзімер Ганчарык, экс-кандыдат у прэзыдэнты:**

— Калі зь іх двох выбіраць, дык Казуліну. Казулін дэмакратычнейшы. Мілінкевіч — хутчэй наступальны тыпаж. Але ўсё залежыць ад таго, як будуць разьвівацца падзеі. Можа быць, Казулін зь Мілінкевічам яшчэ аб'яднаюцца.

*Elections.belapan.com*

**Андрэй Саньнікаў, ініцыятар «Хартыі'97»:**

Мілінкевіч — кандыдат празрысты, ён прайшоў дэмакратычны адбор на нашых вачох. Яго плятформа — плён калектыўнае працы прафэсіяналаў. Хто і што стаіць за Казуліным, пакуль няясна. Хацелася б верыць, што ён фігура самастойная ці, як найменей, гатовы ёй стаць.

*Naviny.by*

**Генадзь Бураўкін, паэт:**

У Мілінкевіча ўсё ёсьць, што павінна быць у палітыка эўрапейскага ўзроўню. Ён не стараўся агаломшыць людзей, сябе падаць выгадна. Адказы яго былі абсалютна спакойнымі, разумнымі і не спэкулятыўнымі. Можа быць, яму нейкай харызмы не хапала асабістай, то мне ўжо ад гэтай харызмы, якая ёсьць у краіне, моташна.

*www.svaboda.org*

# Невідавочнае ў дэклярацыях прэтэндэнтаў

**Сярэднямесячная пэнсія супрацоўніка КДБ** (бацькі С.Гайдукевіча) у Беларусі складае 852 тыс. рублёў у месяц. Для параўнаньня: пэнсія работніка МТЗ (бацькі А.Казуліна) складала 260 тыс.

**Сярэднямесячны заробак А.Лукашэнкі** за мінулы год склаў 4,9 мільёна рублёў. За пяць гадоў ён вырас у 15,6 разоў, калі лічыць у рублях, і ў 11,5 разоў, калі лічыць у даляравым эквіваленце. Сярэдні заробак беларусаў за той жа пэрыяд вырас у 3 разы.

**Заробак старшага сына Лукашэнкі** складаў 2 мільёны 570 тысяч. Пры гэтым дзеці А.Лукашэнкі, трэба разумець, езьдзяць на дзяржаўных аўтамабілях — прынамсі, дэклярацыя паказвае, што сваіх яны ня маюць, а пешкі іх ніхто ня бачыў.

**Лукашэнкаўцы лічаць, што імя** меншага сына Мілінкевіча — Вітаўт — можа нэгатыўна адбіцца на папулярнасьці таты. Іначай не патлумачыш, чаму імёны дзяцей і ўнукаў, якія ня маюць прыбытку, ня ўказваюцца, акрамя ягонага.

# Рэдактар «Згоды»: Прыкра, што да хору прапагандыстаў далучаюцца і незалежныя выданьні


PHOTO.BYMEDIA.NET

У дачыненьні да газэты «Згода» пачатая крымінальная справа паводле ч.1 арт.130 КК «Распальваньне расавай, нацыянальнай ці рэлігійнай варажнечы». Падстава: передрук карыкатур на прарока Мухамада. 22 лютага ў рэдакцыі і на кватэры галоўнага рэдактара Аляксея Караля прайшоў ператрус. А.Кароль адказвае на пытаньні «НН».

**«Наша Ніва»: Кажуць, што публікаваліся карыкатуры дзеля прыцягненьня ўвагі да газэты. Нашто друкавалі?**

**Аляксей Кароль:** Мы друкавалі карыкатуры не на прарока. Адзін з малюнкаў — выява барадатага мужчыны з бомбай у чалме —быў надрукаваны на знак нязгоды з тым, што сапраўдныя тэрарысты выкарыстоўваюць рэлігійныя пачуцьці вернікаў у сваіх мэтах. Але той нумар газэты выпускаўся ў маю адсутнасьць і адзінае, што я пасьпеў зрабіць, гэта спыніць распаўсюд. Цяпер вельмі хісткі час, каб так падстаўляцца. Адначасова зьператрусамі ў рэдакцыі, БТ паказвала пра гэта рэпартаж, у якім передумоваў для распальваньня расавай і рэлігійнай варажнечы было куды больш, чым у газэце. У цывілізаваным сьвеце на друкаваныя выданьні не заводзяць крымінальныя справы і іх не пераследуюць спэцслужбы. Улады скарысталіся момантам. І прыкра бачыць, што да зладжанага хору дзяржпрапагандыстаў далучаюцца некаторыя незалежныя выданьні.

**«НН»: «Згоду» праз ваша сяброўства ў ініцыятыўнай групе А.Казуліна лічаць органам Грамады. Ці можна лічыць друк карыкатураў афіцыйнай пазыцыяй партыі?**

**А.К.:** «Згода» ніколі не была нічыім друкаваным органам. Газэта пазыцыянуе сябе як незалежнае выданьне. Мы месцамі больш незалежныя, чым «НН». Прынамсі не аддаем перавагу камусьці аднаму з кандыдатаў.

**«НН»: А.Фядута напісаў: я ня бачыў карыкатураў, але асуджаю іх публікацыю ў беларускіх незалежных выданьнях. Гэта, маўляў, нашкодзіла дэмакратычным сілам.**

**АК:** Сапраўды, гэта недаравальны крок, як на сёньня, друкаваць такія малюнкі зь якой заўгодна мэтай. Дзяржава скарыстала з гэтага, каб абвінаваціць усіх, хто ня згодны з уладамі, а не кагосьці канкрэтна з палітыкаў: маўляў, факт публікацыі карыкатураў сьведчыць пра падрыхтоўку да процілраўных дзеяньняў у часе выбараў, дэстабілізацыі сытуацыі. Па тэлевізары поруч з інфармацыяй пра завядзеньне супраць газэты крымінальнай справы паказваюць кадры з Сэрбіі, Украіны. Але цяпер рэдакцыя атрымлівае знакі падтрымкі ад замежных калегаў, ад арганізацыі «Рэпартэры бязь межаў». І ніхто зь іх не папракае нас карыкатурамі.

**Запісаў Сямён Печанко**

# Мілінкевіча выпрабоўвалі полацкія вэртыкальшчыкі

25 лютага адзіны кандыдат ад дэмакратычных сілаў Аляксандар Мілінкевіч сустракаўся з выбаршчыкамі на поўначы краіны — у Віцебску, Наваполацку й Полацку.

Наваполацкія ўлады далі дазвол на сустрэчу толькі ў чацьвер, таму газэты паведаміць пра візыт кандыдата не пасьпелі. Шмат новапалачанаў даведалася пра яго ад сябра ініцыятыўнай групы адзінага, камуніста Вячаслава Крышталёва — ён узяў партыйны мэгафон ды пайшоў па вуліцах, запрашаючы гараджанаў на сустрэчу. Але поўная заля гарадзкога палацу культуры не сабралася, прысутнічала 500 чалавек.

Сустрэча ў Наваполацку пачалася з паўгадзінным спазьненьнем, Мілінкевіч затрымаўся ў Віцебску. Спачатку адзіны выклаў асноўныя палажэньні перадвыбарчай праграмы. Заля падтрымлівала свайго кандыдата гучнымі аплядысмэнтамі. У залі было шмат студэнцкай моладзі.

У Полацку мерапрыемства атрымалася больш гарачым. Нават вэртыкальны «Полацкі веснік» даў абвестку пра сустрэчу. Праводзілі яе ў гарадзкім Палацы культуры з заляй на 270 месцаў — людзі стаялі ў праходах. Варта зазначыць, што рэпрэсіўныя захады, якія пракаціліся па Полаччыне напярэдадні візыту Мілінкевіча, дасягнулі свайго — на сустрэчы не было паловы мясцовых грамадзкіх актывістаў. Людзі баяцца згубіць працу. Найбольш актыўна падтрымку кандыдату дэманстравалі прадпрымальнікі.

На сустрэчу прыйшла прадстаўнічая дэлегацыя старых і цяперашніх выканкамаўскіх работнікаў, якія занялі два першыя шэрагі. Калі справа дайшла да пытаньяў, яны дружна заатакавалі госьця хатнімі нарыхтоўкамі. Мілінкевіч пасьля двух сустрэчаў выглядаў стомленым, але пытаньні апанэнтаў не ігнараваў — адказваў на самыя бязглуздыя. Выбіць яго з каляіны не ўдалося.

Большасьць прысутных палачанаў ставілася да кандыдата зь вялікай сымпатыяй, не аднойчы заля рэагавала на словы Мілінкевіча гучнымі аплядысмэнтамі.

Сустрэча скончылася позна ўвечары.

**Васіль Кроква, Полацак**

# 2001—2006: выбары ў параўнаньні

| | 2001 год | 2006 год |
|---|---|---|
| Колькасьць зарэгістраваных ініцыятыўных групаў | 23 | 8 |
| Колькасьць асобаў, зарэгістраваных кандыдатамі ў прэзыдэнты | 4 (Лукашэнка, Домаш, Гайдукевіч, Ганчарык) | 4 (Лукашэнка, Мілінкевіч, Гайдукевіч, Казулін) |
| Калі быў вызначаны адзіны кандыдат ад апазыцыі | За 52 дні да выбараў (21 ліпеня) | За 169 дзён да выбараў (2 кастрычніка) |
| Колькасьць подпісаў, сабраных за Лукашэнку | 395 000 | 1 903 069 |
| Колькасьць подпісаў, сабраных за кандыдата ад дэмакратычных сілаў | 164 000 (Домаш) | 198 000 (Мілінкевіч) |
| Адрас галоўнага альтэрнатыўнага канкурэнта | Дом прафсаюзаў, Абласны савет прафсаюзаў (працоўныя плошчы штабу — каля 4 000 м$^2$) | Офіс ПКБ, Управа БНФ (працоўныя плошчы штабу — каля 270 м$^2$) |
| Аляксандар Мілінкевіч | Кіраўнік кампаніі кандыдата ў прэзыдэнты Сямёна Домаша | Кандыдат у прэзыдэнты |
| Аляксандар Казулін | Рэктар БДУ | Старшыня БСДП (Грамада) |
| Уладзімер Ганчарык | Кандыдат у прэзыдэнты | Пэнсіянэр, сябра штабу А.Казуліна |
| Сямён Домаш | Кандыдат у прэзыдэнты | Дырэктар дзяржаўнага прадпрыемства «Гарадзенская гарбарная фабрыка» |
| Сяргей Калякін | 1-шы сакратар ЦК ПКБ, кандыдат у прэзыдэнты | 1-шы сакратар ЦК ПКБ, кіраўнік штабу А.Мілінкевіча |



А.Лукашэнка—2001.



PHOTO.BYMEDIA.NET

Уладзімер Ганчарык (у цэнтры) падчас канцэрту ў яго падтрымку. Побач — Міхаіл Чыгір.

Мінулыя прэзыдэнцкія выбары праходзілі на пачатку восені, 9 верасьня, і на іх увесь дзень ліў халодны дождж. Гэтыя адбудуцца 19 сакавіка — напярэдадні галоўнага нацыянальнага сьвята, Дня Волі.

Умовы-2001 для перадвыбарнай агітацыі з вышыні цяперашняга досьведу падаюцца ледзь не цяплічнымі.

На выбарах 2001 г. подпісы зьбіралі 23 кандыдаты. Былі, праўда, яшчэ два — бібліятэкарка Ніна Лабанава і пэнсіянэр Уладзімер Лапцэвіч, якім не зарэгістравалі ініцыятыўныя групы, бо першая паўпісвала туды ў выбарачным парадку чытачоў сваёй бібліятэкі, а другі — тэлефонны даведнік. Але набралі патрэбную колькасьць подпісаў тады толькі чатыры чалавекі. Як і сёлета.

Уладзімер Ганчарык, адзіны кандыдат ад апазыцыі, у 2001 годзе зрабіў стаўку на тэму зьніклых палітыкаў. Сёлета галоўны Лукашэнкаў канкурэнт — Аляксандар Мілінкевіч — сьвядома вядзе выключна пазытыўную кампанію, амаль не камэнтуючы



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Аляксандар Мілінкевіч выступае на плошчы Перамогі пасьля рэгістрацыі.**

| | | |
|---|---|---|
| Леанід Кал | кандыдат у прэзыдэнты | |
| Віктар Шэйман | Генпракурор | Кіраўнік штабу А.Лукашэнкі |
| Мечыслаў Грыб | Кіраўнік кампаніі па незалежным назіраньні за выбарамі | Кіраўнік штабу А.Казуліна |
| Мікалай Чаргінец | Кіраўнік штабу А.Лукашэнкі | Старшыня Саюзу пісьменьнікаў Беларусі |
| Наклад газэты «Советская Белоруссия» | У будні — 240 000; у суботы — 311 000 | 502 340 |
| Супольны наклад незалежнай прэсы (без «Комсомольской правды в Беларуси») | 350 000 асобнікаў | 130 000 асобнікаў |
| Колькасьць зарэгістраваных NGO | 2 500 | Каля 1 500 |
| Сярэдні заробак па краіне | 100 даляраў | 240 даляраў |
| Рэйтынг адзінага кандыдата ад апазыцыі за два месяцы да выбараў у пары з А.Лукашэнкам (зьвесткі прафэсара Манаева) | 8% | 24% |
| Рэйтынг А.Лукашэнкі ў сярэднім (зьвесткі прафэсара Манаева) | 43% | 52% |
| Перадвыбарчы лёзунг А.Лукашэнкі | За моцную і квітнеючую Беларусь! | За Беларусь! |
| Перадвыбарчы лёзунг галоўнага канкурэнта | Дабро вашаму дому! (У.Ганчарык) | Свабода. Праўда. Справядлівасьць (А.Мілінкевіч) |

**А.Лукашэнка—2005.**


AP

дзеяньняў і крокаў А.Лукашэнкі.

Эканоміка Ўсходняй Эўропы, і беларуская разам зь ёю, за пяць гадоў выблыталася з постсавецкага крызісу. Таму рэйтынгі Лукашэнкі-2006 вышэйшыя за ягоныя пазыцыі ў 2001-м. Аднак і апазыцыя зрабіла свае высновы, і А.Мілінкевіч, дзякуючы ранейшаму старту, распачаў агітацыйную кампанію з адносна вышэйшых паказчыкаў.

Што засталося нязьменным, дык гэта ўменьне ўладных паліттэхнолягаў ствараць у масе народу ўпэўненасьць у перамозе А.Лукашэнкі і адначасовая здольнасьць лідэраў апазыцыі пасеяць зерне надзеі ў ральлі незалежнага грамадзтва.

«Суцяшае ўжо тое, што Мілінкевіч і Казулін — нашмат мацнейшыя кандыдаты, чым Ганчарык і Домаш», — напісаў у лісьце ў «НН» наш менскі чытач Алесь Чорны.

**Яўген Васілеўскі**



**Павал Севярынец** — у 1998—2004 лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту». Асуджаны за арганізацыю акцыяў пратэсту пасьля рэфэрэндуму 2004 году. Цяпер у высылцы ў Малым Сітне, на поўначы Полаччыны.

## ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ

# Крыж як

Выход у лясную дзялянку — нібы першыя кадры з блёкбастэру «Глядыятар». Надзяваеш каску, быццам шлем, распраўляеш плечы ў зімовай амуніцыі, у руках баявая сякера, за сьпінай ляскат брані (гусенічны трактар) — і пад ціхі сьнег спускаесься да яловага ўзьлеску, дзе ў гушчары цябе пільнуе пагрозьлівая цемра. Тут, у беларускім партызанскім лесе, ты можаш адчуць сябе дружыньнікам князя Ўсяслава, можаш — ваяром Вітаўта, можаш — селянінам з Іванску, які ў 1564-м пад Чашнікамі засёк маскоўскага ваяводу Шуйскага, можаш — паўстанцам Каліноўскага... Ты ўрубаесься ў гушчыню зваленых дрэваў, сячэш сучкі ды верхавіны, ажно да праўдзівага ваяўнічага ражу, крышыш ворага ў капусту... І раптам ачомваесься: гэтак жа сьпехам, сьціснуўшы зубы, мы абсякалі гольле з паваленых дрэваў у Курапатах, уначы пасьля атакі спэцназу. Ставілі новыя крыжы замест раструшчаных бульдозэрамі.

Тыя з маладых абаронцаў, хто пазьбег арышту падчас сутычак ды аблавы, сабраліся тады ля разбураных амонаўцамі намётаў. Некаторыя адчайна крычалі: «Да зброі! За сякеры — і на АМОН!..» Хрысьціяне настаялі: ставіць наноў крыжы і станавіцца самім.

Усю ноч мы абчэсвалі ствалы, секлі на папярэчыны, зьбівалі ў крыжы, перавязвалі вяроўкамі, капалі ямы... Ох, і цяжка было падымаць тыя крыжы! Наранiцу і бульдаўнікоў, і тэлевізійнікаў, і АМОН сустракалі дзясяткі новых крыжоў і жывы ланцуг абаронцаў. Сячэш з пляча, адвальваеш убок гольле, якое сьцябае па твары, прарубаесься далей —

і згадваеш байцоў-маладафронтаўцаў, якія былі тады, у курапацкім хвойніку, поплеч — стаялі з крыжамі, сядзелі ў намёце, цясьніліся на нарах — а цяпер пад «крыміналкамі».

Артура Фінькевіча, які падчас кампаніі «Беларусь — у Эўропу!» аб'езьдзіў з агітацыяй дзясяткі мястэчак ды вёсак, пасьля вулічных акцыяў правёў на «сутках» больш 4-х месяцаў, а цяпер на Валадарцы, дзе за надпіс «Мы хочам новага!» можа атрымаць да шасьці гадоў.

Зьмітра Касьпяровіча, які яшчэ 16-гадовым хлопчыкам пратрымаўся рэкордныя 22 кілямэтры на прабегу за свабоду Шыдлоўскага й Лабковіча, якому пару гадоў таму міліцыянты адбілі рукі й ногі за «Горад — наш!» на Залатой Горцы, які цяпер у ізалятары.

Паўлюка Красоўскага, які вывозіў з Жодзіна па

## СЬЦІСЛА

### Герой за кратамі

**Зьмітра Касьпяровіча**, зьвінавачанага ў злосным хуліганстве за спробу вывесіць нацыянальны сьцяг на Менгарвыканкаме, 27 лютага асудзілі на 5-месяцовы арышт. За кратамі хлопец з 17 студзеня.

### Студэнты ў абарону сяброўкі

З Акадэміі вэтэрынарнай мэдыцыны ў Віцебску 25 лютага адлічылі моладзевую актывістку другакурсьніцу **Любоў Кучынскую**. Афіцыйная прычына — непасьпяховасьць (3 няздадзеныя іспыты). Зварот да кіраўніцтва акадэміі ў абарону дзяўчыны падпісалі больш за 100 студэнтаў: яны лічаць выключэньне пакараньнем за яе палітычную дзейнасьць.

### Школьніка трасуць за налепку

У Жодзіне 21 лютага міліцыянты затрымалі 10-клясьніка **Дзяніса Чэркаса**, бо ў яго на сшытку была налепка «Я за свабоду». Яны ўварваліся ў кабінэт, каб праверыць заплечнік юнака, і завезьлі вучня ў пастарунак.

23 лютага ў Сьветлагорску міліцыянты перагрэсьлі заплечнікі 10-клясьнікаў **Алега Гайдучэнкі** й **Антона Сьвяколкіна**, актывістаў ТБМ: у горадзе зьявіліся налепкі пра ману дзяржаўных тэлеканалаў. Такія ж налепкі знайшлі ў хлопцаў. У камісіі ў справах непаўналетніх ім пагражалі за налепкі штрафамі 1 млн руб.

### Суды адкладзеныя

Судовы працэс у справе **Тацяны Хомы** і адміністрацыі БДЭУ, прызначаны на 23 лютага, перанесены.

Суд над моладзевымі актывістамі з Барысава **Аляксандрам Казаковым** і **Зьмітром Зубром**, зьвінавачанымі ў супрацьдзеяньні міліцыянтам, 23 лютага не пачаўся: абвінавачаным не даставілі своечасова позвы, каб яны маглі пазнаёміцца з матэрыяламі справы.

### Скрабца вывезьлі ў турму

**Сяргея Скрабца** 26 лютага накіравалі ў калёнію «Віцьба-3» у пасёлку Віцьба Віцебскай вобласьці.

### Забаранілі перадаваць Біблію

Актывісты незарэгістраванай арганізацыі «Малады фронт» 23 лютага перадавалі **Артуру Фінькевічу**, які знаходзіцца ў сьледчым ізалятары (СІЗА) №1 Менску прадукты харчаваньня й іншыя рэчы. Супрацоўнікі СІЗА адмовіліся перадаваць арыштанту Біблію, бо яна не ўваходзіць у пералік дазволеных для перадачы выданьняў.

### Ператрусы ў назіральнікаў

У Магілеве 21 лютага ператрус адбыўся ў **Аксаны Закрэўскай**, **Сяргея Лапуціна**, у Быхаве — у бацькоў **Аляксея Купрэева**, у Наваполацку — у **Зьмітра Салаўёва**, **Аляксея Трубкіна**, **Ганны Корбы**, у Полацку — у **Дзяніса Салдаценкі**, у пас.Баравуха (Полаччына) — у **Анатоля Каханчыка**. 22 лютага адбыўся ператрус у Берасьці ў **Іны Апанасенкі**. У Пружанах ператрус адбыўся ў кватэры **Алеся Дайнэкі**, якога змушалі прызнацца, што ён уваходзіць у «Партнэрства».

### У Віцебску

Прадпрымальніка **Ануфрыя Рамановіча** 21 лютага Віцебскі суд аштрафаваў на 5 базавых велічыняў (145 тыс.) за распаўсюд друкаванай прадукцыі без выходных зьвестак. Пры ператрусе ў ягоным офісе 3 студзеня канфіскавалі 58 тыс. каляндарыкаў з партрэтам А.Мілінкевіча.

**Барыса Хамайду** накоратка затрымалі 22 лютага падчас пікету з заклікам байкатаваць прэзыдэнцкія выбары.

23 лютага падчас расклейкі абвестак пра сустрэчу з А.Мілінкевічам былі накоратка затрыманыя **Віталь Броўка** й **Зьміцер Караткевіч**. На іх склалі пратаколы за антысанітарыю.

У Віцебску падчас распаўсюду «Народнай волі» накоратка затрыманыя моладзевыя актывісты **Дзяніс Дзянісаў** і **Максім Волкаў**. У іх канфіскавалі 415 асобнікаў газэты.

### У Гомелі

У Гомелі 21 лютага на прыватную кватэру, арандаваную **Сяргеем Старычэнкам**, актывістам штабу Аляксандра Казуліна, праніклі маёр міліцыі й людзі ў цывільным. Гаспадар кватэры сьцьвярджае, што ня ведае, якім чынам міліцыянты адамкнулі дзьверы. Яны спрабавалі высьветліць асобы прысутных (адбываўся сход актывістаў выбарчага штабу) і здымалі іх на відэакамэру.

**Сьвятаслава Шаламава** 21 лютага аштрафавалі на 10 б.в. (290 тыс.) за парушэньне Выбарчага кодэксу: пры затрыманьні 8 лютага ў яго канфіскавалі налепкі зь лягатыпамі беларускіх тэлеканалаў і надпісам «Нам хлусяць», а таксама ўлёткі-карыкатуры на тэлеканалы. Актывіста беспадстаўна зьвінавацілі, што ў яго ўлётках быў заклік не галасаваць за дзейнага прэзыдэнта. У яго кватэры супрацоўнікі КДБ правялі ператрус.

23 лютага міліцыянты канфіска-

# прыцэл для перамогі

дваццаць-трыццаць маладафронтаўцаў на кожную буйную менскую маніфэстацыю, чакае суду за «зьнявагу дзяржаўных асобаў...».

Сячэш і сячэш, да зьнямогі, да апошняга сучка, каб пазбавіць думкі ад другаснага, лішняга і пакінуць толькі стрыжань, ствол... Загатоўку для агромністага крыжа.

Усе яны ставілі курапацкія крыжы й станавіліся перад будаўнічай тэхнікай, выдатна ўсьведамляючы, што такое бульдозэры й дубінкі. Але яны верылі, што Бог ня дасьць сьвятыню на глум. І крыжы былі аднаўленыя. Курапаты захаваліся. Паўсьвету ўбачыла, што Беларусь жыве. Бо крыж зьнішчыць немагчыма. Крыж — гэта сымбаль дабра, якое трыюмфуе ня гвалтам, але духам. Сымбаль Хрыста, Чый сьцяг мы нясём як знак Адраджэньня. Сымбаль Бога, Які прыняў пакуту за ўсіх людзей — і перамог.

Ніхто з гэтых хлопцаў ня ўзяўся за каменьні ды заточкі на дэманстрацыях, хаця з кожнага зьдзекаваліся, зьбівалі, арыштоўвалі. Ніхто не пайшоў вывучаць «энцыкляпэдыю тэрарыста», хаця дзе-небудзь на Ўсходзе паліцэйскія ўчасткі высадзілі б у паветра за куды меншыя «подзьвігі», чым у нашага АМОНу. Ніводзін не пачаў рыхтавацца ў снайпэры, хаця ў гэтых загартаваных хлопцаў рука цьвёрдая й вока пільнае. Яны ўзялі іншы прыцэл: кожны зь іх узваліў на плечы свой крыж.

У бітве за Беларусь, якая разгарнулася на мяжы тысячагодзьдзяў ад нараджэньня Хрыста, мы прынцыпова выбралі шлях ахвярнага змаганьня. Ня зброяй. Словам. Сьцягам. Крыжам. Негвалтоўны, аксамітны шлях.

Дабро ў супрацьстаяньні са злом заўжды перамагае. Рана ці позна. Але перамога не даецца лёгка. Таму і глядзець на яе мы мусім не праз оптыку снайпэрскай стрэльбы, а праз прыцэл крыжа.

Перад вулічнымі маніфэстацыямі ня трэба ўяўляць сябе глядыятарам. Прыпадабняйцеся Хрысту. Не бярыце з сабой ані арматуры, ані камянёў. Вазьміце веру і мужнасьць у сэрцы. Ня бойцеся — бо «даў нам Бог духа ня страху, але сілы, любові й мудрасьці» (ІІ да Цімафея 1:7).

Рыхтуйцеся! У нашым крыжовым прыцэле — 19 сакавіка.

*Малое Сітна*

Ніводзін не пачаў рыхтавацца ў снайпэры, хаця ў гэтых загартаваных хлопцаў рука цьвёрдая й вока пільнае.

## СЬЦІСЛА

валі ў групы актывістаў А.Мілінкевіча 1400 афіцыйна выдадзеных улётак. Кіраўнік групы **Андрэй Толчын** паведаміў, што канфіскавалі таксама стэнд з партрэтам адзінага кандыдата, стол і крэсла.

25 лютага міліцыянты накоратка затрымалі агітатараў з групы А.Мілінкевіча **Сяргея Трыфанава** й **Леаніда Ўдовенку**: іх зьвінавацілі, што агітавалі ў неналежным месцы. У пастарунку ў іх сканфіскавалі больш за 150 буклетаў адзінага кандыдата і ўлёткі.

**Андрэя Аксёнава** і **А.Толчына** накоратка затрымалі 25 лютага. У кожнага зь іх канфіскавалі складны столік, на якім былі раскладзены ўлёткі Мілінкевіча. Міліцыянты тлумачаць, што столікі канфіскуюцца на падставе ўказу Аляксандра Лукашэнкі №31, які забараняе загрувашчваць вуліцы ды іншыя месцы грамадзкага карыстаньня.

26 лютага падчас распаўсюду буклетаў Мілінкевіча накоратка затрымалі **Пятра Кузьняцова** і **Зьмітра Залатарова**. У затрыманых 26 лютага **Юрася Захаранкі**, **Кацярыны Гаўрыленкі**, **Леаніда Тужыка** канфіскавалі складныя стол і крэсла, а таксама буклеты.

Калі **Анатоля Паплаўнага** спрабавалі 26 лютага завесьці ў пастарунак за распаўсюд агітацыйных улётак, ён сеў у сьнег. Несьці агітатара міліцыянты не схацелі.

Падчас распаўсюду «Народнай волі» 26 лютага накоратка затрыманыя сёстры **Алена** й **Галіна Працко**.

### У Ветцы

У Ветцы 21 лютага падчас раздачы газэтаў «Народная воля» і «Товарищ» накоратка затрымалі **Марыю Багдановіч** і **Людмілу Судзілоўскую**. Міліцыянты патлумачылі затрыманьне тым, што ня ведаюць такіх газэтаў.

### У Рагачове

21 лютага ў Рагачове затрыманы аўтамабіль **Валер’я Рыбчанкі**: у яго канфіскавалі 600 асобнікаў газэты «Народная воля» і 4000 асобнікаў выданьня «Товарищ». З часам газэты вярнулі.

26 лютага ў Рагачове падчас распаўсюду буклетаў Мілінкевіча й «Народнай волі» накоратка затрыманыя **Ўладзімер Хадасевіч** і **Ўладзімер Тамковіч**. Іх абвінавацілі, што агітавалі ў не прызначаным для гэтага месцы — на рынку.

### Скарыстаўшыся з карыкатураў

У рэдакцыі газэты **«Згода»** 22 лютага адбыўсяператрус у зьвязку з перадрукам карыкатураў на прарока Мухамада. Супрацоўнікі КДБ правяліператрус таксама ў кватэры галоўнага рэдактара й выдаўца **Аляксея Караля**. Рэдактара й ягонага намесьніка **Аляксандра Зьдзьвіжкова** пыталі ў КДБ. Распачатая крымінальная справа за распальваньне расавай нацыянальнай ці рэлігійнай варажнечы і розьні (арт.130 ч.1 КК).

### Дамоклаў меч над Хэльсынскім камітэтам

27 лютага Мін’юст вынес папярэджаньне **РГА «Беларускі Хэльсынскі камітэт»** за нявыплату 157 млн руб. падаткаў у бюджэт: гэта грошы, якія БХК атрымаў у рамках праграмы TACIS. Мін’юст абавязвае арганізацыю заплаціць грошы цягам месяца. Тым часам БХК яшчэ абскарджвае судовае рашэньне.

### Землякоў запалохваюць

У судзе Зэльвы 22 лютага аштрафавалі на 145 тыс.руб. **Германа Радыгіна**, зьбіральніка подпісаў за Мілінкевіча.

У Астраўцы позву на допыт да пракурора 22 лютага атрымала **Ніна Вішнеўская**, якая зьбірала подпісы за Мілінкевіча і Аляксандра Казуліна.

Пракурор Бярозаўскага раёну завёў справу пра адміністрацыйнае правапарушэньне на сацыял-дэмакрата **Аляксандра Кузьміна** і **Ларысу Мажэйку** зь Белаазёрску, актывістаў групы Казуліна: іх вінавацяць, што збор подпісаў дaручылі іншым людзям.

### У Магілёве

21 лютага ўвечары ў Магілёве накоратка затрыманы **Ўладзімер Шанцаў**, які перавозіў 26 000 перадвыбарчых улётак А.Мілінкевіча і 400 асобнікаў газэты «Товарищ». Улёткі ў міліцыі пералічвалі ўсю ноч. Урэшце вярнулі з прабачэньнямі. Прычым самі прывезьлі.

### У Наваполацку

22 лютага затрымалі студэнта-трэцякурсьніка **Яўгена Радчыкава**: ён прымацаваў да сьцяны будынку налепку «Мы хочам новага». У міліцыі на яго склалі пратакол за вывешваньні абвестак у не прызначаных для гэтага месцах.

### У справе Фінькевіча

Моладзевым актывістам **Аляксею Шыдлоўскаму** і **Аляксандру Атрошчанкаву** 23 лютага дадому затэлефанаваў сьледчы Першамайскага раёну Менску і запрапанаваў 24 лютага зьявіцца на допыт як сьведкў у справе актывіста незарэгістраванага «Маладо-

**Працяг на старонцы 14.**


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Мірон за Міронам, штандар за штандарам

Актывіста беларускага руху Зьмітра Касьпяровіча, зьвінавачанага ў злосным хуліганстве за спробу вывесіць нацыянальны сьцяг на Менгарвыканкаме, 27 лютага суд Маскоўскага раёну сталіцы асудзілі на 5-месяцовы арышт. За кратамі хлопец з 17 студзеня.

Жорсткі прысуд Касьпяровічу не напалохаў яготых аднадумцаў. У ноч з 27 на 28 лютага барысаўскія актывісты ўзьнялі на стомэтровым коміне адной з кацельняў гораду бел-чырвона-белы сьцяг. Лазіць на такія аб'екты ўзімку небясьпечна для жыцьця, таму зрываць нацыянальны штандар няма дурных. Кацельня месьціцца ў буйным прамысловым раёне Барысава, і штодня сьцяг могуць пабачыць тысячы месьцічаў.

**На фота: яшчэ нядаўна Зьміцер Касьпяровіч браў удзел у акцыях салідарнасьці з палітвязьнямі. Сёньня ён сам у няволі.**

## СЬЦІСЛА

**Працяг са старонкі 13.**

га фронту» Артура Фінькевіча. Хлопцы папрасілі сьледчага прыслаць ім позвы ў адпаведнасьці з патрабаваньнямі закону. У адказ той заявіў, што абвесьціць іх у вышук.

### Такая свабода

З БДАТУ 22 лютага выключылі былога сакратара БРСМ факультэту прадпрымальніцтва й кіраваньня **Венядыкта Кляўзэ**, які ўвайшоў у ініцыятыўную групу Мілінкевіча.

### У Шклове

У Шклове 24 лютага накоратка затрымалі моладзевага актывіста **Сержука Нягаціна**: з заплечніка ў яго канфіскавалі брашуры ды налепкі. 25 лютага ў царкву в.Высокая на Шклоўшчыне, дзе Нягацін дапамагае ў якасьці дзяка, зьявіўся лейтэнант крымінальнага вышуку, які нэгатыўна характарызаваў хлопца перад сьвятаром.

### У Менску

23 лютага міліцыянты затрымалі **Уладзімера Кішкурну**, **Ігара Арлова** і **Леанарду Мухіну**, якія раздавалі агітацыйныя ўлёткі А.Мілінкевіча. У пастарунку міліцыянты заявілі, што раздаваць перадвыбарчыя ўлёткі можна толькі ў адмыслова адведзеных месцах. Даведаўшыся пра затрыманьне актывістаў, прыехаў сам А.Мілінкевіч. Гэтага было дастаткова, каб актывістаў выпусьцілі. Аднак пазьней ім уручылі позвы ў міліцыю.

### За палякамі цікуюць

Аўтамабіль польскіх актывістаў, якім яны

# Герой, падобны да Тома Круза



Студэнта беларускай філялёгіі Гарадзенскага ўнівэрсытэту другі раз выключылі з унівэрсытэту. За каляндарыкі з надпісам «Люблю Беларусь».

У дэканаце Яўгену Скрабутану паведамілі, што ён больш ня вучыцца ва ўнівэрсытэце. Гэта здарылася пасьля таго, як Мастоўскі суд пакараў яго штрафам — 290 тысяч рублёў — за знойдзеную ў яго торбу з каляндарыкамі са здымкам Аляксандра Мілінкевіча і словамі «Люблю Беларусь». Студэнт зьяўляўся сябрам ініцыятыўнай групы А.Мілінкевіча.

У дэканаце Яўгену Скрабутану патлумачылі, што, паводле загаду, ён дапусьціў парушэньне другі раз за час навучаньня. Першы раз яго выключылі ў 2004 годзе за надпіс «Спыніць русіфікацыю» на ўнівэрсытэцкім муры. Справа набыла розгалас, і дзякуючы дружнаму заступніцтву студэнтаў і выкладчыкаў яму тады ўдалося аднавіцца.

Гэты раз яго выключылі на другі дзень пасьля суду, прычым завочна. У дэканаце толькі паказалі электронны варыянт выпіскі з загаду пра выключэньне.

Да таго міліцыянты затрымлівалі студэнта Я.Скрабутана за распаўсюд улётак з пратэстам супраць выключэньня студэнтаў па палітычных матывах. Справа стаяла гэтак. Ва ўнівэрсытэце адбывалася канфэрэнцыя, прысьвечаная студэнцкаму самакіраваньню. Студэнт Я.Скрабутан таксама прысутнічаў на ёй. Ахову ў памяшканьні ажыцьцяўлялі студэнты старэйшых курсаў. Паводле Яўгена, адзін зь іх падышоў да яго падчас мерапрыемства і сфатаграфаваў проста ў твар, а потым перадаў здымак міліцыянтам. Канфэрэнцыя закончылася, і калі Я.Скрабутан выходзіў з залі, яго чакалі міліцыянты і хлопцы з унівэрсытэцкай аховы, якія сьцьвярджалі, што ён распаўсюджваў улёткі. Яўгена забралі ў Ленінскі РУУС, дзе пратрымалі гадзіны дзьве.

У тых улётках пісалася, што з унівэрсытэту выганяюць студэнтаў за грамадзкую дзейнасьць. Прыводзіўся сьпіс, у якім сярод выключаных быў і Скрабутан.

Герой нашага часу, на твар падобны да Тома Круза, пасьля першага выключэньня катэгарычна адмовіўся эміграваць з краіны, хоць яму прапаноўвалі месца ў адным з польскіх унівэрсытэтаў. Як і адзін з герояў Круза, Яўген адмаўляецца верыць у невыканальнасьць сваёй місіі.

**Да беларушчыны Яўген прыйшоў вельмі рана. Завучаны ў 4 гады разам зь дзедам Багуславам вершык «Ехаў дзедка на кірмаш» стаў адпраўным пунктам. «Я рана навучыўся чытаць і шмат чытаў па-беларуску». Яўгену 19 год. Бацька Яўгена — юрыст, мама — тэхноляг. Беларускамоўны асяродак Зэльвы вызначыў ягоны выбар прафэсіі — беларуская філялёгія.**

Яўген — з Зэльвы. Ён зямляк Ларысы Геніюш — паэткі, што памерла ў 1984-м, так і не прыняўшы савецкага грамадзянства, нават пасьля васьмі гадоў канцлягеру.

27 лютага Я.Скрабутан падаў скаргу ў пракуратуру на дзеяньні Мастоўскага суду, адміністрацыйнай камісіі Кастрычніцкага раёну Горадні і дэканату свайго ўнівэрсытэту. «Няможна пакараць за адно і тое ж тройчы», — кажа Яўген. Ён ня мае спадзеваў аднавіцца на факультэце, але не зьбіраецца папускаць сваім ганіцелям. І, тым болей, эміграваць. Аднакурсьнікі і некаторыя выкладчыкі маральна падтрымліваюць хлопца: «Не баяцца нават рукі падаваць». Аднак дапамога гэтая толькі на словах, без актыўных дзеяньняў. А Яўген лічыць, што за кожнага пакаранага сыстэмай трэба ўставаць гуртам. Толькі так будуць шанцы выстаяць.

**Сямён Печанко**

## СЬЦІСЛА

прыехалі ў Менск на канцэрт, зладжаны амбасадай, дагледзелі ўвечары 25 лютага. Кіроўцу **Антону Борысу**, брату Анжалікі Борыс, які чакаў **Юзафа Пажэцкага** і **Андрэя Пачобута**, супрацоўнікі «Алмазу» прыставілі да галавы пісталет і паведамілі, што ў машыне перавозіцца зброя, аднак знайшлі й канфіскавалі 58 асобнікаў часопісу «Magazyn Polski na uchodzstwie». Машыну даставілі ў пастарунак, дзе на Борыса й Пачобута склалі пратакол.

### У Казлоўшчыне

У мястэчку Казлоўшчына Дзятлаўскага раёну ўчастковы 24 лютага сарваў абвесткі пра сустрэчу зь Мілінеквічам, хоць яны віселі на дошцы абвестак.

### У Вялейцы

У Вялейцы 25 лютага накоратка затрымалі **Міколу Суслу**, які раздаваў гараджанам улёткі А.Мілінкевіча і газэту «Народная воля».

### У Калінкавічах

Распаўсюднікаў агітацыйнай прадукцыі Мілінкевіча ў Калінкавічах **Дзяніса Рабянка** і **Аляксея Маневіча** накоратка затрымалі 26 лютага і сканфіскавалі 107 буклетаў. Перад затрыманьнем невядомы ў цывільным заклікаў гараджанаў біць агітатараў.

### У Бабруйску

26 лютага ў Бабруйску падчас распаўсюду ўлётак Мілінкевіча і «Народнай волі» накоратка затрымалі моладзевых актывістаў **Дзяніса Шэйка** і **Алеся Чыгіра**: з пастарунку іх выпусьцілі пасьля праверкі ўлётак і газэты.

### На Берасьцейшчыне

Аўтамабілі з агітацыйнай прадукцыяй Мілінкевіча 27 лютага спынялі на шашы Берасьце—Пінск некалькі разоў.

### Зьбіцьцё юнака

У Белаазёрску за графіці 26 лютага затрыманы моладзевы актывіст **Арцём Говін**. У райаддзеле міліцыі хлопца зьбілі, і ён патрапіў у бальніцу з страсеньнем мозгу.

**АШ**

# Георгі Валкавыцкі: Найбольшы тыраж «Нівы» быў 8,5 тысяч

Беластоцкаму тыднёвіку «Ніва» сёньня спаўняецца 50 гадоў. «Мы арыентаваліся на пазытывістычную «Нашу Ніву», кажа **Георгі Валкавыцкі**, першы рэдактар выданьня.

**Георгі Валкавыцкі:** У 1955 г. мне даручылі стварыць праект Беларускага грамадзка-культурнага таварыства ды праект газэты. Тады я яшчэ нічога ня ведаў, нічога ня ўмеў. Але выбару не было. Я адразу запатрабаваў, каб далі сьпісы гмінаў, дзе жылі беларусы. Такіх аказалася 150 тыс., з пазнакай па кожнай вёсцы. Таму арыентаваліся на беластоцкую вёску: увесь Гайнаўскі павет, палову Бельскага, Беластоцкага. Сакольскі павет хоць цалкам беларускамоўны, але палова насельніцтва — каталікі і ўжо сябе лічылі «палякамі». Таму на Сакольшчыне амаль ня мелі чытачоў. Чыталі нас там адзінкі, беларусы яшчэ перадваеннага гарту.

**«Наша Ніва»: Не абвінавачвалі вас, што палякаў у беларусаў перарабляеце?**

**ГВ:** У нас якраз тады была адліга, і Варшава ўзяла курс на падтрымку рэгіянальных рухаў. А потым у «Трыбуне люду» зьявіўся артыкул пра беларусаў. Маўляў, цяжка ім, ніхто ня дбае пра іх культуру, што іх трэба падтрымаць.


МІРА ЛУКША

**Георгій Валкавыцкі (справа) з карэспандэнтам «НН».**

**«НН»: Якое выданьне было для вас прыкладам?**

**ГВ:** Я арыентаваўся на пазытывістычную «Нашу Ніву», хоць на той час яе ня бачыў. Але ведаў з гісторыі, што гэта за газэта, які напрамак.

**«НН»: Які быў найбольшы тыраж «Нівы»?**

**ГВ:** 8,5 тыс. у 1960—1970-х, хоць стартавалі мы з 10 тыс. У 1970-х у Гарадзенскай вобласьці мелі 500 падпісчыкаў. У Гайнаўскім павеце былі на першым месцы па падпісцы. Партыйныя інспэктары ганялі ўсіх: на першым месцы павінна быць партыйная прэса! Быў пэрыяд, калі нам закрылі доступ у БССР, бо палічылі «бебурнацамі». Быў час, што ў Магадан газэта даходзіла, а ў Беларусь — не. Паэт, што хаваўся пад псэўданімам «Шэршань», якраз і пісаў нам з Магадану. У вайну ён друкаваўся ў акупацыйнай беластоцкай «Новай дарозе».

**«НН»: Ці моцна кантралявалі вас камуністы?**

**ГВ:** Мы не былі пад наглядам, бо нас выдавала партыйнае выдавецтва. Канечне, сачылі. У 1967-м Гамулка (у 1956—1970-х — першы сакратар ЦК ПАРП. — **«НН»**) казаў, што павінна быць адна айчына. Тады шмат габрэяў павыяжджала. Таксама былі ўведзены наглядчыкі за нацыянальнымі таварыствам. Толькі потым я даведаўся, што і за мной ходзяць.

**«НН»: Цяперашнія часы для беларусаў Польшчы лепшыя ці горшыя?**

**ГВ:** Тады не было такога кантролю, як цяпер, калі пракуратура ўжо пару гадоў цягне судовую справу праграмнай рады тыднёвіка. Дый не было за што кантраляваць, бо ўсё было пад партыяй.

***Гутарыў Зьміцер Дзядзенка***

**Ад Рэдакцыі. Шчыра віншуем братоў з Падляшша з 50-годзьдзем «Нівы». Многая лета!**

# Каб штотыдзень атрымліваць газэту, дасылайце адрасы і прыватныя ахвяраваньні

Каб гарантавана чытаць «Нашу Ніву» цяпер, калі «Саюздрукам» і «Белпошце» забаронена распаўсюджваць газэту:

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць па тэлефоне, факсам, праз пошту ці электронную пошту.**
Тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84
e-mail: dastauka@tut.by
паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) Просім кожную сям'ю чытачоў **пералічваць на рахунак** газэты ахвяраваньне з разьліку 6 000 рублёў на месяц. Гэтага будзе досыць для выхаду і дастаўкі газэты. **У блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага пераказу, калі ласка, дакладна і разборліва пазначайце ваш адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.** Тыя, хто перакажа 18 000 рублёў за раз, забясьпечаць выхад газэты на тры месяцы. Хто ж мае магчымасьць пераказаць 36 000 рублёў адразу, забясьпечаць публікацыю «НН» адразу на паўгоду.

0402280179
**ИЗВЕЩЕНИЕ**

**Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521**
получатель платежа
**МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764**
наименование банка

| Счет получателя | 3015 212 000 012 | Лицевой счет | |
|---|---|---|---|

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | Пеня | |
| | | | Всего | |

Кассир Плательщик

**Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521**
получатель платежа
**МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764**
наименование банка

| Счет получателя | 3015 212 000 012 | Лицевой счет | |
|---|---|---|---|

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | Пеня | |
| | | | Всего | |

**КВИТАНЦИЯ**

Кассир М.П. Плательщик

лицензия № 02330/0056637 от 27.03.2004 УП «УСЛУГА» Зак. 3504 тир 50 000

## На які рахунак пералічаць грошы?

Ахвяраваньне можна перавесьці ў любым аддзяленьні банку, на любой пошце. Улічыце, што пры пераказваньні грошай паштовым пераводам пошта спаганяе дадаткова 3%, а пры пераводзе грошай праз «Беларусбанк» працэнту не бяруць.
На банкаўскай квітанцыі ў графе «Від плацяжа» трэба пазначыць: «Ахвяраваньне». У графе: «Атрымальнік плацяжа» трэба пісаць: «Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521». У графе «Найменаваньне банку» трэба пісаць: «МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764». У графе «Рахунак атрымальніка» 3015 212 000 012. Пры перасылцы грошай па пошце тое самае трэба пісаць у рубрыках «Каму» і «Куды».

## Ці трэба паўторна дасылаць адрасы ў Рэдакцыю?

Не, аднойчы даслаўшы, больш ня трэба (калі вы рэгулярна атрымліваеце газэту). Тады досыць не забывацца рэгулярна пералічаць ахвяраваньні.

## Хто дасылаў ахвяраваньні, але не паведаміў адрасу

Прабачце, што газэта прыйшла вам запозьненa. Рэч у тым, што вы пераказалі ахвяраваньне, але не паведамілі Рэдакцыі адрасу адразу. Квіток ахвяраваньня трапляе да нас праз 5—10, а часам і болей дзён.

# Шукаем чытачоў!!!

Калі хто ведае наступных чытачоў «НН», просьба падказаць ім скантактавацца з газэтай.

**Чытач з Зарніцы Спасава,** дашліце свой дакладны адрас і прозьвішча.
**Леанід Мікалаевіч Н.** з вул.Калініна, удакладніце свой адрас.
**Сп. Міхайлаў** з вул. Багдановіча, скантактуйцеся з Рэдакцыяй.

**Калі вы не атрымалі газэты**

да панядзелка, а ў Менску — да суботы, абавязкова тэлефануйце ў Рэдакцыю. Пытацца Аляксандру.

Тэлефоны:
(017) 284–73–29,
(029) 618–54–84,
(029) 260–78–32

dastauka@tut.by

## Правілы падачы адрасоў:

Абавязкова падавайце індэкс, бо зь індэксам газэта дойдзе хутчэй.

Калі вы жывяце ў вёсцы ці ў мястэчку, пазначайце раён і вобласьць.

Ня трэба дасылаць квіток, пакіньце яго ў сябе, гэта вашае пацьверджаньне таго, што вы зрабілі ахвяраваньне.

Разборліва падавайце свае зьвесткі.

Атрымліваць газэту можна зь любога нумару, толькі паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас.

запрашаем прыватных прадпрымальнікаў

браць газэту на распаўсюд у Менску і рэгіёнах.

**Вельмі просім чытачоў, якія ад Новага году чытаюць «НН» у Інтэрнэце, а не на паперы, таксама дасылаць прыватныя ахвяраваньні з разьліку 6000 на месяц з пазнакай: «за Інтэрнэт». Бяз збору грошай газэце не захаваць якасьці.**

## Дзякуй за ахвяраваньні!

Агульная сума ахвяраваньняў, што паступілі на рахунак за студзень 2006 году, склала 5 мільёнаў 782 тысячы 500 рублёў.

Дзякуй за шчодрасьць Сяргею Г., Натальлі Р., Г.П., Марыі М., Аляксандру Ц., Ніне Я., А.Л., Аляксею К., Ларысе А., Вользе К., Адаму З. зь Менску.
Андрэю Ч. з Рагачова.
Міхаілу К. зь Сьветлагорску.
Зьмітру К. з Мастоў.
Міхалу Т. са Слуцку.
Барысу Ф. з Гомелю.
Антонію Д. з Горадні.
К.К. з Магілёва.
Ю.Ц. з Баранавічаў.
В.Г. зь Менскага раёну.
Антосю Ц. з Полацку.

# Міма галавы

«J_Mors-ы» спалохаліся рок-кароны. Рэпартаж **Андрэя Скурка** й **Сяргея Будкіна.**




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Генэральны спонсар «Каранацыі» быў вымушаны зьняць апошнюю кашулю.**

Упершыню з часоў вялікіх канцэртаў «Крамбамбулі» ў Менску прайшло сапраўднае канцэртнае шоў з рок-балетам, відэашэрагам, яскравымі вядучымі і фэерыяй гуртоў — адроджаная «Рок-каранацыя».

За пяць хвілінаў да пачатку канцэрту ў фае «Казы» можна было бачыць арганізатара «Каранацыі» Юр'я Цыбіна. Яго бледнасьць і адстароненасьць былі цалкам вытлумачальныя. Напярэдадні па БТ і АНТ паказалі чарговую сэрыю «Духоўнай вайны» Юр'я Азаронка, прысьвечаную рок-музыцы наагул і рок-каранацыі ў прыватнасьці. «N.R.M.», «Краму», «Нэўра Дзюбэль», «Індыга» вінавацілі ў «прадажнасьці», у якасьці доказу прыводзячы цытату зь песьні Лявона Вольскага «Маё пакаленьне»: «Набыць бы даляры, прадаць бы рублі...» Большага перакручваньня сэнсу геніяльнага тэксту цяжка сабе ўявіць, таму да камэнтароў наконт гэтага ніхто з удзельнікаў каранацыі не апусьціўся.

Яшчэ арганізатарам спэцыяльна званілі з гарвыканкаму і «раілі» не пускаць на сцэну «Краму», «Нэўра Дзюбэль», ня дай божа «Zet» — і далей паводле сьпісу забароненых. Але ж усе яны на хвалі нацыянальнай салідарнасьці атрымалі рок-кароны. Таму большасьць «забароненых» на канцэрце сыгралі.

Замест «Крамы» граў гурт «Ігар Варашкевіч і кампанія». Нязьменны вакаліст стаяў у сцэнічным дыме як помнік самому сабе. Песьню «Бяжы, хлопец» рознаўзростая публіка сьпявала хорам.

«Нэўра Дзюбэль» пазнаваўся пад мянон «ВІП» («Выпіць І Паплакаць»). Хоць наконт «паплакаць» ўзьнікалі сумневы: Кулінковіч хваляваўся і прамяніўся шчырай радасьцю за тое, што ягоны першы ў жыцьці беларускамоўны альбом прызнаны найлепшым у 2005 годзе.

Толькі «Зэт» «быў на гастролях у Паўднёвай Карэі».

Маскоўскі журналіст Віктар Дзятліковіч, уганараваны за кніжку «Іх мроя, іх N.R.M.», ад радасьці ў антракце выпіў віно проста з кароны.

Гомельскі гурт «ТТ-34» выпрабаваў карону іначай — ад хваляваньня музыкі ўпусьцілі трафэй на сцэне. Не пабілася. Купляйце прадукцыю шклозаводу «Нёман».

Дэбютантаў году — «Таварыша Маўзэра» з Магілёва віншаваў пісьменьнік Уладзімер Арлоў, які падарыў групе «поўны боекамплект» — пакунак сваіх кніг «Адкуль наш род». Капэрту зь імем намінанта вынес з-за кулісаў у зубах сыты ратвэйлер у суправаджэньні двухмэтровае (на абцасах) фотамадэлькі.

**Працяг на старонцы 20.**

# Міма галавы

Працяг са старонкі 19.

На каранацыі было многа новага: упершыню былі рэпрэзэнтаваныя ўсе абласныя гарады. Магілёўскія «Глюкі» бралі крыкам. Гарадзенская «Айша» прыгаломшыла магутным вакалам. Віцебскі «Восьмы дзень» выпрабаваў слухацкае пачуцьце такту. Гомельскі «Al narrator orchestra» першым гукам веснавага гармоніка сарваў захапленьне залі. Берасьцейская «Сьцяна» многа страціла без дадатковай вакалісткі. Музыкаў наваполацкага «Фляўс і Кляйн» цяпер можна назваць найлепшымі блазнамі беларускай рок-сцэны. З гэтай нагоды відавочна сумаваў Віталік Артыст з гурту «Безь білета».

Прыз глядацкіх сымпатыяў разыгрываўся між рэгіянальных камандаў з дапамогай шумамеру: за каго публіка мацней закрычыць і запляскае. Калі б такім самым чынам выбіралі рок-караля, у горадзе па-ранейшаму валадарыў бы «N.R.M.». Яго флюіды адчуваліся ўсе чатыры гадзіны канцэрту. Заля выбухала вульканічнай авацыяй пры найменшым намёку — ці гэта кадры кінахронікі зь мінулых каранацыяў, ці гэта пазнавальныя гітарныя «запілы» з энэрэмаўскіх гітоў, якімі пасьля антракту пачаў свой выступ Піт Паўлаў. Ён першы са сцэны зьвярнуў увагу на прысутнасьць у залі Аляксандра Мілінкевіча: «Я ня мусіў гэтага казаць... Але цяпер у залі прысутнічае адзіны кандыдат». Заля адказала авацыяй, людзі паўскоквалі зь месцаў. Цягам усяго антракту Мілінкевіч раздаваў аўтографы ў фае і фатаграфаваўся з усімі ахвотнымі. Нават працяг канцэрту крыху затрымаў. Сілы правапарадку паводзіліся карэктна. Праўда, на сцэну — уручыць кветкі Лявону Вольскаму і Русі з «Індыга» — Мілінкевіча не пусьцілі. Не бяды. Руся, каб атрымаць букет, укленчыла.

Новымі былі й вядоўцы. Парачку Вечараў замянілі бацька наваполацкага року Сяргей Анішчанка і вядучая зь Першага музычнага каналу Кацярына Пытлева. Дуэт джэнтльмэна з высакароднай сівінкай і маленькай лэдзі з сталёвым голасам мае шанцы стаць зорным — як толькі прытрэцца. А пакуль некаторым выступоўцам адчувальна не хапала «падліўы». Зусім не падрыхтавалі вядучыя залю да выступу вакальнага фольк-гурту «Гуда». Хоць даўнія крывіцкія строі зрабілі ўражаньне. Дзіўнай данінай фольку глядзелася «Альтанка» з калядкамі пад балалайку.

Аднак публіка была шчодрая на авацыі. Сарваў іх нават генэральны спонсар зь піваварнай кампаніі «Сябар», які распрануўся на сцэне, аддаючы «апошнюю кашулю» дырэктару клюбу «Графіці». У першы свой выхад на сцэну дзядзька гаварыў па-расейску, у другі — пераключаўся на беларускую. Спрабаваў, зь меншым вынікам, і лідэр гурту «Куклы». Прызэрамі яны ня сталі, але сыгралі чамусьці аж дзьве песьні. Зьдзівіла арганічнай беларускай мовай шматстаночніца Тамара Лісіцкая, што абвяшчала вынікі конкурсу відэакліпаў.

А галоўная інтрыга «Рок-каранацыі» чакала пры самым канцы. Вялікая карона так і засталася без гаспадара. Гурт «J_Mors», які мусіў яе атрымаць, нечакана пакінуў закулісьсе перад уручэньнем. Як паведамілі музыкі ў распаўсюджаным назаўтра прэс-рэлізе, яны зьехалі на знак пратэсту супраць палітызацыі мерапрыемства, якая выявілася ў прыходзе Мілінкевіча і «агітацыі са сцэны за аднаго з кандыдатаў».

Учынак «Морсаў» выклікаў хвалю зьедлівых камэнтароў у прэсе і Інтэрнэце. Словы рэдактара «Музыкальной газеты» Алега Клімава: «Хлопцы проста, груба кажучы, наклалі ў порткі. А потым на гэтым вырашылі зрабіць піяр» — яшчэ ня самыя жорсткія. Ня любіць публіка тых, хто ні за сіх, ні за тых.

### «J_Mors» між двух агнёў

**Пасьля адмовы «Морсаў» удзельнічаць у сумнеўных агітацыйных канцэртах «За Беларусь» групу быццам бы ўключылі ў сьпіс забароненых для канцэртаваньня. Матэрыял пра гэта зьявіўся на сайце «Тузін Гітоў», але пратрымаўся толькі каля 20 хвілінаў: журналісты вымушаныя былі пайсьці насустрач пажаданьням мэнэджмэнту гурту «не ўздымаць гэтай тэмы». Музыкі баяліся, што розгалас можа прывесьці да забароны і на ратацыю на радыёстанцыях.**

### Пераможцы «Рок-каранацыі-2005»

**Прыз глядацкіх сымпатый**
«Фляўс і Кляйн»
**Альтэрнатыўны гурт году**
«ТТ–34»
**Блюз-рок-выканаўца**
«Крама»
**Фольк-выканаўца**
Іван Кірчук
**Праект году**
«Прэм'ер Тузін»
**Выканаўца году**
Лявон Вольскі
**Сьпявачка году (рок-князёўна)**
Руся («Індыга»)
**Дэбют году**
«Таварыш Маўзэр»
**Кліп году**
«Турысты» («Крамбамбуля»)
**Песьня году**
«Белакрылы анёл» («Зэт»)
**Альбом году**
«Tanki» («Neuro Dubel»)
**Група году**
«J_Mors»
**Спэцпрызы:**
За адданасьць рок–ідэалам — клюб «Графіці»
За найлепшую публікацыю пра рок–музыку — Віктар Дзятлікові «Іх Мроя. Іх N.R.M.»
Фэстываль году — «Рок–Кола», Полацак

**Руся стала на калені, прымаючы букет ад Мілінкевіча.**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Саюз пісьменьнікаў дзеліць лёс свайго народу


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Пісьменьнікі ходзяць не па творчых сустрэчах, а па судах. Другі справа — старшыня СП Алесь Пашкевіч.**

Саюз беларускіх пісьменьнікаў 21 лютага атрымаў ліст зь Міністэрства юстыцыі: Вярхоўны суд разгледзіць справу аб ліквідацыі творчага саюзу 3 сакавіка. Мін’юст закідае пісьменьнікам адсутнасьць арыгіналу статуту, шыльду з «Пагоняй» на будынку, адсутнасьць дзвюхкосьсяў у назьве арганізацыі на пячатцы, а таксама арганізацыю зьезду БСДП(Г) улетку 2005 году.

Міхась Скобла, намесьнік старшыні СБП, ухіляецца ад адказу пра пляны арганізацыі на пасьля 3 сакавіка: «Будзем, як першыя хрысьціяне ў катакомбах». Іншыя пісьменьнікі спадзяюцца на рэгістрацыю Саюзу пісьменьнікаў у выгнаньні — найхутчэй, ва Ўкраіне.

**АВ**

ТЭНДЭНЦЫІ

# «Трапны удар, как говорят у нас в Белоруссии»

У перапынках між жывым этэрам з Алімпіяды БТ круціла старыя чорна-белыя хронікі пра беларускі спорт за часамі СССР. Уражвае тое, што тады ўсё агучвалася па-беларуску. Прынята казаць пра заціск беларускай мовы савецкімі ўладамі, аднак тыя кадры ствараюць лепшае ўражаньне пра камуністаў. Ды яшчэ на маёй памяці сустрэчы БССРаўскіх камандаў і спаборніцтвы камэнтаваліся па-беларуску. Зрэшты, і тэлебачаньне, памятаецца, было беларускім…

Выходзіць, што за савецкімі часамі ўлады, прыгнятаючы мову на месцах, ўсё ж такі неяк намагаліся адзначыць нацыянальную адметнасьць беларусаў у сваёй прапагандзе. Цяперака, у незалежнай краіне, чамусьці вырашана гэтую адметнасьць не выстаўляць на людзі. Апошнім часам нашыя спартовыя дасягненьні прынята апісваць і камэнтаваць выключна па-расейску. Беларускую мову цяпер зрэдчас можна пачуць, калі паказваюць футбольныя гульні Лігі чэмпіёнаў. Эўрапейская мова на эўрапейскім футболе.

Нашая мова выціскалася з камэнтатарскай кабінкі паціху-патроху. Камэнтатар пачынаў па-беларуску. На другі тайм запрашаўся які трэнэр ці гулец, і гамонка пачыналася па-расейску. Хакейны трэці пэрыяд нават па сыходзе суразмоўцы агучваўся на другой канстытуцыйнай мове — нібыта забыўшыся.

Лёгкае ўзрушэньне сярод камэнтатараў адбылося на сусьветным чэмпіянаце, калі нямецкая тэлекампанія прадала правы на рэтрансьляцыю з умоваю агучкі па-беларуску. Але высьветлілася, што моладзь мовы ня ведае, а старым карціць гаварыць па-расейску.

Пасьля чэмпіянату русіфікацыя камэнтатараў працягнулася. Але шматгадовае практыкаваньне бацькоўскай мовы па-здрадніцку праяўляецца. Яшчэ і цяперака Навіцкі ўстаўляе па звычцы якое беларускае слоўца, не пасьпяваючы падабраць расейскі аналяг: «Трапны удар, как говорят у нас в Белоруссии». Аднак разам з моваю пацiху пакідаюць нашых спартоўцаў і перамогі.

А што пакіне нашчадкам наш час? Хронікі заваёваў шматлікіх узнагародаў, хваласьпевы пра высокае месца спорту ў жыцьці народу і ўлады? Толькі ці зразумеюць нашчадкі? Нават у простым сэнсе.

**Руслан Равяка, Баранавічы**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# ДзДз: чаго не хапала мне як носьбіту расейскай мовы

Расейскамоўны паэт з Магілёва Дзьмітры Дзьмітрыеў перайшоў на беларускую мову, адчуўшы «велізарнасьць беларускага поля для экспэрымэнту». Чаму беларусізаваўся творца, што сталеў у межах іншай культурнай традыцыі? Піша **Аляксей Бацюкоў.**

Дзьмітры Дзьмітрыеў — да нядаўняга часу выключна расейскамоўны паэт з Магілёва. 27 гадоў, працуе на абласной тэлевізіі гукарэжысэрам. Юнацтва прайшло пад знакам мадэрновых ды андэргграўндавых мастацкіх практык — самвыдатаўскія кнігі паэзіі, удзел у рок-гурце. Потым былі публікацыі ў Маскве — кніга ў выдавецтве Лява Шпрынца, уключэньне тэкстаў у зборнікі сучаснай расейскай паэзіі, прэмія «Дэбют». Да пэўнага часу гэта пазыцыянавала яго як творцу, уключанага ў расейскае культурнае поле. Але публікацыі ў Маскве і жыцьцё ў Беларусі ў нейкі момант сталі супярэчыць адно аднаму. У 2003-м Дзьмітрыеў бярэ ўдзел у літаратурным конкурсе, абвешчаным беларускім ПЭН-цэнтрам і прысьвечаным Н. Арсеньневай. Узгадвае, што куратары прымалі яго да ўдзелу са скрыгатам, ня ведаючы, як паставіць у адзін шэраг з астатнімі. Адзіны расейскамоўны паэт з усіх фіналістаў конкурсу, ён да пэўнага часу і выглядаў адасоблена, у сваёй нішы. Нават назва зборніка фіналістаў «12+1» так і сьведчыць — дванаццаць беларускамоўных і расейскамоўны Дзьмітрыеў. Успрыняцьцю яго як правамоцнага гульца на беларускім літаратурным полі пагражала традыцыйная боязь апраўдаць культурны статус расейскай мовы ў беларускім грамадзтве й білінгвізм. Так, Ірына Шаўлякова, крытыкуючы зборнік «12+1» у часопісе «Дзеяслоў» № 11, аналізуе творы дванаццаці паэтаў і не зьвяртае ўвагі на Дзьмітрыева.

Некалькі месяцаў таму на рэсурсе Livejournal.com Дзьмітрыеў пачаў зьмяшчаць свае беларускія тэксты. Гэта мінімалістычныя, фармалістычныя паэтычныя практыкі, замяшаныя на гульні словамі. Сьвежая форма ўскрывае глыбіні і магчымасьці беларускай мовы.

Напрыклад:

***

«усё наперадзе», — казаў гадзіньнік...
а ён, вядома ж, знаны летуцынік

З чым зьвязана зьмена маўленьня паэта, сфармаванага на расейскамоўным матэрыяле, і ці гэта назаўжды?

**«Наша Ніва»: З чаго пачаўся Дзьмітрыеў беларускамоўны?**

**Дзьмітры Дзьмітрыеў:** Апроч уласных рэфлексіяў наконт асабістага месца ў жыцьці былі іншыя нагоды. Удзельнічаючы ў сэмінары фіналістаў ПЭНаўскага конкурсу, я адчуў тое, чаго не хапала мне як носьбіту расейскай мовы — пачуцьця велізарнасьці поля беларускага экспэрымэнту, каштоўнасьці гэтага экспэрымэнту. Менавіта выхаваўчая работа з боку пэўных людзей прынесла плён. За гэта ім дзякуй. Мяне не адштурхнулі, таму рабіць зноўку першыя крокі было лягчэй.

Мушу тут расказаць, што першыя мае спробы сябе ў якасьці паэта адбыліся пасьля знаёмства з узорамі паэтычнага слова, што адрозьніваліся ад выкладаных у школе — з Аляксандрам Увядзенскім і Велімірам Хлебнікавым. Таму першасная прастора была расейскамоўнай. Узораў беларускай паэзіі, якія б так чаплялі, я тады не сустрэў.

**«НН»: Для Вас прывабнай стала беларуская мова ці літаратурная «тусоўка», часткай якой Вы захацелі сябе адчуць?**

**ДзДз:** Вядома, мова. Інакш я мог бы і далей цешыцца нейкай спрычыненасьцю да нейкай расейскай літаратурнай тусоўкі. Але гэта сапраўды нецікава. Апошні год я пішу выключна па-беларуску. І гэта натхняе. То працяглы час нічога не пісалася, а тут такая энэргія.

Але і гаворачы пра тусоўку, я ня ведаю ніводнага беларускага выдавецтва, якое друкавала б якасныя расейскія тэксты. Таму ў расейскамоўнай творчасьці ў Беларусі адчуваецца нейкая местачковасьць. Іншай падаецца карціна зь беларускай літаратурай, якая, нягледзячы на шматлікія перашкоды і акалічнасьці, ня толькі мае дыстрыбутарскую складовую, але разьвівае і спажывецкую.

**«НН»: Ці можна лічыць Дз.Дзьмітрыева паэтам-інтэрнацыяналістам?**

**ДзДз:** Не. Адна зь якасьцяў тэкстаў, якія хацеў бы ствараць — немагчымасьць іхніх перакладаў на іншую мову. Бо я — можа, памылкова — лічу, што тады ён цалкам будзе належаць моўнай прасторы. Адсюль раблю выснову, што, пішы я ці на беларускай мове, ці расейскай, інтэрнацыяналізм выключаецца на ўзроўні тэксту.

Падборку вершаў Дзьмітрыя Дзьмітрыева чытайце ў «ARCHE» №3.



# 100% ліпа

Пратаколы экзыт-полу сфальшаваў нехта з інтэлектам арытмомэтра «Фэлікс». Піша **Аляксандар Класкоўскі.**

Тэлевізія радасна абвесьціла, што ворагі рэжыму панараблялі ўжо пратаколаў, дзе паводле экзыт-полаў зафіксавана перамога Мілінкевіча.

Паводле айчыннай традыцыі, перад выбарамі выкрываньне шпіёнаў ды змоўшчыкаў набывае ўдарны рытм касавіцы. Вось і сфальшаваныя пратаколы з офісу незарэгістраванага «Партнэрства» — які своечасовы падарунак прапагандзе!

Стыль знаёмы. Нам дэманстравалі ўжо некалі «левы» пісталет ды фальшывыя даляры ў справе Марыніча. І літоўскага кур’ера з 200 тысячамі даляраў для Скрабца. І нейкія бярданкі ў склепе — маўляў, збройны склад інсургентаў. І нават абяцалі паказаць лягеры баевікоў, схаваныя ў нашых пушчах.

Масавая сьвядомасьць — рэч калейдаскапічная, фрагмэнтарная. Яна ня надта зьнітоўвае падзеі, рэдка схамянаецца праз паўгоду-год: а ці ж спраўдзіўся той кампрамат? У сьвядомасьці абываталя застаецца адно што спалох. Ды перакананьне: навокал — ворагі, ад якіх абароніць толькі «бацька».

Так што галоўнае — «своечасова» вываліць валізу кампрамату, а там хоць трава не расьці.

«Нячэснага» журналюгу органы адшываюць: кыш, у нас таямніца сьледзтва! А вось на дзяржаўную тэлевізію апэратыўныя матэрыялы спэцслужбаў трапляюць нібы праз канвэер. Слова «прэзумпцыя», мусіць, лічыцца перажыткам.

Зрэшты, як утрымацца ад выкрывальніцкай спакусы, калі такія жалезныя «вешчдокі»!

Складальнік падробных пратаколаў шчыраваў. Але, жартуюць адмыслоўцы, спрацаваў на ўзроўні паваеннага бухгальтара з арытмомэтрам «Фэлікс».

Ён стараўся, каб праўдападобнасьць была «на ўсе 100». І менавіта на гэтым пагарэў. Літаральна! Бо калі скласьці паказчыкі чатырох кандыдатаў, выходзіць акурат 100%. А такога не бывае.

Прафэсар Алег Манаеў пацьвердзіў мне: каб сума галасоў за ўсіх кандыдатаў склала 100% — неверагодна! Ён нагадаў: пасьля выбараў-2001 7% рэспандэнтаў заявілі сацыёлягам ягонага інстытуту, што прагаласавалі супраць усіх (дарэчы, гэта карэлюецца са зьвесткамі ЦВК).

Калі ва Ўкраіне Юшчанка спаборнічаў зь Януковічам, экзыт-полы (якія, між іншым, дазвалялася ладзіць і амэрыканскім арганізацыям) давалі блізу 3—4% «супраць усіх».

Дык няўжо 19 сакавіка ніхто ў нас не прагаласуе гэнакім макарам? І няўжо ніводзін пазьняковец не зьнясе афіцыйнага бюлетэню пад маркаю «народнага галасаваньня»?

Як ні круці, а тэлевізія паказала ліпу. Стоадсоткавую. Хто б за ёй ні стаяў.

І яшчэ. Дзеля чаго гіпатэтычныя змоўшчыкі груба парушалі канспірацыю, складаючы пратаколы

## САСКОЧЫЛА

**Калі трэба, КДБ знойдзе**

**Адказваючы на пытаньне пра выбухоўку, якую плянавалася [апазыцыяй] ужыць у ходзе плянаванай акцыі, Сьцяпан Сухарэнка сказаў: «Ня думаю, што пасьля таго, як мы зрабілі гэта публічным, яны пойдуць на такі крок. Тым ня менш, сытуацыю будзем адсочваць, і ў выпадку, калі яны рызыкнуць гэта зрабіць, мы знойдзем выбухоўку».**

**Naviny.by**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Пакуль кіпяць палітычныя жарсьці, самая прыгожая дзяўчына краіны пакідае Беларусь. Н**
**конкурсу «Супэрмадэль сьвету», атрымала кантракт на 250 тыс. даляраў ад амэрыканска**
**нацыі. А нам застаецца Сыліконавая даліна...**

так задоўга да выбараў? Каб потым не марнаваць часу? Але адкуль вядома, што ў бюлетэнях будзе менавіта чатыры прозьвішчы? ЦВК ж раз-пораз страшыць, што можа скасаваць чыюсьці рэгістрацыю — напрыклад, за злоўжываньне перадвыбарчай агітацыяй. І тады ўсе загадзя складзеныя пратаколы — кату пад хвост.

Колькі будзе прозьвішчаў у бюлетэнях, можа ведаць толькі той бок, які прымае рашэньне. Уладны бок.

«Газета.Ru» дала сюжэт аб пратаколах пад зьедлівым загалоўкам: «КДБ правёў апытаньне грамадзкае думкі». Незалежныя сацыёлягі таксама цьвердзяць пра імавернаю правакацыю спэцслужбаў. Балтыйскі «Гелап» заявіў, што ніякага экзыт-полу 19 сакавіка не плянуе. Але слаба верыцца, каб яго пратэст агучылі праз дзяржаўныя мэдыі. Хіба калі воўк у лесе здохне.

Хутчэй варта чакаць новых сэнсацыяў ад спэцслужбаў. Шэф КДБ прыгразіў у сераду, што ў апазыцыйных кублах знойдзецца нават выбухоўка. Калі апазыцыя не супакоіцца...



**Кацярына Даманькова, 17-гадовая пераможца й агенцыі «Ford Models». Так зьяжджае генафонд**

# Гракі прыляцелі



Здаецца, пад 19.03 улады нэўтралізавалі ўсе крыніцы дэстабілізацыі: экзытпольшчыкаў, назіральнікаў, дэмакратаў у выбарчых камісіях. Аднак ёсьць яшчэ сейбіты хаосу, якім нават апошнія папраўкі да КК па барабане. Гэта грыпозныя птушкі, якія ляцяць з поўдня. Фэльетон **Лёліка Ушкіна.**

## У дырэкцыю БТ і АНТ

Сцэнарная замова на фільм «Пралятаючы над гняздом бусьліка».

Абгрунтаваньне: травеньская гістэрыя наконт «выбуху на Чарнобылі», які быццам меў месца, засьведчыла:

А) людзі дэ факта не давяраюць афіцыйным мэдыям. Усе іх спробы заспакоіць выклікалі яшчэ большае падазрэньне, што ўлады, як і ў красавіку 1986 г., хаваюць праўду;

Б) насельніцтва здольна стварыць трафік антыўрадавай інфармацыі праз Інтэрнэт, чуткі, SMS і г.д.

Высновa: у выніку прыходу птушынага грыпу (ПГ) сытуацыя можа паўтарыцца, што паставіць пад пагрозу сцэнар апэрацыі «Элегантная перамога». Прычым, нават калі ня будзе зафіксаваны ніводны выпадак ПГ, усё роўна ашалелая ад ажыятажу ў расейскіх СМІ нейкая бабка з доўгім языком зьвяжа сваю прастуду з тым, што ўчора зьела яечню.

Уладам у такой сытуацыі лягічна не паўтараць памылак, а прыпісаць сродкамі прапаганды, кшталту дакумэнтальных фільмаў, пошасьць ПГ апазыцыі.

Рабочы сцэнар фільму.

Палёт бусла. Голас за кадрам: «Іншая назва Беларусі — краіна пад белымі крыламі. Магчыма, невыпадкова цынічныя ворагі вырашылі сарваць пляны ўсебеларускага сходу крыламі і лапкамі яе спрадвечнага сымбалю».

Трывожная музыка.

Сцэна: марш нацыстаў. Голас за кадрам: «Услухайцеся, што яны скандуюць — «хай грып! хай грып!». Яшчэ тады ворагі славянства не хавалі сваіх плянаў, і натуральна, дапамагалі ім у гэтым нацыяналісты — продкі сучасных апазыцыянэраў».

Трывожная музыка.

Сцэна: сьпіна. З-за яе голас: «я — дворнічыха ў парку Горкага, неяк да мяне падышоў іншаземец і за грошы прапанаваў пакарміць качак у Сьвіслачы нейкімі крошкамі. Я вырашыла, што гэта чокнуты натураліст. На наступным рандэву дыплямат сазнаўся, што працуе на польскую дыфэнзыву, і прапанаваў разьвесьці тыя грыпозныя крошкі па сталічных сьметніках, дзе шмат груганоў. Я — патрыётка, натуральна, усё распавяла КДБ».

Трывожная музыка.

Сцэна: машына, што заяжджае ў браму пасольства Чэхіі. Супрацоўнікі пасольства нешта выгружаюць.

Голас за кадрам: «Думаеце, яны выгружаюць піцу? Не, у гэтых каробках сойкі, якім прышчапілі хваробу ў сакрэтных лябараторыях ЦРУ».

Сцэна: сойка. Аб’ектыў ідзе на колца, што на яе лапцы. Надпіс на колцы: «infected in the USA».

Выступ прадстаўніка МЗС аб дэпартацыі ўсіх чэскіх соек як парушальнікаў дыпляматычнага статусу.

Аптымістычная музыка. Краявіды.

Голас за кадрам: «Цяпер вы ведаеце, адкуль у Беларусь трапіў сьмертаносны вірус, аднак ведаеце таксама, што трэба рабіць — ісьці і галасаваць...

Кадар «За Беларусь!».

Канец.

Сцэнарыст Л.Ушкін.

## Маўчаньне Касьцёлу і яго будучыня

**З хваляваньнем прачытаў ліст «Маўчаньне Касьцёлу» («НН», №8). Асабліва пярэчаньне выклікаў апошні абзац ліста.**

У ім аўтар заклікае Касьцёл далучыцца да меркаванага «рэмэйку» Майдану ў Менску. Але заклікаць вернікаў да ўдзелу ў палітычнай барацьбе на тым ці іншым баку — цалкам супярэчыць місіі Касьцёлу.

Уцягваньне Касьцёлу (як і любой іншай канфэсіі) у змаганьне розных палітычных сілаў — жахліва небясьпечная зьява. Яшчэ ні ў якой краіне сьвету не было прэцэдэнту, каб яна прынесла карысьць як вернікам, так і грамадзтву ў цэлым.

Дастаткова прыгадаць сумны досьвед паўстаньня 1863—1864 гадоў, неасьцярожны ўдзел ксяндзоў у якім выклікаў цяжкія рэпрэсіі — закрыцьцё парафій і скасаваньне ўсіх кляштараў, масавую высылку духавенства і ў выніку — рэзкае зьмяншэньне прысутнасьці Касьцёлу ў культурнай прасторы, яго магчымасьці бараніць прысутнасьць лацінскай цывілізацыі ў Беларусі. Задача Касьцёлу — ня клікаць людзей на барыкады, а абуджаць у іх душах мудрасьць, разважнасьць і стрыманасьць.

Хачу таксама ўдакладніць, што змаганьне сталічных вернікаў за вяртаньне касьцёлу Сьв.Язэпа — ня «марнае». Яно працягваецца і, будзем за гэта маліцца, скончыцца вяртаньнем Касьцёлу ягонай законнай уласнасьці, а парафіянам — дому малітвы.

Але ліст уздымае важную праблему: якімі мусяць быць формы і мэты ўдзелу Касьцёлу ў грамадзкім жыцьці? Амаль на кожнай бэнзакалёнцы, у краме сёньня бачым пушкі з ахвяраваньнямі на патрэбы Праваслаўнай Царквы і ледзь ня ў кожным супэрмаркеце — шапік з праваслаўнай духоўнай літаратурай. Гэта ня можа ня цешыць. Аднак засмучае, што няма побач скрынак каталіцкіх (як і пратэстанцкіх). Касьцёл застаецца сацыяльна пасіўным, абмяжоўваючы свае патрабаваньні да цывільных толькі ўдзелам у Сьв.Імшы. Што робяць каталікі, выйшаўшы за дзьверы храму, ніхто ня ведае.

У гэтай пасіўнасьці ёсьць некалькі прычынаў: па-першае, шмат каму як з ксяндзоў, так і з шараговых вернікаў дагэтуль падаецца, што Касьцёл «прыгнятаюць», забываючыся, што ён рэальна зьяўляецца канфэсіяй №2 у краіне і ніякіх канкрэтных фактаў яго перасьледу не зафіксавана. Але многім ксяндзам, а таксама цывільным, проста больш утульна нічога не рабіць: не займацца актыўнай эвангелізацыяй, не нагадваць усім пра каталіцкія сьвяты і звычаі, не распаўсюджваць каталіцкі друк такімі самымі спосабамі, як гэта робяць праваслаўныя. Я ўжо не кажу пра каталіцкія дзіцячыя садкі, гімназіі і ўнівэрсытэт. Вельмі камфортная пазыцыя: глуха намякаць на нейкія «забароны» і «перашкоды», якія дзяржава нібыта чыніць каталіцкім культурным ініцыятывам — не прыводзячы пры гэтым ніякіх фактаў забаронаў і перашкод.

> На кожнай бэнзакалёнцы сёньня бачым пушкі для ахвяраваньняў на Праваслаўную Царкву. Дзе ж побач скрынкі каталіцкія і пратэстанцкія?

Па-другое, трэба здаваць справу з катастрафічных стратаў, якія панесла каталіцкая супольнасьць Беларусі падчас II сусьветнай. Татальнае зьнішчэньне духавенства і актыву абодвума таталітарнымі рэжымамі, якія сышліся ў гіганцкай мясарубцы, і масавая эміграцыя — спачатку ў 1944 г., потым некалькімі хвалямі ў 1940-х — 1950-х гадах (якая, дарэчы, дала ўсю вярхушку сучаснага істэблішмэнту Польшчы). З усіх даваенных этнічных і канфэсійных супольнасьцяў Беларусі, бадай, толькі габрэі зазналі большыя страты ў працэнтным дачыненьні.

Паўстагодзьдзя таму ў Беларусі засталіся пераважна горш адукаваныя, зь нізкім сацыяльным статусам каталікі, пераважна жыхары аграрных раёнаў Гарадзенскай вобласьці, і працэс іх урбанізацыі далёка не завершаны нават сёньня. Гэта адбіваецца на культурным узроўні як духавенства, так і цывільных. Вельмі часта на фоне ксяндзоў — выхадцаў з Польшчы, Літвы, Украіны, якія і больш актыўна адбудоўваюць парафіі, і арганізоўваюць сацыяльную актыўнасьць парафіянаў — выпускнікі Гарадзенскай сэмінарыі, якія часам не валодаюць элемэнтарнымі цывілізацыйнымі ведамі па-за катэхізісам, глядзяцца вельмі «блякла». Паляпшэньне якасьці каталіцкай адукацыі мусіць стаць асноўным клопатам Касьцёлу на бліжэйшыя дзесяцігодзьдзі.

**Алесь Белы, гісторык**

## Піша Павал Севярынец

**Дзякуй за апошнія нумары «Нашай Нівы»! Цяпер газэта даходзіць рэгулярна, і яе ў Малым Сітне чытаюць, як і раней.**

Карыстаючыся выпадкам, хацеў бы перадаць шчырую падзяку Алегу Паўкштэлу і Пятру Рудкоўскаму, адрасоў якіх ня ведаю.

І яшчэ. Прашу надрукаваць удакладненьне адносна «Ліста зь лесу» («НН», №6, 10 лютага). Артыкул называўся насамрэч «Магілка з чырвонай пэнтаграмай», а ня «Лёгіка з чырвонай пэнтаграмай», і ў апошнім абзацы замест «глядзіш на гэтыя злыя крывыя значкі...» трэба чытаць «глядзіш на гэтыя злыя крывавыя значкі...».

Таксама вельмі прашу друкаваць займеньнікі, датычныя Бога (Ён, Яго і да т.п.) зь вялікае літары (напрыклад, у «Няма веры» надрукавалі з малой). Для хрысьціянаў напісаньне з малое літары ўспрымаецца як зьнявага.

**З удзячнасьцю і павагай
Павал Севярынец,
в.Малое Сітна**

## Лісты палітвязьням трэба пісаць

**У апошнім нумары «НН» надрукавала адрасы палітвязьняў для допісаў.** Сапраўды, любая падтрымка для іх надзвычай патрэбная. Няхай кожны дашле паштоўку, ці ліст. Добрае слова так патрэбна тым, хто зараз за турэмнымі мурамі ці на высылках. Можна ўявіць радасьць вязьняў ды разгубленасьць супрацоўнікаў калёній і хімій, калі да іх паднаглядных будуць несьці паштоўкі ледзь не мяхамі.

Мо ёсьць сэнс распачаць і іншыя акцыі падтрымкі палітвязьняў? Праваабарончыя арганізацыі малі б паспрыяць выхаду спэцыяльных паштовак. Добра было б, каб нейкі нумар «НН» ды «Народнай волі» чытачы атрымалі разам з укладзенымі паштоўкамі, малюнкі да якіх зрабілі мастакі. Кожны чытач здолеў бы зайсьці на пошту ды ўкінуць тую картку ў скрыню. Пагатоў прыклад у гісторыі ёсьць —— Заходняя Беларусь. Тады, пасьля арышту паслоў сойму, разышліся па Крэсах і сьвету паштоўкі з здымкамі арыштаваных, нарабіўшы вялікага шуму.

Згадваецца і вопыт польскай «Салідарнасьці». Падчас вайсковага стану шмат народу патрапіла да лягераў інтэрнаваных. Калі адзін зь лягераў распачынаў галадоўку, праз колькі дзён яе падтрымлівалі й у іншых лягерах дзеля салідарнасьці. Усё гэта рабілася без прымусу і намаўленьняў — кожны рабіў выбар сумленьня сам. Улады тады нічога не маглі зрабіць з сотнямі зьяднаных у адно людзей.

Тое, што ты не адзін, дадае веры і надзеі ў цяжкую хвіліну. І любая аб'яднаўчая акцыя цяпера найперш патрэбна нам.

**Іван Кавяра, Баранавічы**

## УДАКЛАДНЕНЬНЕ

Артыкул «200-годзьдзе амэрыканскай мовы» ў №8 быў падпісаны Алесем Кудрыцкім, тады як ягонае аўтарства належыць Сяргею Богдану.

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас:
а/с 537, 220050 Менск.
e-mail:
nn@promedia.by.
Факс: (017) 284-73-29.**

у кнігарнях з 23 лютага




ПАДПІСНЫ ІНДЭКС 00345

# Чаму Казуліна прапусьцілі

**Працяг са старонкі 7.**

іцца й нават спадабацца многім беларускім выбарцам. Дастаткова ўспомніць выбары 1994 г., якія Казулін назваў каляровай рэвалюцыяй.

## Просты, як праўда

Дык навошта ж уладзе патрэбны такі неўтаймаваны, кажучы па-расейску, «безбашенный» кандыдат? А дзеля таго, каб нэўтралізаваць сапраўдную альтэрнатыву — адзінага кандыдата ад дэмакратычнай апазыцыі.

Зьвярніце ўвагу, што БТ вельмі рэдка называе, калі ўвогуле называе, імёны кандыдатаў. Часьцей за ўсё, паказваючы Казуліна — напрыклад, кадры, дзе той спрабуе ўламіцца ў зачыненыя дзьверы нацыянальнага прэс-цэнтру, — БТ гаворыць проста: «апазыцыя». Маўляў, усе яны там аднолькавыя. Казулін, выглядае на тое, здолеў добра напалохаць сваімі нястрыманымі паводзінамі ды манерамі дэсантніка значную частку абывателяў. Але частка ўспрымае словы кандыдата як адкрыцьцё.

Мілінкевіча ж зь ягоным інтэлігэнтным тварам увогуле стараюцца не паказваць. У гледача, які ў масе сваёй ня ведаў дагэтуль ні Казуліна, ні Мілінкевіча павінен сфармавацца ў сьвядомасьці штамп: абое рабое.

Але ж ці не рызыкуе ўлада, дапамагаючы «раскруціць» былога марпеха, наваяўленага клона дзейнага прэзыдэнта? Не, не рызыкуе, бо, у адрозьненьне ад каманды Кебіча ў 1994-м, улада сёньня цалкам кантралюе гэты працэс.

Усе мінулыя й будучыя эксцэсы, зьвязаныя з Казуліным, улада будзе імкнуцца прычапіць да Мілінкевіча, зваліць на яго ўсе чужыя грахі з мэтай дыскрэдытацыі аб'яднанай апазыцыі. А потым, на сьмех, яна афіцыйна «падзеліць» паміж двума кандыдатамі якія-небудзь паўадсоткі галасоў. Не 20—25%, на якія некаторыя апазыцыянэры ўсё яшчэ спадзяюцца, а менавіта нуль цэлых, некалькі дзясятых...

На сайце tut.by былі зьмешчаныя вынікі інтэрактыўнага апытаньня наведнікаў: выступ якога з двух кандыдатаў больш спадабаўся — Казуліна ці Мілінкевіча? За кожнага выказаліся па 33 працэнты. Зразумела, вынікі апытаньня на адным з сайтаў яшчэ не паказчык агульных настрояў электарату. Але ж тое, што галасы ў гэтым выпадку падзяліліся акурат пароўну, аб нечым гаворыць.

Сябрам каманды Мілінкевіча нічога не застаецца, як моўчкі назіраць за ростам папулярнасьці спаборніка — «раскольніка». Трэба прызнаць, што ў гэтага кандыдата «адзінаму» ёсьць чаго павучыцца: той самай рашучасьці, жорсткасьці, уменьня знайсьці самыя балючыя кропкі ў ворага, здольнасьці ня толькі гучна гаварыць, але рабіць нестандартныя ўчынкі. Цяпер, аднак, часу вучыцца ўжо няма — апазыцыі даводзіцца дзейнічаць ва ўсё больш жорсткіх, абмежаваных часам і дзеяньнямі ўладаў, умовах. І калі, напрыклад, улада пойдзе на рэпрэсіі супраць аднаго з кандыдатаў, другому прыйдзецца прымаць цяжкія рашэньні, улучна з тым, ці ўдзельнічаць далей у выбарах. Ці гатовая апазыцыя да такога разьвіцьця падзеяў? Ці гатовая яна, напрыклад, перайсьці да байкоту? Пытаньняў узьнікае ўсё больш. Між тым, ствараецца ўражаньне, што апазыцыя замест таго, каб спрабаваць адказаць на самыя вострыя пытаньні й выклікі, усё больш ператвараецца ў назіральніка за падзеямі, хада якіх ад яе ўжо нібы й не залежыць.

## Асымэтрычны адказ

Трэба заўважыць, паміж іншым, што абодва кандыдаты рэзка крытыкавалі ў сваіх выступах уладу — адзін больш, другі менш — за мінулае, але ніхто зь іх не згадаў арыштаў маладых грамадзкіх актывістаў, якія правёў напярэдадні КДБ. Магчыма, кандыдаты проста не пасьпелі адрэагаваць? У адрозьненьне ад дзяржпартамэнту ЗША.

Насамрэч, улада на першыя выступы кандыдатаў усё ж ткі адрэагавала. Толькі гэта быў, так бы мовіць, асымэтрычны адказ. Мілінкевічу, які казаў аб правох чалавека і аб неабходнасьці выхаду зь міжнароднай ізаляцыі, адказам стаў арышт накладу брашураў з тэкстам рэзалюцыі ААН аб стане правоў чалавека ў Беларусі. У сувязі з распаўсюдам афіцыйнага дакумэнту ААН чэская амбасада ў Менску была абвінавачаная ледзь не ў дывэрсійнай дзейнасьці.

У сувязі з гэтым успамінаецца эпізод трыццацігадовай даўніны. Тэкст заключнага Хэльсынскага пагадненьня, якое паклала пачатак стварэньню АБСЭ, у 1975-м быў апублікаваны ў савецкіх газэтах. Там быў і разьдзел, які датычыў правоў чалавека. Дык вось, чытаць тыя газэты ў савецкіх папраўчых лягерах было катэгарычна забаронена — за гэта зэк мог патрапіць у карцэр як за нелегальную літаратуру. Як бачым, лягерныя парадкі ў цяперашняй Беларусі дзейнічаюць і ў грамадзянскім жыцьці.

«Адказ» Казуліну быў яшчэ больш суворым. Газэта сацыял-дэмакратаў «Згода» зачыняецца паводле рашэньня пракуратуры за перадрук карыкатураў на прарока Мухамада.

Рэч ня толькі ў тым, што галоўны рэдактар газэты Кароль уваходзіць у выбарчы штаб Казуліна. Факт публікацыі стаўся цудоўным падарункам для дзяржаўнай прапаганды, якой ня трэба больш нічога прыдумляць. Зь яе гледзішча, апазыцыя займаецца распальваньнем міжканфэсійнай варажнечы з мэтай дэстабілізацыі становішча ў краіне. БТ, зразумела, спакойна можа паказваць фільмы кшталту «Духоўнай вайны», якім пазайздросьціў бы нават нябожчык Уладзімер Бягун, няс-




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

томны змагар з жыдамасонскай змовай і сіянізмам. Абразы пэўнай нацыянальнасьці ня лічацца на постсавецкай прасторы злачынствам.

Дый меркаваная абраза пачуцьцяў мусульманскіх вернікаў улады, напэўна, мала хвалюе. Бо ўявіць сабе дэманстрацыі пратэсту мусульманаў у Беларусі, асабліва калі ўлічыць іхную колькасьць, а таксама сьціплы наклад газэты «Згода», немагчыма нават у дурным сьне.

## Не рабіць хвалю

Можна, вядома, усьлед за Аляксандрам Фядутам усклікнуць: я карыкатураў ня бачыў, але іх публікацыю асуджаю! Няхай жыве паліткарэктнасьць! Праблема паліткарэктнасьці, вядома, самая актуальная з усіх праблемаў, якія хвалююць сёньня беларусаў. Праблема свабоды слова, а таксама свабоды сумленьня ў Беларусі з адлегласьці, напэўна, выглядае ў параўнаньні з паліткарэктнасьцю такой драбязой, пра якую ня варта й гаварыць. Само сабой зразумела, пачуцьці мусульманаў (як і хрысьціянаў, юдэяў, будыстаў, крышнаітаў і г.д.) трэба заўсёды ўлічваць і паважаць. Аднак калі ўлада становіцца на бок абскурантаў і рэлігійных фанатыкаў, то ў першую чаргу такая ўлада заслугоўвае адпаведных ацэнак, а потым ужо газэта, якая набыла цяпер шырокую вядомасьць, дзякуючы рэпрэсіям айчыннай улады.

Няўжо камусь не зразумела, што карыкатуры ў дацкай газэце былі толькі падставаю, а не прычынай масавых дэманстрацыяў, інсьпіраваных рэжымамі некаторых азіяцкіх краінаў? Гэтак перадрук карыкатураў у Беларусі стаўся ўсяго толькі падставаю, абгрунтаваньнем новых рэпрэсіяў супраць незалежнага друку і шальмаваньня апазыцыі ў пярэдадзень выбараў. Не было б гэтай недарэчнай публікацыі — знайшлася б ці была б прыдуманая іншая падстава.

Падсумоўваючы вынікі першых тыдняў выбарчай кампаніі, можна заўважыць, што грамадзкае жыцьцё, грамадзкая дыскусія, дзякуючы абодвум апазыцыйным кандыдатам, яўна ажывілася. Даўно не было чуваць гэткіх гарачых спрэчак паміж звычайнымі людзьмі, якія даўно, здавалася б, махнулі рукой на палітыку і на палітыкаў. І гэта было б добра. Калі б за спрэчкамі ды дыскусіямі праглядала хоць нейкая альтэрнатыва цяперашняму стану рэчаў. Загадзя прашу прабачэньня ў тых чытачоў, якім ужо, мабыць, надакучыла манера аўтара гэтых радкоў згадваць старыя анэкдоты. Але не магу ўстрымацца, каб не згадаць яшчэ адзін: пра людзей, якія сядзяць па самыя шыі ў дзярме. Адзін зь іх раптам пачынае махаць рукамі й крычэць: «Хопіць! Колькі можна цярпець?! Сорамна! Трэба нешта рабіць!» А сусед, захлынаючыся, крычыць яму ў адказ немым крыкам: «Не рабі хвалю, не рабі хвалю!..»

І сапраўды, колькі можна? Трэба выбірацца.

# Табу на Беларусь

**ТАЦЯНА БАРЫСІК**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Калі ў часе шпацыру па цэнтры вялікага гораду перад вамі ўзьнік прывід збожжаўборачнай тэхнікі — не палохайцеся і не сьпяшайцеся бегчы да псыхіятра. Вар'яцтва ні пры чым. Проста вы ўбачылі ўзор агітплякату «Табе, Беларусь!»

За савецкім часам кожны грак, зірнуўшы на аналягічны плякат, разумеў — сапраўдны патрыёт павінен: запісвацца добраахвотнікам, захоўваць грошы ў ашчадкасе, карыстацца паслугамі дзяржстраху.

Што хочуць давесьці аўтары цяперашніх агітплякатаў — уцяміць цяжка. Ці то ўплыў сучасных формаў мастацтва празьмерны, ці то ідэйны зьмест недапрацаваны.

Таму без дадатковага тлумачэньня задумы стваральніка і выпраўленьня некаторых дэталяў не абысьціся. Прыглядзьцеся ўважліва да вышэйпамянёнага плякату. На пярэднім пляне — жытнёвыя каласы. Але іх колькасьць ня тое што на капу — на сноп ня цягне. Кожнаму відавочна — жменька збажыны аніяк ня можа ўслаўляць рэкордны, сумленна сабраны сёлетні ўраджай зерневых. Нешматлікія каласы хутчэй падаюцца зрэзанымі нечай спрытнай рукою на грамадзкім палетку або па заказе «выпадкова» скінутымі з воза. Яны ўвасабляюць мужнасьць беларускага народу. За крадзеж пары каласкоў калісьці давалі тэрмін.

На заднім пляне — збожжаўборачная тэхніка ў стылі імпрэсіянізму. Настолькі размыта і невыразна, што пазнаць камбайн можна толькі па характэрным чырвоным колеры і самім факце знаходжаньня ў летні пэрыяд побач са збажынаю. Убачыць камбайн так можна толькі ў сьпякотны дзень п'яным вокам, і менавіта такі погляд на ўборачную надае шэдэўру агітацыі сучаснае гучаньне. А ў спалучэньні з крадзенымі каласамі сымбалізуе непарыўную повязь калгаснай мінуўшчыны і сучаснасьці, самаахвярнасьць у імя бацькаўшчыны. Толькі надпіс «Табе, Беларусь!» робіць сур'ёзны прапагандысцкі твор ідэалягічна нявытрыманым.

Ці патрэбны Беларусі ахвяры такога кшталту? Дзеля выпраўленьня становішча трэба зьмяніць усяго некалькі літар. Табу на Беларусь! — вось цяпер надпіс адпавядае сэнсу адлюстраванага і робіць яго зразумелым для простага чалавека.

Яшчэ адзін з узораў прапагандысцкай думкі пад назваю «Квітней, Беларусь». У цэнтры — абрысы Беларусі і надпіс. Справа — айчынная тэхніка. Зьлева — бор, зубр п'е ваду з рэчкі.

Творам аўтар хацеў паказаць варыянты бачаньня шляхоў да квітненьня Бацькаўшчыны, плюралізм беларускай думкі. Хто ў мэханізатары, хто ў партызаны, хто ў зубры. Задума цяперашнім сьветам сьмелая. Толькі фактару, што кансалідуе грамадзтва незалежна ад палітычных поглядаў, не хапае. Адыграць яднальную ролю маглі б выявы алькагольнай прадукцыі вытворчасьці РБ.

У Магілёве каля лядовага палацу з аднаго боку шчыта красуецца патрыятычны плякат, а з другога — рэкляма рэчыцкага піва. Калі ў цэнтар агітацыйнага «Квітней, Беларусь!» зьмясьціць куфаль «Рэчыцкага», пляшку клімавіцкай гарэлкі або «Крыжачка», дык заклік будзе выглядаць прыгожым тостам, блізкім сэрцу кожнага беларуса. Тады плякат наглядна прадэманструе, адкуль бяруцца грошы на квітненьне бацькаўшчыны. Дый рэклямныя плошчы вызваляцца.

*Магілёў*



Хто ў мэханізатары, хто ў партызаны, хто ў зубры. Задума цяперашнім сьветам сьмелая.

# Тэхналёгіі ўзьдзеяньня на сьвядомасьць

«Сёньня мы спакойна бачым на прылаўках малако, мяса, масла, тлушчы і так далей»: палітоляг **Павал Вусаў** раскрывае тэхналёгіі ўзьдзеяньня на сьвядомасьць на прыкладзе адной з прамоваў Аляксандра Лукашэнкі.

*Прыйшлі ў палітыку, хочаце стаць прэзыдэнтам — вядзіце сумленную барацьбу.*
***Аляксандар Лукашэнка***

Нягледзячы на ўзмацненьне цэнзуры, звужэньне альтэрнатыўнага інфармацыйнага поля і стэрылізацыі афіцыйных СМІ, апошнія, тым ня менш, прыцягваюць увагу з боку простых чытачоў і спэцыялістаў у вобласьці сацыяльнай і палітычнай камунікацыі. З аднаго боку, яна проста перапоўнена пафаснымі артыкуламі, якія ўсхваляюць беларускага кіраўніка і выпрацаваную ім палітычную і эканамічную мадэль разьвіцьця. З другога — нават яна ня ў стане схаваць аб'ектыўных сацыяльных і палітычных супярэчнасьцяў у грамадзтве. Спрабуючы закамуфляваць канфлікты і супярэчнасьці прыгожымі словамі, яна прымушае ўважлівага чытача зьвярнуць на сябе ўвагу. Гэта тычыць злачыннасьці, карупцыі, прастытуцыі, наркатрафіку. Адна газэта піша пра посьпехі ў вобласьці антыкарупцыйнай праграмы, як тут жа ў навінах паведамляюць, што арыштаваны намесьнік дырэктара за буйны хабар. Ствараецца ўражаньне, што чым больш саджаюць і арыштоўваюць, тым больш даюць і бяруць.

Хацелася б зьвярнуць увагу на разлогі артыкул «Дзяржава — для людзей» — друкаваны варыянт інтэрвію прэзыдэнта тэлеканалам («Беларусь сегодня», 31 студзеня). Гэты артыкул утрымлівае ня толькі погляды А.Лукашэнкі на палітыку, будучыя выбары, жыцьцё беларускіх грамадзянаў, апазыцыю, але і акрэсьлівае культурны пласт кіраўнічай эліты і часткі беларускага грамадзтва. У публікацыі ўтрымліваецца шэраг палітычных тэхналёгій, якія былі прыменены для ўнушэньня чытачам неабходных меркаваньняў на палітычную і сацыяльную рэчаіснасьць. Асобныя меркаваньні прэзыдэнта вартыя таго, каб увайсьці ў гісторыю палітычнай думкі.

Першым маніпуляцыйным крокам зьяўляецца падзагаловак артыкулу «Інтэрвію прэзыдэнта беларускім тэлеканалам». Хоць у ім ня ўказана ні прозьвішча, ні імя таго, хто ёсьць гэтым прэзыдэнтам, аднак усім адразу становіцца ясна, хто гэты чалавек. У сьвядомасьці большасьці беларусаў прэзыдэнт асацыюецца толькі і выключна з А.Лукашэнкам. Здаецца, што гэта слова стала ўжо ў нашым грамадзтве імем собскім і кладзецца ў наступную формулу: Лукашэнка — гэта прэзыдэнт, прэзыдэнт — гэта Лукашэнка. Таму бігборды пра выбары дакладна ўпісваюцца ў гэтую формулу: «Выбары прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь», падтэкст — «выбары А.Лукашэнкі». Цікава, ці не супярэчыць гэта выбарчаму кодэксу?

Апроч таго, лёгіка артыкулу выбудавана такім чынам, што, прайшоўшы цераз яркую карціну, што паказвае вялікія дасягненьні ўлады, гнюснасьць і хціваСЬць ейных апанэнтаў, чытач устае перад неаспрэчным фактам, які агучыў сам А.Лукашэнка: «прадэманстраваць ў гэтую перадвыбарчую кампанію людзям, што нармальны ў іх прэзыдэнт. Не патрэбны нам іншы прэзыдэнт».

## Паміж прэзыдэнтам і мэсіяй

Кожны ведае казку «Пра рыбака і залатую рыбку», калі злая старая заявіла, што ня хоча быць стаўбавою дваранкаю, а хоча быць уладаркай марскою. Напэўна, А.Лукашэнку пінжак прэзыдэнта стаў малы, і ён пачынае прымерваць плашч мэсіі. Матыў мэсіянства вельмі часта ўжываўся ў стварэньні і ўкараненьні недэмакратычных ідэалёгій, якія сьцьвярджалі, што жыцьцё цэлага народу залежыць ад волі аднаго кіраўніка, а лёс краіны — неразрыўна зьнітаваны зь лёсам правадыра. Прычым прыход гэтага кіраўніка прымае форму боскага дару для народу. Так было ў КНР, СССР, нацысцкай Нямеччыне і фашысцкай Італіі. Важна адзначыць, што паступова грамадзкая легітымізацыя перастае мець якое-кольвек значэньне, так як кіраўнік становіцца памазанцам Божым і толькі воляю самога Бога, а не народу можа быць зьняты.

Жаданьне наблізіцца да боства сьвядома ці не, але адлюстраванае ў выказваньнях А.Лукашэнкі. «Але нас Госпад, напэўна, упаўнаважыў рабіць гэтую вялікую справу». Ці: «Вось кажуць Лукашэнка — дыктатар. Гэта ад чаго? Бо Лукашэнка часта бярэ на сябе тыя праблемы, якімі павінны займацца іншыя людзі». У іншым месцы: «Ён (прэзыдэнт. — **П.В.**) змагаецца з тымі злыбедамі, няшчасьцямі, якія так ці інакш аб'ектыўна могуць абрынуцца на нашу краіну. Вось, калі ласка, стыхія. Я змагаюся супраць гэтых стыхій, каб захаваць нашых людзей». Ідучы ўсьлед лёгіцы гэтых выказваньняў, можна зрабіць выснову, што нашае грамадзтва бездапаможнае і слабае, і яно загіне, калі ня будзе гэтага абаронцы. Аднак уявім, што сёньняшні прэзыдэнт — гэта дабро для беларусаў, клапатлівы і сумленны, моцны і справядлівы, вымушаны супраціўляцца усім, каб абараніць свой народ. Гэта значыць, што ўся палітычная і эканамічная сыстэма, якая функцыянуе ў краіне толькі дзякуючы прэзыдэнту, стане недзеяздольная ў выпадку, калі зь ім, крый Божа, нешта здарыцца. Усе палітычныя рэжымы і сыстэмы, што абапіраліся на аўтарытэт асобы, а не на сацыяльныя і палітычныя інстытуты, гінулі пасьля сыходу той ці іншай асобы, пасьля чаго грамадзтва трапляла ў цяжкі палітычны і эканамічны крызіс, а часам гінулі цэлыя нацыі, дзяржавы і цывілізацыі. І Лукашэнка ня вечны, у выніку, грамадзтва, звыклае да таго, што пра яго клапоцяцца, што ёсьць рука, што дае і карае, грамадзтва, што адвыкла ад самаарганізацыі і самакіраваньня, якое ня ўмее нічога рабіць без указаньняў зьверху, ня ў стане будзе кіраваць дзяржавай, апынецца ў палітычным і эканамічным хаосе, у якім яно апынулася на

Працяг на старонцы 32.

**Павал Вусаў** (Магілёў) — **палітоляг, былы выкладнік Магілёўскага дзяржаўнага ўнівэрсытэту імя Аркадзя Куляшова. Быў вымушаны звольніцца пад палітычным ціскам.**

# Тэхналёгіі ўзьдзеяньня на сьвядомасьць

Працяг са старонкі 31.

пачатку 1990-х. Тыя сацыяльныя, эканамічныя і палітычныя язвы, якія ўзмоцнена хаваюцца, атакуюць увесь сацыяльны арганізм і могуць прывесьці да ягонай гібелі. Цікава, ці думаў прэзыдэнт пра тое, як будзе жыць ягоны народ, калі адбудзецца зьмена ўлады? Ці ён кіруецца прынцыпам Люі XV: «Пасьля мяне хоць патоп». Сыстэма, што створана, — гэта сыстэма Лукашэнкі, а не сыстэма беларускага грамадзтва, яна сыдзе разам зь ім. А з чым застанецца грамадзтва?

## Мы і яны

У кантэкст палітычнага мэсіянства і сацыяльна-палітычнай мадэлі дакладна кладзецца прынцып сацыяльнага водапазьдзелу «мы» і «яны». Ён дакладна акрэсьлены А.Лукашэнкам. Прычым панятак «яны» ў яго выступе набывае форму таго Мы, пра якое пісаў Замяцін. Адмысловы псыхалягічны і сацыяльны стан, у якім сьціраецца «я» і няма месца для «яны», дзе пануе прынцып «хто ня з намі, той супраць нас».

Аналізуючы выступ Лукашэнкі, можна меркаваць, што ў большасьці выпадкаў займеньнік «мы» замяняе «я».

Напрыклад, на пытаньне А.Зімоўскага: «Ёсьць штамп: Крэмль — вам падтрымку, вы ім — уласнасьць дзяржаўную. Ці яшчэ адзін: вы ім усё ўжо аддалі, потым высьвятляецца, што не аддалі…» — Лукашэнка адказвае: «...Мы нічога не аддалі і аддаваць ня маем намеру. Я за сьпінай у вас, у свайго народу нічога такога не рабіў».

Апроч таго ў гэтым артыкуле займеньнік «мы» часьцяком адначасова ўключае ў сябе розныя сацыяльныя і палітычныя суб'екты, пачынаючы ад прэзыдэнта і палітычнай улады, заканчваючы народам у цэлым. З гэтай жа прычыны абагульненьне многіх суб'ектаў, прыданьне ім формы «мы» часам абцяжарвае разуменьне таго, пра што канкрэтна гаворыць Лукашэнка. Так, напрыклад, крытыкуючы апазыцыю, Лукашэнка, кажа: «Але ці гэта нармальныя людзі, ці гэта нармальная апазыцыя? Мы ж ужо разумныя людзі, мы ўжо не зусім «маладыя», як былі раней. Мы разумеем, чаго яны хочуць. Таму мы ім падарункаў рабіць не намерваемся». Іншая цытата: «Мы толькі чатыры-пяць гадоў таму пачалі сыстэмна працаваць».

Даючы ацэнку гэтым і аналягічным выказваньням, можна меркаваць, што ўлада ў Беларусі перастала быць нечым аб'ектыўным, што стаіць па-за жаданьнямі, эмоцыямі суб'екту, яна цалкам зьлілася зь ім. Адбылося мэнтальнае і рэальнае зрастаньне катэгорыі «ўлады» і ўласнага «я». «Я» прэзыдэнта ня мысьліць і не ўяўляе сябе па-за ўладай. Выйшла формула: «я» — гэта ўлада, улада — гэта «я». Таму дзеяньні ўлады — гэта мае дзеяньні, і наадварот.

Што датычыць самой катэгорыі «мы», то з аднаго боку — гэта спрашчэньне рэчаіснасьці, з другога боку — працяг працэсу сацыяльнай ідэнтыфікацыі з прэзыдэнтам. «Мы захавалі краіну. Сёньня мы спакойна бачым на прылаўках малако, мяса, масла, тлушчы і так далей».

«Мы» — бязьлікая і абстрактная зьява. Няма ні беларусаў, ні грамадзтва, ні індывіда. Ёсьць толькі «мы», што жывуць аднымі думкамі, якія ня могуць быць асьпрэчаныя і ня могуць быць не прынятыя. «мы» — гэта абсалютнае дабро, па-за намі іншага дабра не існуе. Мы мусім будаваць сваё жыцьцё так, як «мы» гэтага хочам. Вынікі з таго, што кажа прэзыдэнт: «жыцьцё ідзе сваёй чарадой: мы будзем сеяць хлеб, расьціць дзяцей, мы будзем убіраць гэты хлеб, карміць сваіх дзяцей і самі будзем нармальна жыць» — грамадзтва павінна абмяжоўвацца толькі сваімі фізіялягічнымі патрэбамі і кіравацца традыцыйным ўспрыняцьцем сьвету. Прычым зь сьвядомасьці «Мы» няўмольна выкараняецца такі тэрмін, як свабода. Ні разу на працягу свайго выступу прэзыдэнт не сказаў слова свабода, свабоднае грамадзтва, свабодная краіна. Відаць, падсьвядома ён і журналісты разумеюць, што краіна несвабодная. Ды пачуцьце свабоды характэрнае індывіду, а ня масе, не для «мы». Такая ёсьць філязофія «мы», а тыя, хто не ўспрымае гэтай філязофіі, безальтэрнатыўна адносяцца да другіх, да тых, каго прэзыдэнт называе «яны». Панятак «яны» ўлучае ў сябе ўсе нэгатыўныя зьявы сацыяльнага жыцьця, так званае сацыяльнае зло. «Яны» — гэта апазыцыя, што процістаіць «мы» і нармальнаму «жыцьцю». Яны хочуць болей, чым проста сеяць хлеб. «Яны што, разьлічваюць, што народ беларускі за іх прагаласуе, калі яны робяць паскудзтвы гэтаму народу? Ну, прабачце, поўныя адмарозкі!» «Вось яны і кажуць. Калі б яны гэтага не казалі, ім бы не далі грошай. Таму за тое, што яны кажуць, ім плацяць». Катэгорыя «яны» таксама не патрабуе канкрэтызацыі, і так зразумела — гэта чужыя, ворагі, не свае, і ня важна, хто яны насамрэч. Тут дзейнічае формула «яны ворагі, бо яны ворагі». Навошта даводзіць адваротнае? А ворагаў трэба зьнішчаць.

«Яны» — гэта дурні, адмарозкі, здраднікі, хлусы, сацыяльныя ўтрыманцы. Яны не разумеюць, што адзінае дабро для краіны — гэта А.Лукашэнка. «Але вы ведаеце, што сярод апазыцыі ня так ужо і шмат людзей, якія падтрымліваюць іншых кандыдатаў. Ну, дурняў жа няшмат». Хочацца сказаць А.Лукашэнку, што ў ліку гэтых дурняў шмат цудоўных прадстаўнікоў беларускага грамадзтва — лекараў, настаўнікаў, акадэмікаў, бізнэсоўцаў, палітыкаў, маці і бацькаў, якія пакуль маўчаць, бо вы правільна адзначылі: «у іх жа дзеці, у іх сем'і, яны жывуць у гэтым грамадзтве, а за мяжу ня ўсе зьбягуць». Хоць нават паводле зьвестак БТ (праграма «Наши новости», ОНТ, 31.01.2006) 64 тыс. грамадзянаў Беларусі пакінулі гэту краіну толькі ў 2005 г. Магчыма, вельмі хутка ў гэтай краіне не застанецца ніводнага дурня.

У цэлым жа публікацыя поўніцца дакладнымі і канкрэтнымі ўстаноўкамі і для грамадзянаў (як і за каго галасаваць), і для прадстаўнікоў улады (як і што рабіць, каб людзі прагаласавалі). Часам сумленнасьць, шчырасьць прэзыдэнта ўражвае. «Яны (апазыцыя) крычаць: Лукашэнка замінае зьбіраць подпісы. Мы наадварот будзем ім дапамагаць зьбіраць гэтыя подпісы, каб яны выйшлі на прэзыдэнцкія выбары...» Цікава ведаць, для чаго і каму ўлады дапамагалі зьбіраць подпісы? Можа, яны і ксэракопіі для некаторых кандыдатаў ад апазыцыі рабілі?




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Кішка

Сьвежая кроў у хатніх умовах даступная часьцей узімку, таму гэта сэзонная страва. Пра беларускую крывяную кілбасу піша **Алесь Белы**.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

### Традыцыйная бульбяная

На 4—5 порцый: 1 кг бульбы, 1 ст. лыжка алею, 200 г шынкі, 2 цыбуліны, 1 яйка, тоўстыя сьвіныя кішкі (каля 150—200 г), соль, перац, 1/2 лыжачкі маярану (або мацярдушкі), 4 зубкі часныку.

**Бульбу патаркаваць, дадаць алею, каб не чарнела. Шынку нарэзаць дробнымі скрылёчкамі, цыбулю парэзаць, разам прыпусьціць на патэльні. Да бульбы разам з сольлю і затаўкамі дадаць яйка (як варыянт), добра перамяшаць. Добра памыць кішкі і нацерці сольлю зь цёртым часныком. Нарэзаць кавалкамі 25—30 см удоўжкі. Перавязаць з аднаго боку і напоўніць фаршам з дапамогай варонкі (на 2/3 аб’ёму), завязаць. Разагрэць духоўку да 180°С цягам 10 хвілін. Накалоць кожны кавалак відэльцам у некалькіх месцах і запякаць у духоўцы 30—40 хвілін, пераварочваючы некалькі разоў. Падаваць са сьмятанай або сыраквашай.**

Слова наўрад ці сёньня можна пачуць у крамах ды ўстановах грамадзкага харчаваньня. Хоць страва ня зьнікла, шмат дзе на вёсках адзін з варыянтаў гатуюць і цяпер, хіба называюць інакш. Хто ня ведае традыцыйнай *крывянкі*?

У адвараныя або сырыя крупы (грэцкія, радзей ячныя або рысавыя) дадаюць тлушч, скваркі, затаўкі і сьвежую сьвіную кроў, перамешваюць ды кладуць у тоўстыя сьвіныя кішкі, пякуць на бляхах або абварваюць, а потым падпякаюць. Часам замест крупаў кладуць муку. Сьвежая кроў у хатніх умовах даступная часьцей узімку, таму гэта сэзонная страва.

Прамысловасьць магла б рабіць яе цэлы год, але крывяная кілбаса ў нашых крамах мае мала супольнага са шматвекавой традыцыяй. Па-іншаму ў Польшчы, дзе традыцыйная крывяная кілбаса (кашанка) даступная ўсюды. Яна мае дыямэтар 5 см і даўжыню з далонь, мае чорна-фіялетавы колер. У гатэлях Літвы, Польшчы, Эстоніі, Чэхіі гэта абавязковая страва ранішняга стала.

Гарадзенскі мясакамбінат вырабляе некалькі «кашанак» з русіфікаванымі ці налётам «крэсовасьці» назвамі: «Выборова», «Пикантная», «По-гродненски». Горадня — унікальны горад, дзе польскі і расейскі культурныя шавінізмы выдатна ладзяць паміж сабой, ня маючы патрэбы ў беларускім пасярэдніцтве.

Даўняя беларуская назва была менавіта *кішка*, так яе называюць пісьмовыя крыніцы. Паводле легенды, прозьвішча даўняга магнацкага роду Кішак паходзіць ад таго, што заснавальнік — ці то Пётар, ці то Станіслаў (XV ст.) — вельмі любіў такую кілбасу. Літоўцы называюць яе *vіdaraі*, што перакладаецца як «кішкі» або «вантробы» — зрэшты, множны лік як варыянт назвы нярэдкі і ў Беларусі. Вядомы варыянт *кішкі* з грэцкай крупой, але без крыві — з варанай сьвінінай.

У XIX ст., калі шырокі распаўсюд бульбы выклікаў рэвалюцыю ў харчаваньні беларусаў, зьявіўся новы тып кішкі — кілбаса з таркаванай бульбы са сьвінымі скваркамі. Паступова словам «кішка» пачалі называць пераважна такі тып кілбасы, а традыцыйную з крыві і грэчкі — болей «крывянка», хаця нельга сказаць, што такі падзел праводзіўся пасьлядоўна. Новы тып кішкі шырока распаўсюдзіўся ў Беларусі і Літве, а ад нас трапіў і ў Польшчу — як тыповая «крэсовая» страва з горка-настальгічным прысмакам 1944 г. Бульбяная кішка, хоць і зьявілася ў Беларусі значна пазьней за крывяную, зьнікла раней. Ужо некалькі гадоў у старажытнай Супрасьлі — калісьці цытадэлі беларускай культуры — штогод у траўні-чэрвені праводзіцца «чэмпіянат сьвету» ў прыгатаваньні бульбяной кішкі і бабкі, але мне не даводзілася чуць пра ўдзел у ім беларускіх камандаў. Прынамсі, пасьпяховы.

Шкада кішкі, і бульбяной, і крывяной, і слова, і стравы. Слова карэннае беларускае, бо па-польску гэтая частка вогранаў страваваньня называецца *jelita*, а *kiszka*, відавочнае запазычаньне зь беларускай, ужываецца толькі як назва бульбяной кілбасы. Але ў сучасных слоўніках беларускай мовы ня знойдзеце такога значэньня — толькі «гумавая або брызэнтавая трубка для падачы вады». Затое беларусы — адны з самых моцных у сьвеце ў пажарным шматбор’і…

Пару парадаў тым, хто захацеў бы абараніць у Супрасьлі гонар краіны. Напаўняйце кішку максымум на 2/3 аб’ёму і не забывайцеся накалоць кожны кавалак у некалькіх месцах відэльцам, бо інакш успучыцца. Таксама не палянуйцеся прынамсі раз перагарнуць кішку, каб забясьпечыць раўнамернасьць запяканьня.

# Хадун і луста: мовазнаўцы ў захапленьні

Сетка бістро «Хутка-смачна» беларусізавала назвы сваіх страваў. Як ацэньваюць наватворы мовазнаўцы?



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Зьміцер Саўка, суаўтар кнігі «Беларускі клясычны правапіс»:**

Сама ініцыятыва сымпатычная. Варта толькі даць колькі парадаў. Не пасьпелі мы адысьці ад савецкай кулінарнай традыцыі зь яе картофельным пюрэ (па-беларуску, дарэчы, таўпеня, таўканіца), як на нас наваліўся Галівуд зь ягонымі гамбургерамі і хот-догамі. Таму трэба зьвярнуцца да нашай гісторыі, што назапасіла багата ўласных назоваў кулінарных страваў. Іх толькі трэба адпаведным чынам актуалізаваць і прыстасаваць з улікам патрабаваньняў часу.

Калі гаварыць канкрэтна па назвах, то *хадун,* безумоўна, удалы варыянт, і няхай не палохае кагосьці сынанімічнасьць зь дзіцячай прыладай, бо ў той жа ангельскай мове існуе безьліч значэньняў аднаго і таго ж слова. *Луста*, ці *лусьцень* — гэта і ёсьць прыклад удалай актуалізацыі тэрміну, што ўжо існуе. *Златка.* Калі аўтары назову ў якасьці асновы ўжывалі слова «злата», то яны ня маюць рацыі, бо гэта стараславянізм, які пярэчыць прынятай практыцы поўнагалосься ў беларускай мове. Я прапанаваў бы якісь іншы варыянт, напрыклад *смажань*.

**Надзея Шакун, супрацоўніца Інстытуту мовазнаўства:**

У дачыненьні да *хадуна* і *лусты/лусьценя* мне ўсё зразумела — з пазыцыі словаўтварэньня ўсё тут нармальна. Калі пабачыш дзесьці такую назву і сам хадун, то сэнс назвы будзе зразумелы кожнаму, хто валодае беларускай мовай. *Златка* пакідае пытаньні. Нейкая непразрыстая назва. Аднак існуе панятак варыянтнасьці. Чым больш будзе існаваць варыянтаў, тым багацейшаю будзе мова. Таму пакінем гэтае права за аўтарамі.

**Зьміцер Паўлавец, загадчык катэдры беларускай культуры Гомельскага дзяржаўнага ўнівэрсытэту імя Скарыны:**

Пазытыўная зьява. Мы мусім мець свае зразумелыя кожнаму назвы.

У назьве *хадун* мне не падабаецца суфікс *—ун*, які мае рэзкае эмацыйнае адценьне, праставатае такое. Магчыма, нейкі іншы суфікс надаў бы назьве іншую эмацыйна-вобразную характарыстыку. А вось *златка* — неблагая назва, хоць тут прасочваецца нейкі ўплыў чэскай мовы.

*Луста* ці *лусьцень*? *Луста* гучыць традыцыйна. А лусьцень прадугледжвае, што на гэтай лусьце нешта ляжыць, таму, хутчэй за ўсё, такі варыянт больш адпавядае той страве, якую пад такой назвай прапануе «Хутка-смачна».

**Запісаў**
**Сямён Печанко**

14 лютага, на Дзень сьвятога Валянціна, споўнілася 100 гадоў з дня нараджэньня гісторыка й археографа Мікалая Ўлашчыка. Удзельнік Адраджэньня 1920-х, тройчы рэпрэсаваны. Пасьля трэцяга выраку ён не вярнуўся ў Беларусь. Атабарыўся ў Маскве, працаваў у Акадэміі навук СССР. Дзякуючы яму выйшлі два тамы беларускіх хронік у «Поўным зборы рускіх летапісаў».

Вяртаньне Ўлашчыка ў беларускую культуру й гісторыю дагэтуль ня скончылася, хоць і выйшлі ягоныя ўспаміны пра родную Віцкаўшчыну і нарысы па краязнаўстве, некаторыя іншыя кнігі.

Мастак Мікола Купава ў 1977 г. рабіў эксьлібрыс для кнігазбору Мікалая Ўлашчыка. З гэтага пачалося ягонае знаёмства зь легендарным гісторыкам.




# Эксьлібрыс Улашчыка

**«Наша Ніва»: Чаму гісторык зьвярнуўся да Вас?**

**Мікола Купава:** Зьміцер Санько, які вучыўся ў Маскве, быў зь Мікалаем Улашчыкам у добрых стасунках. І парэкамэндаваў зьвярнуцца да мяне, каб зрабіць кніжны знак. Я зрабіў эскіз — Улашчык ухваліў. Так і пачалі ліставацца.

**«НН»: А што за фігура паказаная на знаку?**

**МК:** Гэта сымбалічны летапісец, ёсьць цытата зь літоўскіх летапісаў. «Пагоня». У руках летапісца ключы ад гісторыі. Хутка мы і пазнаёміліся. Улашчык раз на год абавязкова прыяжджаў у Менск — на пару тыдняў, спыняўся ў сястры. Усе кнігі, якія ён тады выдаваў, дасылаў мне. Для яго гэта было вельмі важна: ён казаў, каб гэта ішло ня толькі мне, але і сябрам. Прыслаў два тамы беларускіх летапісаў, што выйшлі ў «Поўным зборы рускіх летапісаў». Улашчык гаварыў: былі цяжкасьці з выданьнем кнігі. Навошта расейцам выдаваць чужыя летапісы? Гэта ж «Поўны збор рускіх летапісаў»! Але ў 32-м томе — Хронікі Літоўская, Жамойцкая і Быхаўца, Летапісы Баркулабаўскі, Аверкі й Панцырнага. Улашчык казаў: «Мая задача самая галоўная была — каб выйшлі гэтыя летапісы пад грыфам Акадэміі навук СССР. Іначай бы яны ня вышлі».

**«НН»: Як Улашчык ставіўся да афіцыйнай вэрсіі пра «польска-літоўскае заваяваньне беларусаў»?**

**МК:** Міты для яго ніякага значэньня ня мелі. Ён па-сапраўднаму ставіўся да навуковых праблем, абапіраўся на летапісы — гэта яго грунт.

**«НН»: Калі Ўлашчык прыяжджаў сюды, ці згадваў ён пра свае маладыя гады, пра рэпрэсіі?**

**МК:** Пра рэпрэсіі не хацелася яму гаварыць. Былі моманты, калі ён згадваў, што тут пісалі на яго даносы. Не хацеў бачыцца зь некаторымі людзьмі, якія яшчэ жылі...

**«НН»: Дзе Вы сустракаліся?**

**МК:** Мы запрашалі яго ў майстэрню на вуліцу Дзімітрава.

Звычайна мы сустракаліся ненадоўга — усё ж 70-гадовы чалавек. Ён прыходзіў гадзіны на тры. Хацелася пачуць, што ён можа расказаць пра гісторыю ВКЛ. А адзін раз яго візыт мы скарысталі для паездкі. Сабралася даволі вялікая група мастакоў і навукоўцаў. Езьдзілі ў Заслаўе і на Менку, на першы старажытны Менск. Гэта быў год 1980, увосень, ужо лісьце апала.

А потым, у 1986 г., да 80-годзьдзя Ўлашчыка адбылася перадача на Беларускім тэлебачаньні зь ягоным удзелам. Запрашалі туды гледачоў — імі былі ўсе мы, беларуская публіка. Прыхільная, прыязная, свая аўдыторыя. Гэта для яго была вельмі значная паездка.

**«НН»: Ці малявалі Ўлашчыка пры ягоных прыездах?**

**МК:** Вядома! Маляваў, калі ён у сястры быў. У мяне быў накідак, і Ўлашчык нават хацеў яго купіць. Я кажу: «Мікалай Мікалаевіч, ну што вы! Я хачу зрабіць партрэт». Гэты накідак у мяне ёсьць і цяпер.

**Гутарыў Адам Воршыч**

## КОНКУРС



Літаратурны музэй імя Максіма Багдановіча абвяшчае конкурс дзіцячай творчасьці «Адлюстраваньні. (Асоба М.Багдановіча і яго творчасьць вачыма дзяцей XXI ст.)».

На конкурс прымаюцца літаратурныя творы, мастацкія і дэкаратыўна-прыкладныя, дасланыя на адрас музэя не пазьней за 31 кастрычніка.

Тэлефон для даведак: **234-07-61**
e-mail: bagdanovich@tut.by
220029 Менск, вул. Багдановіча, 7а

115-ГОДЗЬДЗЕ БАГДАНОВІЧА




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Што ж ета за празьнік такой?

Цытаты зьбірала **Тацяна Барысік.**

Тэлевядоўца аб сёлетнім ураджаі на фоне жытнёвых каласоў:
— Хлеб у беларусаў заўсёды лічыўся другой галавой.

***
З выступу галоўнага доктара наркадыспансэра:
— У нас у стране ня ўсе п’яніцы і алкаголікі. Ешчо давольна многа людзей, каторыя ходзят на работу, учацца ва ўчэбных заведзеніях.

***
Вядоўца абласнога радыё аб мерапрыемстве, прысьвечаным барацьбе з тытунём:
— Кожны, хто праходзіў па вуліцы Ленінскай, меў магчымасьць штурхнуць гіру, паскакаць на скакалцы. Усе дзеяньні суправаджаліся песьнямі.

***
На цэнтральнай вуліцы Магілёва БРСМ зладзіў акцыю «Моладзь супраць СНІДу».
Зьвечарэла. Прымусова сагнаныя школьнікі разьбегліся. Ля сцэны не засталося нікога, апроч двух міліцыянтаў.
— А працяг нашага сьвята адбудзецца ў памяшканьні дыягнастычнага цэнтру, — голасна абвяшчае вядоўца.
Выпадковы мінак, ідучы з работы:
— Інцырэсна, і што ж ета за празьнік такой?

***
Міліцыянт выступае на гарадзкой тэлевізіі. Размова ідзе аб крадзяжах на лецішчах:
— От, што такое пенсіянер? Ета ужэ зрэніе не тое і нікакога устрашаюшчага эфекта для злоумышленьнікаў!

***
Чыноўнік ад адукацыі ў радыёэтэры:
— Атэстат зрэласьці абясцэніўся. І ў рэзультаце чацьвёртая чэцьверць палучылася какая-то расхрыстаная.

***
З напісанага.
Рэклямная шыльда ў Бабруйску:
— Крама «Экзотык»! Заўсёды ў продажы сьвежае сала і мяса.

***
Надпіс на грамадзкай прыбіральні: «Туалет. Услугі платные».
Напісаць напісалі, а сьпіс паслуг дадаць забыліся.

***
Стандартнае месца адпачынку на прыродзе непадалёк ад Чачэвіцкага вадасховішча. Альтанка, столік, драўляныя грыбкі, вялізны размаляваны камень. Надпіс на здаравезнай шыльдзе «Экалёгія прыроды — экалёгія душы!».
За якіх пятнаццаць-дваццаць мэтраў жоўта-чорныя трохкутнікі папярэджваюць аб радыяцыйнай небясьпецы. А па ўзбочцы дарогі валачэцца спакутаваны дзядзечка з трыма пляшкамі чарніла. Дзьве — у руцэ, адна — пад пахай.

**На фота: дошка гонару слонімскага ЖЭСу.**

# Менскае Лі Гарві



АРТУР КЛІНАЎ

## ПАВАЛ КАСЬЦЮКЕВІЧ

Былая каханка забойцы амэрыканскага прэзыдэнта, не старая яшчэ жанчына, ужо пяць год як жыве ў бруднай дзірцы Афакім ды працуе на лініі ўпакоўкі таматнага соку. Пасьля вячэрняй зьмены вяртаецца ў прасторную дзвюхпакаёўку і, зьняўшы сланцы ў вітальні, босымі нагамі ступае на тонкі слой пяску, які за дзень нанёс нечаканы гарачы вецер з пустэльні. Улетку шыбы на вокнах — чыстая недарэчнасьць, але ж, бачыш, здараюцца неспадзёўкі. На ступаку костачка ля адзінца вытыркаецца шостым пальцам.

Засынае перад брунатным экранам з пультам у руцэ, так і не пасьпеўшы падключыць расейскія тытры. На экране, узброены, шчыруе містэр Дабро. Ён аўтаматычна залічвае да бэд гайз усіх істотаў, што трапляюцца па дарозе. Памылка выключаная, бо спатканцы і сустрэчнікі — брыдкія прыхадні, якія маюць зялёныя тулавы і шэсьць пальцаў на нагах. З ваннага пакою ў варыўню цягнецца ланцуг сьлядоў самотнага прыхадня.

На раніцу жанчына не ідзе на работу, а завітвае ў паліклініку. Сьмелы ход для таго, хто працуе за пагадзінную аплату. Грошы, якіх на ўсё, дзякуй богу, хапае, а больш ні на што не стае.

Найлітасьцівейшая доктар Шапіра ўжо даўно не выпісвае лекаў. О, дабраслаўлёная эміграцыя, у якой хворы выздараўлівае, а здаровы здаравее! Доктар добра абазнаная, што хворым не патрэбны лекі, бо іх адзіная хвароба — гэта невылечная прага сьвятаў. Заснуўшы ў аўтобусе па дарозе на працу, гэтыя людзі сьняць, як яны едуць у аўтобусе на працу, а там і паведамляюць: «Аўтобус далей не ідзе. Калі ласка, вяртайцеся дадому — вашу фабрыку сёньня ноччу ўзарвалі эскімоскія сэпаратысты».

Адзінае лякарства, якое прапануе найлітайсьцівейшая доктар Шапіра — гэта бальнічны ліст. Таму нічога дзіўнага ў дыялёзе жанчыны з доктарам няма.

— Доктар Шапіра! Дзень добры!
— Два дні.
— Не, доктар, вы не разумееце...
— Чатыры.
— Я сапраўды хворая.
— Пяць. Больш даць не змагу. Прыходзьце, калі яны скончацца — паспрабую нешта для вас зрабіць.

Пустыя вачніцы доктара Шапіры ў аздобе бранябойных акуляраў скіраваныя ў акно, тым часам як рука звыкла бегае па мэдычным блянку. Вачніцы заўсёды невідушча лашчуць бэз, які буяе на другім баку невялічкага пляцу.

На бяду просьбітаў — а часам на іх шчасьце — дух доктара Шапіры лунае на недасяжных піках цьвярозых рашэньняў. Тут, на зямлі, адно яе абалонка. Таму фразы «Выпішыце

# каханьне Освальда

мне анальгіну», «Які ж вы да халеры доктар, доктар Шапіра?» заўсёды захрасаюць у бахматых, па-ранейшаму чорных брывах доктара Шапіра ды не трапляюць у сьвядомасьць. Аднак жанчына — жанчына дабітная, мянчучка, вы ж знаеце менчукоў, яна цудоўна ведае што і як сказаць, каб спусьціць доктара на альпійскія лугі ўвагі, або нават на раўніну спагады.

— Разумееце, доктар, рэч у тым, што я лятаю.

Сын жыве асобна, займаецца творчасьцю і самакалупаньнямі. Самакалупаньні спрыяюць творчасьці. Яны размаўляюць толькі па тэлефоне. Яго цікавяць калярытныя людзі, незвычайныя падзеі, непадумныя супадзеньні і гульня словаў. Укладае песенькі, занатоўвае розныя нестандартныя гісторыі. Усё гэта ён захоўвае ў файле skarbonka.doc.

— Разумееце, ні ў сьне, ці там трызьню, ці якая псыхалягічная мэтафара палёту, а напраўду: калі вецер у твар, агні партызанскімі вогнішчамі, зямля падручнікам геамэтрыі. Разумееце, лятаю. На-сам-рэч.

Гісторыя з сыноўняга файлу. «Інтэлігентная жанчына, былая дацэнтка з Кіева, робіць прыбіральшчыцай у гандлёвым цэнтры. Па просьбе свайго сына сыходзіць раней з працы і едзе ў Тэль-Авіўскі ўнівэрсытэт, каб дапамагчы яму здаць пісьмовы іспыт па фізыцы. Схема простая: атрымаўшы заданьне, хлопец просіцца ў прыбіральню. Прасоўвае аркуш з заданьнем па падлозе ў сумежную кабінку, дзе павінна знаходзіцца маці. Ля ўваходу ў прыбіральню стаіць правяраючы, таму былая дацэнтка мусіць загадзя зашыцца ў кабінцы і сядзець там невылазна ўсе тры гадзіны, адведзеныя на іспыт. За сорак хвілінаў да заканчэньня экзамэну хлопец паўторна просіцца нібы справіць пільніцу ды ізноў заходзіць у тую ж кабінку, куды маці перадае яму ўжо гатовае рашэньне. Хлопец вяртаецца ў аўдыторыю і перапісвае рашэньне на чыставік.

Гэта ў ідэале, але фактычна адбываецца наступнае. Атрымаўшы ад сына заданьне іспыту і сеўшы на вечка ўнітаза, былая дацэнтка з жахам заўважае, што асадка ня піша. З уласнага досьведу яна ведае, што ў туалеце мусіць вісець журнал дзяжурстваў, дзе павінны расьпісвацца прыбіральшчыцы. Запэўніўшыся, што ля рукамыйніц нікога няма, былая дацэнтка, азіраючыся, як драпежны зьвярок, выбягае з кабінкі і пачынае похапкава шукаць той журнал з асадкай. Не знайшоўшы яго (знакам тым, журнал у жаночай), яна мусіць хутка вярнуцца ў кабінку: нехта тузае дзьвярную клямку.

Зьняможаная доўгім і бясплённым сядзеньнем у кабінцы, былая дацэнтка рашаецца на адчайны ход. Зноўку выскоквае з кабінкі, адчыняе напоўніцу вакно, потым спружыністым крокам выходзіць зь дзьвярэй мужчынскай прыбіральні на калідор і, прамармытаўшы «вой, пераблытала», пад канвоем зьдзіўленага позірку правяраючага шмыгае ў дзьверы жаночай прыбіральні, што знаходзіцца побач. Моцным рыўком адарваўшы асадку, якая вісела на шпагаце побач з прыбіральшчыцкім журналам, былая дацэнтка тут таксама адчыняе вакно і, зухавата скокнуўшы на батарэю, выходзіць у праём, дзе апынаецца на вонкавым падваконьні. Высока. Паміж ваконнымі праёмамі жаночай і мужчынскай прыбіральні больш за паўмэтры голай сьценкі, таму ёй трэба сьпярша паставіць на падваконьне мужчынскай прыбіральні нагу, а потым, чапляючыся рукамі за вуглы праёмаў, перанесьці на яго ўсё цела.

Былой дацэнтцы прыходзіць на розум, што яна ўжо не маладое дзяўчо. Гэтая думка наведвае дацэнтку якраз тады, калі яна ставіць нагу на вонкавае падваконьне мужчынскай прыбіральні. Думка нагэтулькі нечаканая, што імгненна пацяжэлае, сшэрхлае цела катэгарычна адмаўляецца пераносіцца, ствараючы клясычны прыклад сытуацыі «ні туды, ні сюды». Рукі інстынктыўна чапляюцца за вуглы праёмаў. Далей на далей, укрыжаваная ў форме літары «Х» на сьцяне паміж вокнамі, былая дацэнтка краем вока бачыць, як у кабінку мужчынскай прыбіральні заходзіць сын. Рызыкуючы бразнуцца з трэцяга паверху, яна паволі аднімае адну руку і, намацаўшы ў кішэні цыліндрык губной памады і кавалак паперы, асьцярожна дастае іх. Пасьля выхоплівае іртом каўпачок і пачынае пісаць памадай на кавалку паперы, прыціскаючы яго да сьцяны носам. Пасьля гэтага камечыць паперчыну і прымудраецца шпурнуць яе праз загадзя адчыненае вакно мужчынскай прыбіральні. Ня толькі шпурнуць праз вакно, але і пацэліць ў зазор пад дзьвярыма кабінкі, дзе чакае гатовага рашэньня сын.

За дваццаць хвілінаў да заканчэньня іспыту хлопец з папяровым камяком у кішэні заходзіць у аўдыторыю. Асьцярожна, каб ніхто ня зьмеціў, разгортвае матчын аркуш пад партаю. На аркушы размашыста накрэмзана нязграбнымі чырвонымі літарамі:

«ТРЫМАЙСЯ, СЫНОК, МАМА З ТАБОЙ».

— Такой бяды! Палятаалі-палуналі над вулкамі і ціхенька вярнуліся ў родную дзвюхпакаёвачку.

— Вось тут і праблема, доктар. Не лятаецца мне над Афакімам. Ведаеце, толькі выпырхну ў вакно — адразу нясе ў Тэль-Авіў. Цэлую ноч над ім кружляю, а потым яшчэ палёт назад. Надта ўжо ўтомна. Зьнябудуся за ноч, а нараніцу ізноў на працу — а гэта мне цяжка. Памажы-

Працяг на старонцы 40.

# Менскае каханьне Лі Гарві Освальда

**Працяг са старонкі 39.**

це, доктар.

Прыкладам, ён дурэе ад Афакіму. Нью-мястэчка спасярод пустэльні: згубленыя паміж выдмамі цыстэрны з таматным сокам, кампульсіўная настальгія па сьвініне. Вось словы з укладзенага ім «Імігрант-п’ян-блюзу»:

A-fuck-фак-факім — Файны горад для алім.

«Алім» — гэта па-габрэйску «іміграНты».

— А там выляталі?

Для доктара Шапіра гэтае слова даўно страціла сваю актуальную таямнічасьць. І для яе яно, хутчэй, прафэсійная прылада ўвайсьці ў сутонлівы лес вобразаў сваіх пацыентаў. Слова-ключ для пасьпяховай працы. Яна, са стажам не адну сотню год і з досьведам працы не з адной тысячай эмігрантаў, ня памятае, адкуль паходзіць сама і дзе яе там, мо Заходняя Ўкраіна, а мо...

Мо Заходняя Ўкраіна,
А мо Паўднёвая Караліна.

(Музыка і словы сына.)

— Адзін раз, доктар. Над Менскам, зімой 1964. Па радыё ўжо абвесьцілі, што гэта Гарві забіў Кенэдзі. А мне, ведаеце, так стала журка на душы, іду па вуліцы, а нешта такое віруе ў жываце, і тут як нейкі стрыжань падымае ў паветра. Ачомалася, гляджу — Менск пада мною, а я адляцелася на самы пачатак Горкага. Потым па над таполямі кірую ў бок скверу. І далей: па-над Опэрным, Дом тэлебачаньня, па-над Круглай, па Варвашэні, уздоўж Якуба Коласа, ля ЦУМу, рэспубліканская больніца, парк Чалюскінцаў. Тут расьцяроб якісь пачаўся — кідае туд-сюд: то на Чкалава, то на Лодачную, то на Чыгуначную, вядома — вакзал, потым — Маскоўская, Магілёўская, Асаналіева... Не, Асаналіева тады яшчэ не было, былі — Жылуновіча, Брылеўская, туды мяне і запраторыла, Кузьмы Чорнага, Ерусалімская....

— Усё, што я магу для вас зрабіць, — гэта павысіць дозу адпачынку. Дарэчы, Ерусалімскай тады яшчэ таксама не было...

— Дзякуй, доктар. Сапраўды не было. А адкуль вы... Вы мянчучка, доктар Шапіра?

— Хутчэй за ўсё не. Сама ня ведаю, адкуль ведаю... Стоп, пачакайце, пачакайце. Я толькі не зразумела, чаго вы не жадаеце: не лятаць або не працаваць?

— Чаго я сама не жадаю?

— Так. Гэта важна. Паслухайце, я даю вам два тыдні адпачыць: пабудзеце дома, узважыце ўсё пры вольнай часіне, — кажа ды піша бальнічны на два тыдні аплачанага сацыяльным страхаваньнем адпачынку. — Падумайце і прыходзьце ўжо з адказам.

На бальнічным жанчына едзе ў Тэль-Авіў. На кічліва намаляваным рэклямным плякаце чацьвёрка «Бітлз» п’е колу з саломінак і есьць шаўрму — гэта Тэль-Авіў, мо першы яе наземны візыт.

Менская каханьне Гарві Лі Освальда заходзіць атрымаць грашовую дапамогу як новая рэпатрыянтка ад ізраільска-амэрыканскага дабрачыннага таварыства імя Дж. Ф. Кенэдзі. У фае выстаўленыя раньнія здымкі Мэрылін Манро. Каханыя жанчыны прэзыдэнта і яго забойцы сустракаюцца. У Мэрылін твар ушпіляны вясьнянкамі.

Мэрылін па-ранейшаму маладая,
Мама па-ранейшаму жывая.

Гэтыя радкі прыдумаў ня сын. Гэтыя радкі прыдумала сама жанчына, ведаеце, неяк вырвалася, а што вы думаеце — таксама здольнасьці ёсьць, творчыя таленты. Яна ж яго і нарадзіла. Ад яе сыночак і ўспадкаваў. Як ён кажа: «Мы ж сваякі, мама».

«Як табе наша блізкаўсходняя філія Нью-Ёрку, мама? Чаму не зайшла ў госьці, калі была ў Тэль-Авіве, мама?»

У вечар перад візытам у паліклініку жанчына ўжо ведае адказ. Займае гарызантальнае становішча, каб, адпачыўшы пару-тройку гадзінаў, яе цела ўзьнялася зь нерасьцеленага ложка, вымкнула ў вакно і пакінула сьпесчаную правінцыю.

Па Сокалава, па Караля Георга V, па-над рогам Кацнэльсана і Генэрала Аленбі, па Жабатынскага, уздоўж Ротшыльда і Бэн-Егуды, па Арлозараву ў бок плошчы Іцхака Рабіна (былая Ўсіх Цароў), жылыя дахі раёну Флёрэнтын, стары аўтобусны вакзал, паміж хмарачосамі «Азрыелі», рынак, Ерусалімская...

І далей, далей: праспэкт Джона Кенэдзі, бульвар Мэрылін Манро.

Доктару Шапіры
Паліклініка г. Афакім

Просьба.
Шалом, доктар! Хачу не працаваць і па магчымасьці не лятаць.
З павагаю,
Імя.
Подпіс. Дата.

Стаіць на парозе сыноўняй кватэры. Трымае ў руках далікатную валізку.

— Вось толькі што тэлефанавалі з сацыяльнага страхаваньня. Інваліднасьць даюць. Прыязны такі малады чалавек. Сказаў, што пэнсію ўжо афармілі. Ня буду больш працаваць, і ёсьць надзея, што праз пэўны тэрмін скончацца палёты.

— Якія палёты?

— Ня важна, сынок.

— І што ты будзеш рабіць?

Кажа, а глядзіць у сьценку.

— Перабяруся ў Тэль-Авіў. Да цябе, калі пусьціш. Будзем хадзіць на мора, есьці кавун. Захварэла я, сынку. Нават найлітасьцівейшая доктар Шапіра, па-мойму, ня ведае, што са мной. А ў яе, дай ты мне веры, багаты досьвед у лекаваньні хваробаў.

Нарэшце, гэты позірк. Як прахапіўся пасьля душнага сну. Спыняе самакалупаньні, рухаецца разьняволена. Вочы дыхаюць, рукі — машыны для абдымкаў, галава генэруе правільнае пытаньне, слушнае пытаньне — як мае быць:

— Мама, ты памрэш?

Сыны! Гэтак, гэтак размаўляйце з матулямі!

Вочы жанчыны пяшчоцяцца ў адказ. Расьцякаецца струменямі сьмех. Сьмяшлівыя вочы ў абсадзе зморшчынак — згустак спрадвечнай матчынай перавагі.

— Толькі калі сутыкнуся са Спайдэрмэнам, сынок.

# Памёр Камандор паэзіі

21 лютага на 72-м годзе жыцьця памёр народны паэт Чувашыі Генадзь Айгі. Ляўрэат шматлікіх літаратурных прэміяў, Камандор Ордэну мастацтваў і літаратуры Францыі. Аўтар анталёгіяў францускай, польскай і вугорскай паэзіі на чувашкай мове. У 1958 г. Айгі быў выключаны зь літынстытуту за выданьне кнігі, якая падрывае «асновы мэтаду сацыялістычнага рэалізму». Доўгі час вершы Генадзя Айгі друкаваліся выключна за мяжою, найперш у Францыі і Нямеччыне.

З Генадзем Айгі я пазнаёміўся ў 1997 г. на літаратурным фэсьце ў Самары. Ён тады ўразіў мяне сваёй дзіўнай паэзіяй, эўрапейскім сьветаглядам і вытанчанаю культурай. Выглядаў паэт на мудрага праведніка тайгі — праведніка ў невядомае і таямнічае. Нейкі час мы ліставаліся. Паэт дасылаў свае новыя кнігі. У 2001 г. у альманаху «Калосьсе» была надрукавана нізка вершаў Генадзя Айгі ў перакладзе Андрэя Хадановіча.

Адна з апошніх кніг Айгі называлася «Паклон — сьпеву». Як рытуал. Зь песьняю на вуснах разьвітаўся з жыцьцём адзін з самых вядомых у Эўропе паэт шматнацыянальнай Расеі.

**Алесь Аркуш**

## IN MEMORIAM



GALLERY.VAVILON.RU

## ГЕНАДЗЬ АЙГІ

### ПРА ГЭТА

*Я.П.*

Гэта
ня Спрэчка.
Калі ж называю,
то гэта — проста ўказаньне:
«Тут — Дасканаласьць».
(Месца Намёку.
Тым і Прысутнае.
Я замаўкаю.)
«Бог»?
Гэта цытата: з Бога.

1981

### ПОЗЬНЯЕ АДЦЬВІТАНЬНЕ ШЫПШЫНЫ

помніць нібыта душа пра пабоі
ды ачышчаючыся — прамяніцца
раны сама асьвячае захоўваючы сябе

у акрапленьні — уся!

о гэта паветра — бязьлюднасьці!.. —

(ці памёр
нехта
каго і ня помню:

вось і бадзяцца! нікому
каб — нібы вінаваты — ні слова)

1982

### ДОЎГА: У ШОЛАХІ-Й-ШОРГАТЫ

*Зноў — памяці Паўля Цэляна*

Шолахі, шоргаты. Як скавышы па халоднай сьпіжарні і сыплецца дзесьці мука. Ці — скаланае салому ў пакінутым усімі падворку. Шоргат, — нібы нараджэньне якойсьці краіны.

«Быць — мышшу», — казаў той паэт. Быць — мышшу. Галовакружэньне і запамарока. Пасьля гаварылі, што яд. Напалову паляк. Напало-о-о… Быццам за шолахам шатаў — парэз. З бойні. І схаваная ў шоргаце кроў. Хаця б — чалавека-адзежа. Адзіна, адзіна, — у вадкасьці мукаў.

А, рэ-бэ, ты з усяго — і *такога*, і *гэткага* — быў такі аднародны, — бруд, парваная кніга і кроў, — о, амаль што Празрыстасьць, — зімовы вулічны танец, дзіравая сьвітка, чалавека-сумёты (паўсюль бо жабрацкі пот, — нават у саломе: там — на вятры, і ў рассыпанай жменьцы мукі).

Жыцьцё, рэбэ.

А потым, — тут. Гэты твар… — усёабдымны. Быццам ходзіш па горадзе, і паўсюль — «маё», кожны кут. Галавакружна. Пасьля — запамарока. Ну, хаця б вось, — сад (усё гэта — твар і ў твары): выплеснуўся — недасяжнасьцю. Скочыў наўпопяць, боль — як ад шкла. І — ня ўцісь-несь-ся. «Сад — як сад». Быццам — модны матыў. Бяз дна. І — побач.

І як жа такое дзеецца ў голасе: хаваецца нейкае дно. І нават размаўляем — словамі? Вецер. Бяз дна. Не назавеш нават — знакамі.

А гэты, з Вугоршчыны. Проста — брацкая магіла і ўсё. Выкапалі — з усімі разам (бо гэта ж найважнейшае) — у сьвятло Дня, і проста — вось, Радзіма. Вырашэньне пытаньня. З усімі разам (гэта найважнейшае).

«Бог» — хібны выраз. Ёсьць толькі: «А Бог?» На вякі вякоў.

Потым — гэтыя выправы. Ка-тань-ні. Па ўзнагароды. Прамовы. Усё слушна. У славу. І ўсё — быццам: па-паветры! І быццам па небе гу-ля-е: боль-мова, — самотна, — для неба. Пуста. Падохнеш, — сьціснешся — адно болем. Мова? — Вецер Сусьвету.

О, як усё проста. Гэта — такое «проста», што ў мове — ня будзе. (Можна паспрабаваць. Адразу выступіць — рэч. «Простае», — такая Свабода, — для параўнаньня: розум увёў распад.)

Запамарока. Проста, галавакружна.

О, шолахі, шаты мае. Салома. Сьмець-ць-це. О, шоргат, скура мая. Я-радзіма, я-такая-адзежа-і-плоць. З шолахам-скурай.

Запамарока.

Хай ніхто не крычыць. То бок. Ня я ж. «Я» — ліпкае. Ёсьць штосьці іншае (за — шолахам. За гэтым шоргатам).

І ў вадзе гуляе зрок гэтага француза. Падлі-і-і-іна.
Што гэта, — сутнасьць? — шаты?
А-дзін-ства.

Забудзь. О, калі ж. Забудзь. І — *пачынаецца чысьціня.*
І.

Запамарока. З усім брудам — мукаў.

Без — усплыцьця.

Не-Варteme.

Не-е.

1991

*Пераклаў з расейскай Андрэй Хадановіч*

# Раб на рабе і рабом паганяе

**ФРАНЦ СІЎКО**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

На БТ сэрыял «Генэралісымус» пра Сталіна — Бог мой, як саладка! Тэлевізары не пераварочваліся, інстанцыі заявамі-пратэстамі не завальваліся. Назаўтра і гаворкі іншай не было чутно ў горадзе, як пра шчодрасьць на добрае для народу таго вусатага дзядзькі. І гэта пасьля ўсяго, што напісана-выдадзена пра тырана. А кажуць, хто аднойчы волі паспытаў, на вякі вечныя будзе ёй адданы. Шчасьлівая Ахматава, што насуперак запавету-прыпушчаньню помніка, дзе прасіла — на Лубянцы, — не дачакалася: можа, і заплявалі б сёньня во такія «сцэнарысты» ды «писатели». Ні Грахоўскі іх не пераканае, ні Салжаніцын, ні Шаламаў, ні мільёны іншых, хто на сабе зьведаў хараство ГУЛагу. Хіба што ўласны досьвед паможа — ці надоўга толькі? — апрытомнець.

* * *

Цёмнае, вычварнае, нялюдзкае прэ з усіх шчэлак. Вось ужо і бібліятэкарам у размовы са староньнімі на працоўным месцы «рэкамендавана» не ўступаць, і настаўнікам ад галоўнай тэмы ўроку ні на сантымэтар не адхіляцца, і таго ды гэтага ў аўдыторыю да люду паспалітага не пускаць. А часта ў якасьці падбухторшчыкаў да такіх «рэкамэндацыяў» — п'яніцы вядомыя, абібокі, нікчэмнасьці. Напярэдадні Караткевічавых угодкаў, праз пару дзён пасьля ўстаноўчага сходу «правільнага» пісьменьніцкага саюзу аднаму з такіх патэлефанавалі, каб да ўдзелу ў чытаньнях пры бібліятэцы запрасіць. «З гэнымі? Ні ў якім разе! — адказаў абурана. — І наагул ведайце: апошні раз сатана баль правіць!» Сатана — калегі па літцэху, якімі без малога два дзясяткі гадоў кіраваў і насуперак якім каго і адкуль толькі мог — і тых, каго брудам неаднойчы абліў, і тых, каго ня тое што за творцаў — за людзей ня лічыць, — агітаваў-валок дзеля лічбы на памянёны зьезд. Насамрэч — сатана.

* * *

Яшчэ злачынцамі не аб'яўленыя — а ўжо пачуваемся імі, веніка, пад якім перасядзець-перачакаць навалу можна было б, шукаем. Зь пяцісот з гакам сяброў пісьменьніцкай суполкі на лёсавызначальным апошнім зьезьдзе — дзьве з палова сотні. Зразумела: дзень працоўны, ды непагадзь, ды мала што яшчэ... Перасьцярога, вядома ж: а раптам убачыць хто на той «апазыцыйнай» сходцы, і даводзь тады, што не вярблюд. Ды і клопат не абы-які пры стале трымае: твор несьмяротны конча трэба завяршыць, каб у зборнік побач з Быкавым пасьлязаўтра пасьпець уціснуцца. То хай Марыйка Баравік з Падсьвільля — што ёй губляць, усё адно бяднейшаю ужо, як ёсьць, ня стане. Ацніхнуць жарсьці, тады і мы пасьмялеем, пагамонім-паразважаем — можа, і прылюдна нават — пра... подзьвіг Каліноўскага.

* * *

Дзьве рэчы найбольш распаўсюджаныя сярод нашага чынавенства. Першая — неадольная прага ўласьцівыя свайму асяродку правілы гульні на іншыя сфэры, у тым ліку і на тыя, дзе яны няшмат разумеюць (напрыклад, на творчую), пераносіць. Другая — ацэньваць (і асуджаць, адпаведна) чалавека па тым, як і што ён думае. Ведаюць: ад думкі, калі яна нават да часу і пад коўдраю хаваецца, да ўчынку — праз слова — адзін крок. І вось гэты крок і трэба нейкім чынам прадугледзець, прадухіліць. З тых, што гэта дасканала засвоілі, ва ўсе часы найлепшыя ў сэнсе выніковасьці паляваньня на іншадумства служкі ад ідэалёгіі выходзяць. А калі яшчэ і мэдыйнае забесьпячэньне на належным узроўні... Мяркуючы па атмасфэры, што сёньня ў маім горадзе пануе, віцяблянам у гэтым сэнсе вельмі «пашанцавала».

* * *

Па тэлевізіі — пра культурна-асьветніцкія цэнтры размова. Дзевятнаццаць у вобласьці мае быць згодна з плянам, а ёсьць адзін — у Лужках Шаркаўшчынскага раёну. Пра Германавіцкі, Язэпа Драздовіча імя, што ў тым жа раёне колькі гадоў дзейнічае, — ні слова. Ня тыя асобы апякуюцца памяцьцю мастака, а як ня тыя — то і нямашака быццам ні апекі тае, ні апекуноў.

* * *

У тым жа цэнтры Германавіцкім зь Лераю Сом літсустрэчу ладзім. Люду — няшмат, хоць і цікавасьць нібыта ёсьць у абарыгенаў да літаратуры, і слова роднага дарэшты ня выракліся. «Папрасіла настаўнікаў, каб прыйшлі — рукамі паразводзілі: няможна, даведаецца хто з начальства, — мала ня будзе, — арганізатарка цэнтру Ада Райчонак, што студэнтаў маіх колісь адданасьцю справе падчас экскурсіі гэтак уразіла, кажа. — Баяцца людзі».

* * *

Няшчасная істота — карова: праз усё жыцьцё абкрадае яе гаспадар, цыркае сабе ў даёнку спадкаемцу каровінаму — бычку — належнае. А тая і радая нібыта, лашчыцца, мычыць ад задавальненьня, як дояць. А можа, толькі ўдае, што радая, мела б голас — вунь бы як бы ашчэрылася? А можа, і не ашчэрылася б: ці мала хто мае яго, а не наважваецца падаць.

* * *

Раб на рабе едзе і рабом паганяе. Раб-дырэктар, рабрэктар, раб-міністар, рабпісака. Першыя трое коштам уціску чужога сумленьня заробак уласны аплацяць, апошні аплату тую, а разам і сам факт рабства прылюдна ўславіць. Усе — сярэдняя кляса, узаконеная, патэнтаваная. Цёпла, утульна і з валізамі па рынках дзеля забесьпячэньня дабрабыту сям'і валэндацца ня трэба. Як слова сэнс свой першапачатковы страчвае! У стражытных раб быў — дык праўдзівы раб, без акалічнасьцяў-прыдаткаў. Сьпелім, сьпелім іх, словы, а карыстацца па прызначэньні, ужываць адпаведна зьместу ніяк не навучымся.

* * *

Яшчэ адзін пост-адвэнт у дадатак да кананічных перадкаляднага ды перадвелікоднага — перадвыбарны. Туды — нельга, там — непажадана, тое — забаронена. «Чаму?» — запытаесься. «Выбары хутка, — чуеш у адказ. — Вось пройдуць, тады, можа...» Як належнае, як Богам самім дадзенае.

* * *

Так званы Дзень роднай мовы... Пара сюжэцікаў на тэлеэкране (з рэвэрансам на адрас уладаў, вядома), яшчэ сёе-тое. І ні ў адным дзяржаўным выданьні, ні ў адной тэлепраграме — пра суд над літаратарскай суполкай, на 2 сакавіка прызначаны, пра забароны кшталту «поручаем принять меры по недопущению проведения в учреждениях образования мероприятий по линии общественного объединения «Союз белорусских писателей» за подпісам міністра, пра адмену на нефілялягічных факультэтах ВНУ курсу беларускай мовы, што мяркуецца ажыцьцявіць зь першага верасьня. Маўчком, ціхай сапай, пад цынічныя хваласьпевы той самай мове, любай сэрцу нібыта.

* * *

Паводле Ўайлда, найпершы абавязак хворага — супакойваць наведнікаў. Ды часта тых якраз, каму і ты, і тваё здароўе, мякка кажучы, абыякавыя. Для некаторых такая магчымасьць супакойваць — своеасаблівы рытуал, пэўнага роду гульня. Але ведаў людзей з гэтае пароды, што ў безвыходнай сытуацыі, як толькі пачыналі ўсьведамляць сур'ёзнасьць пагрозы сьмерці, імгненна мянялі паводзіны: замыкаліся ў сабе, адыходзілі ў лепшы сьвет у абсалютнай самоце. Хоць, ня выключана, гэта таксама гульня — у дакаранкі: мне вось блага было, памёр нават, а вы тым часам дзе былі?

## «Іншы сьвет» Густава Герлінга-Грудзіньскага




Праект Viva Futura выдаў «Іншы сьвет» Густава Герлінга-Грудзіньскага.

«Мая біяграфія — сымбаль XX ст. Жыў у праклятым таталітарным стагодзьдзі, якое, спадзяюся, ужо скончылася. Таталітарызм, гітлерызм, фашызм, саветызм і камунізм — вось грамадзкія сыстэмы, у якіх увасобілася зло, якое пануе паміж людзей», — пісаў Густаў Герлінг-Грудзіньскі.

«Іншы сьвет» — апісаньне расчалавечваньня чалавека ва ўмовах ГУЛагу (куды Грудзіньскі трапіў з турмаў у Гарадні й Віцебску). Раман быў напісаны за дваццаць гадоў да твору Салжаніцына. Гэта погляд эўрапейскага чалавека на расейскае пекла, і ў тым каштоўнасьць рамана. Выдадзены ў 1952 г. у Лёндане, «Іншы сьвет» быў асуджаны або незаўважаны заходнімі інтэлектуаламі, якія яшчэ захапляліся савецкай утопіяй. І на Захадзе Грудзіньускі зазнаў нястачу й перасьлед. Цяпер раман перакладзены на дзясяткі моваў (ужо і на нашую). Паводле апытаньня чытачоў «Rzecz pospolitej», ён заняў чацьвертае месца ў намінацыі «Кнігі, якія стварылі сучаснае мысьленьне».

*Пераклад Сьвятланы Курс,*
*мастацкі рэдактар — Віктар Корзун.*

# Да разнастайнасьці імёнаў

Акадэмік Зігмас Зінкявічус, якога многія лічаць беларусафобам, выдаў нечаканую кнігу.
Піша **Алег Дзярновіч.**

Акадэмік Зігмас Зінкявічус зьяўляецца самым аўтарытэтным з сучасных літоўскіх лінгвістаў, вядомых сваімі працамі па гісторыі літоўскае мовы. Часам падаецца, што ён належыць да ангажаваных дасьледчыкаў. Такія аўтары аддаюць перавагу апэраваньню «ідэальнымі формамі» і хацелі б ператварыць ВКЛ у закрыты клюб. Сам Зінкявічус старанна пазьбягаў праводзіць сувязь паміж Беларусьсю XX ст. і колішнім Вялікім Княствам, а тэрміну «старабеларуская мова» не ўжываў прынцыпова, замяняючы яго словазлучэньнем «канцылярская мова». І гэта пры тым, што лінгвістыка куды больш строгая навука, чым гісторыя, бо пакідае менш прасторы для маніпуляцый. Найбольш ярка ізаляцыяніцкая пазыцыя літоўскага мовазнаўца праявілася ў ранейшых працах па гісторыі Ўсходняе Літвы — Віленшчыны. І гэта зразумела, бо трэба было бараніцца ад славянскай экспансіі.

Таму новая кніжка З.Зінкявічуса, скіраваная на рэканструкцыю панарамы балта-славянскіх дачыненьняў пач. II тыс., стала для мяне нечаканаю. Аўтар, пачаўшы з канстатацыі вядомых палажэньняў: хрысьціянства прыйшло ў Літву з двух бакоў — з Захаду і з Усходу, — робіць новы акцэнт: усходнехрысьціянская хваля «была выключна інтэнсіўнай і пакінула глыбокія сьляды ва ўсёй гісторыі літоўскага народу». Да Літвы яна дайшла значна раней, чым заходняя хваля хрысьціянства. Пра гэта сьведчыць найстаражытнейшы пласт царкоўнай тэрміналёгіі літоўскай мовы, які паходзіць з хрысьціянства ўсходняга абраду: Kalėdos — Каляды, Velykos — Вялікдзень, bažničia — бажніца. (Хоць я б сказаў, што названыя прыклады належаць хутчэй да беларусізмаў, чым да ўсходнехрысьціянізмаў.) Да сяр. XV ст. ля пяцідзесяці літоўскіх князёў прынялі праваслаўе, частка зь іх сталі заснавальнікамі манастыроў. Хутчэй за ўсё, адзначае аўтар, і ініцыятары ўвядзеньня хрысьціянства заходняга абраду Ягайла і Вітаўт першапачаткова таксама былі пахрышчаны ў праваслаўе.

Апроч таго, усходняе хрысьціянства паспрыяла пашырэньню па ўсёй Літве вялікай колькасьці ўласных імёнаў. Фанэтычнымі і граматычнымі асаблівасьцямі імёны выразна адрозьніваюцца ад падобных імёнаў, што прыйшлі з Захаду, таму лёгка распазнаюцца. Зь цягам часу імёны, нададзеныя пры хрышчэньні, ператвараліся ў прозьвішчы. Вось адкуль літоўскія Пятравічусы (ад Пётры), Грыгарасы (ад Рыгора, у той час як існуе форма Грэгорас, што паходзіць ад лацінскага Gregorius)… Прыклады можна працягваць. Літоўскі лінгвіст мяркуе, што ўплыў хрысьціянства ўсходняга абраду стаў адчувацца адразу пасьля хрышчэньня Русі ў 988 г., а ў XI—XII ст. усё больш і больш узмацняўся. Менавіта тады балты пазнаёміліся з многімі асабістымі імёнамі, што даваліся падчас хрышчэньня. Многія балцкія плямёны падпалі пад асыміляцыю, але ж іх астраўныя тэрыторыі дзе-нідзе ў Беларусі захоўваліся яшчэ досыць доўга. Адбываўся працяглы і складаны працэс замены спрадвечнай балцкай мовы на ўсходнеславянскую. І вырашальную тут ролю выканалі хрышчэньне ўсходніх славян, зьяўленьне славянскага пісьменства ды пашырэньне сярод іх бізантыйскай культуры. Зьнікнуўшы на многіх тэрыторыях, куды прыйшлі славяне, балцкія плямёны пакінулі глыбокі сьлед у матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў.

Разважаючы далей, аўтар фактычна стварае новую вэрсію ўзьнікненьня ВКЛ. З.Зінкявічус мяркуе, што насельніцтва былых балцкіх абшараў у XIII—XIV ст. ужо размаўляла на ўсходнеславянскіх гаворках, працягваючы называць сябе ліцьвінамі. «Паводле паходжаньня яны былі ўласна літоўцамі, толькі размаўлялі на іншай мове ды перайшлі з паганства ў хрысьціянства ўсходняга абраду». Гэтае насельніцтва складала значную частку ўсіх жыхароў ВКЛ. Вось чаму «хуткае і значнае» пашырэньне ВКЛ не зьяўляецца нейкім «цудам». Умацаваньне дзяржавы было справаю перш за ўсё карэннага літоўскамоўнага насельніцтва, але важную ролю ў гэтым выканалі і славянамоўныя літоўцы. Асабліва гэта тычыла той часткі насельніцтва, зь якой надалей утварыліся беларусы. Іх продкі пастаянна баранілі сваю дзяржаву і ад Масквы, і ад Польшчы. «Яны пакутліва перажывалі яе [дзяржавы] гібель, яе вобразы яны пастаянна захоўваюць у сваёй гістарыч-



**Зігмас Зінкявічус.**




**Zinkevičius, Zigmas. Krikpčionybės iptakos Lietuvoje: Rytų krikpčionybė vardyno duomenimis.** — Vilnius: Katalikų akademijos leidykla, 2005. — 112 p:, 7 il.

**[Зінкявічус, Зігмас. Вытокі хрысьціянства ў Літве: Хрысьціянства ўсходняга абраду паводле зьвестак анамастыкі.]**

най памяці».

Аўтар кнігі не захацеў пазьбегнуць палемічнасьці стылю. Ён адзначае, што тыя беларусы, якія выразна ўсьведамляюць сваю нацыянальную ідэнтычнасьць, «заўжды з асаблівай павагай ставяцца да Літоўскай дзяржавы [г.зн. да ВКЛ], ганарацца ёй, называюць сябе ліцьвінамі». «Але гэтым нярэдка спэкулююць беларускія «ультрапатрыёты», што сканструявалі антыгістарычную гіпотэзу, паводле якой Літоўская дзяржава была створана ўсходнеславянскім народам, які па-беларуску называецца «ліцьвіны». Гэты народ, паводле іх заяў, быццам бы ня меў нічога агульнага зь літоўскім народам... Зьдзіўляе і лінгвістычнае невуцтва гэтых «гора-патрыётаў», асабліва прымітыўнасьць у тлумачэньні імі этымалёгіі паходжаньня назвы «Літва», імёнаў вялікіх князёў літоўскіх ды інш.». Тут маюцца на ўвазе найперш Мікола Ермаловіч і тыя яго пасьлядоўнікі, якія прапанавалі сапраўды экзатычныя вэрсіі перакладу гэтых імёнаў.

Усё, што рабілася Міндаўгам і Вітаўтам, закончылася за мурамі NATO і ЭЗ.

Затое тут узьнікае новая паралель — фактычна, не прызнаючы гэтага, Зігмас Зінкявічус шмат у чым салідарызуецца з канцэпцыяй Алеся Краўцэвіча, адным з галоўных тэзісаў якой зьяўляецца канстатацыя таго, што ВКЛ узьнікла ў балта-славянскай кантактнай зоне і з самага пачатку было біэтнічнаю балта-ўсходнеславянскаю дзяржаваю з дамінаваньнем усходнеславянскага элемэнту. Беларускі гісторык настойвае на выключна мірным характары адносінаў паміж балтамі і славянамі на тэрыторыі Беларусі. Кніжка А.Краўцэвіча «Стварэньне Вялікага Княства Літоўскага» багата разоў раскрытыкавана ў сучаснай Літве.

Асабіста для мяне ў зьнешне лягічнай канцэпцыі Алеся Краўцэвіча бракавала повязі паміж агульнымі палажэньнямі і фактамі палітычнай гісторыі XIII ст. Дзяржава — гэта заўсёды арганізаваны мэханізм прымусу, і яна не ўзьнікае з таго, што паміж дзьвюма этнічнымі супольнасьцямі існуюць добрыя стасункі, заўжды павінны быць ініцыятары гвалту. Яны не абавязкова цывілізацыйна і культурна пераўзыходзяць кансалідаваныя празь іх супольнасьці, але мусяць быць добра арганізаваныя ў вайсковым сэнсе. На нашых абшарах такую функцыю выканалі балцкія правадыры. Вось гэты малюнак гісторыі ўзбагаціў колерамі Зігмас Зінкявічус, паказаўшы, што дасьледаваньне ўласных імёнаў дапамагае стварыць цэлую панараму падзей. І, значыць, час агульных канцэпцый яшчэ ня скончыўся.

Але разам з тым віленскі лінгвіст, як і ўвогуле частка літоўскіх інтэлектуалаў, таксама стаў прапагандыстам мадэрніцкага бачаньня тысячагадовай гісторыі сваёй краіны. Ён піша: «Шлях літоўскага народу ў заходнеэўрапейскую культуру быў працяглым і зь вялікімі перапынкамі, але гэты шлях, урэшце, і прывёў Літву да ўступленьня ў Эўразьвяз». Вось дзе сьвята для Фрэнсіса Фукуямы зь ягоным «канцом гісторыі»! Усё, што рабілася Міндаўгам і Вітаўтам, закончылася за мурамі NATO і ЭЗ. Можна спыніцца, мэта дасягнутая. Ці ёсьць яшчэ лепшы шлях, каб уціхамірыць мяцежны балцкі дух?

## Дзеяслоў №20




**У новым «Дзеяслове» — вершы Генадзя Бураўкіна і Яўгена Вапы, мэмуарыстыка Янкі Брыля і Ўладзімера Арлова, кінааповесьць Андрэя Федарэнкі, проза Ўладзімера Някляева. Часопіс перадрукоўвае яго прыпавесьць «Чмель і вандроўнік», напісаную на саракавіны па Васілю Быкаву. Шкада толькі, без спасылкі на «НН», дзе твор друкаваўся ўпершыню.**

КАІСА

# На поўдні і ўсходзе

Калі б выбіраўся самы калярытны беларускі шахматыст, мы б аддалі голас Сяргею Каспараву — чаго вартае прозьвішча… 37-гадовы магілёвец пакуль ня гросмайстар, але з рэйтынгам пад 2500 прапісаўся ў вышэйшай лізе. Яшчэ ён вылучаецца тым, што вандруе па краінах, экзатычных з гледзішча шахматнай публікі, і разьбівае міты пра іхнюю экзатычнасьць. Летась Сяргей пасьпяхова выступаў у Лібане, сёлета — у Іране. Менавіта прадстаўнік Ірану Амір Малагі перашкодзіў гульцу зь Беларусі павесьці рэй, нанесшы яму адзіную паразу… Вынік С.Каспарава — 6,5 бала з 9, 13-е месца сярод 278 удзельнікаў. Праўда, асобныя зь іх запісваліся ў турнір *pro forma* і выбывалі, ледзь уступіўшы ў гульню.

У лютым іранцы масава наведалі Маскву, узяўшы ўдзел у фэсьце «Аэрафлёт-2006». Зрэшты, беларуская дэлегацыя сваёй прадстаўнічасьцю засланіла ня толькі Іран, а шмат якія краіны эўразійскае прасторы. Тры вядучыя гросы — Аляксей Аляксандраў, Аляксей Фёдараў, Сяргей Азараў — біліся ў галоўным турніры «А1», экс-чэмпіён сьвету сярод юнакоў Сяргей Жыгалка — у турніры «А2» (вілка рэйтынгу — 2400-2549), Ганна Шарэвіч і чэмпіён Магілёўшчыны Герман Качаткоў — у турніры «В» (ELO 2200-2399)… Сёлета ад нашых чакаліся сэнсацыі, дзеля іх нават запрацаваў сайт chess.by, але… Аляксандраў сышоў з турніру пасьля 6 тураў, набраўшы ўсяго 2,5 бала, Азараў застаўся ў «мінусе». Найлепшым чынам адпрацавалі ўнёскі Фёдараў, Жыгалка і Качаткоў: усе ўзялі па «плюс 2». У турніры «С» — для аматараў — даволі годна сябе паказалі беларускія «вэтэраны», якім за 50: Уладзімер Абламскі, Валянцін Казанцаў, Аляксей Севянюк.

**ВР**

**Як бы вы згулялі?**

С. Каспараў, Беларусь—А.Абэдзі, Іран. Тэгеран, 2006. Ход белых. Чорныя толькі што ўзялі пешку на f5…



**Адказ:** дасьціпны ход 1. Кd4! прынёс белым вырашальную перавагу.

## ВЫСТАВЫ

**«Вызнаньне ў каханьні»**
Заля жывапісу.
Экспазыцыя, што адкрылася **1 сакавіка** і будзе дзейнічаць да **12 сакавіка**, прытарнаваная да Міжнароднага году маці. Удзельнікі — жанчыны-мастачкі, сябры Саюзу мастакоў і Моладзевага аб'яднаньня пры ім — Зоя Літвінава, Нінэль Шчасная, Валянціна Сьвентахоўская, Валянціна Грыгарышына і іншыя. Яны прэзэнтуюць жывапіс, графіку, скульптуру, дэкаратыўна-ўжытковае мастацтва. Многія работы пакажуць у першыню. Гэта жывапісны цыкль «Гульнявыя карты» Зоі Луцэвіч, сэрыя карцінаў у стылі «наіў» Людмілы Шчамялёвай.
Кошты квіткоў: 1000—2000 руб.
Палац мастацтва, вул. Казлова, 3.
Т.: 290-60-10, 288-15-49.

**Пра сьвет**
Выстава жывапісу, графікі, акварэлі і фота ў мастацкай галерэі «Ўнівэрсытэт культуры» (Кастрычніцкая пл., 1). Адкрыцьцё 3 сакавіка а 17-й. Уваход вольны.

## ТЭАТАР

**Тэатар імя Горкага**
**3** (пт), **4** (сб) — «Злоўленыя сеткай».
**5** (ндз) — «Krok o'Дыл».

**Купалаўскі тэатар**
**3** (пт) — «Чычыкаў».
**4** (сб) — «Памінальная малітва».
**5** (ндз) — «Дзіўная місіс Сэвідж».
*Малая сцена*
**5** (ндз) — «Беларусь у фантастычных апавяданьнях».

**Музычны тэатар**
**4** (сб) — «Даратэя».
**4** (сб) — «Стойкі алавяны жаўнерык».
**5** (ндз) — «Ноч у Вэнэцыі».
**5** (ндз) — «Залатое кураня».

**Тэатар беларускай драматургіі**
**3** (пт) — «Адвечная песьня».
**4** (сб) — «Містэр Розыгрыш».
**5** (ндз) — «Ганна ў тропіках».

**Тэатар лялек**
**4** (сб), **5** (ндз) — «Папялушка».




**Спампуй сабе «Песьні Свабоды»! http://music.fromby.net/sliberty**

## СПОРТ

**Хакей. Адкрыты чэмпіянат Беларусі**
Панядзелак, 5 сакавіка, матчы апошняга туру рэгулярнага чэмпіянату
«Гомель» — «Хімвалакно» (Магілёў).
«Берасьце» — «Дынама» (Менск).
«Нёман» (Горадня) — «Керамін» (Менск).
«Хімік-СКА» (Наваполацак) — «Юнацтва» (Менск).
Пачатак а 18.30

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

### Шмат сэксу — і нічога

**Іншы сьвет 2: Эвалюцыя** (Underworld: Evolution).
ЗША, 2006, каляровы, 106 хв.
**Жанр:** вампірычны баявік.
**Адзнака:** 4,5 (з 10).

Вампірыха-дыс ыдэнтка (Кейт Бэкінсэйл) у кампаніі з палюбоўнікам-ваўкалакам змагаецца з псыхапатам-вампірам і разгадвае старажытныя таямніцы. Гледачы разгубленыя ад няўцямнага сюжэту. Але фільм — не гісторыя, а гульня з фэтышамі.
Арыстакратычная атмасфэра, ультрафіялетавае сьвятло, чорная кроў, аўтаматы з антывампірскімі кулямі ўскладняюцца ў другой частцы «Іншага сьвету» гелікоптэрамі, караблямі, старажытным палацам і падводным плаваньнем. Ваўкалак Майкл паўтарае подзьвігі Кінг Конга, а гераіня Сэліна адточвае карательскія навыкі.
Але галоўная фішка другое часткі — стала болей сэксу. Вампір-гісторык ладзіць оргіі ў кляштары, аголеныя бляндынкі й брунэткі зь ікламі дэманструюць схуднелыя формы; але галоўнае, Лен Ўайзман у палюбоўнай сцэне распрануў Кейт Бэкінсэйл.
Вампірская лялька ўжо не баіцца сьвятла, але гэта ня значыць, што героі «Іншага сьвету» стануць калісьці людзьмі. Зьляканая білетэрка скардзілася, што ў фільме зашмат крыві. Але ў глямурнай карціне няма ні кроплі *жывой* крыві.

**Андрэй Расінскі**

## ВАРТА ПАГЛЯДЗЕЦЬ

### Субота, 4 сакавіка

**БТ, 14.25**
«Маем рэчы».
Беларусь, 2006, рэжысэр і вядоўца Алесь Матафонаў.
Гэты выпуск прысьвечаны вышыванцы.

**БТ, 23.00**
«Падвойная порцыя».
ЗША, 2004, рэж. Морган Спэрлак.
Дакумэнтальны фільм.
Морган Спэрлак вырашае паставіць экспэрымэнт. На працягу месяца ён харчуецца толькі ў «Макдоналдсе». Адначасова рэжысэр наведвае самыя «тлустыя» гарады Амэрыкі і распавядае ўсю праўду пра хуткае харчаваньне.
Падвойная порцыя сакавітых фактаў. Скандальны дэбют Моргана Спэрлака. Гіт у ЗША, прыз незалежніцкага кінафэсту ў Сандэнсе.

**СТВ, 23.50**
«Берагавая ахова».
Паўдзённая Карэя, 2002, рэж. Кім Кі Дук.
Драма.
Капрал берагавой аховы забівае хлопца на вачох дзяўчыны. Капрала ўзнагароджваюць, але ён становіцца небясьпечным нат для вайскоўцаў. Бераг паміж дзьвюма Карэямі спараджае зло й шаленства...
Жорсткі й страшны фільм Кім Кі Дука, які сам правёў пяць гадоў у карэйскае арміі. Узнагароды ў Карлавых Варах.

### Панядзелак, 6 сакавіка

**«Лад», 16.30**
«Цені забытых продкаў».
Украіна, 1964, рэж. Сяргей Параджанаў.
Паэтычная драма паводле аднайменнай аповесьці Міхаіла Кацюбінскага. Украінскі шэдэўр Сяргея Параджанава. Трыюмф паэтычнага кіно.

### Серада, 8 сакавіка

**НТВ, 13.00**
«Зьнесеныя ветрам».
ЗША, 1939, рэж. Віктар Флемінг, Джордж К'юкор.
Гістарычная мэлядрама паводле аднайменнага раману Маргарэт Мітчэл.
Каханьне й выпрабаваньні Скарлет О'Хары падчас Грамадзянскай вайны... У галоўнай ролі Вівьен Лі. Фільм застаецца адным з найлепшых за ўсю гісторыю амэрыканскага кіно.

### Чацьвер, 9 сакавіка

**БТ, 22.20**
«Кухар-злодзей».
Нямеччына—Аўстрыя, 2004, рэж. Пэпэ Дэнакўарт.
Крымінальная трагікамэдыя.
Мафіёзі Оскар — гурман і кухар. Ён зьбіраецца кінуць сваю «прафэсію» і напісаць кнігу. Гэта выклікае сур'ёзную занепакоенасьць ягоных «працадаўцаў»....

### Пятніца, 10 сакавіка

**БТ, 10.25**
«Колер каханьня».
Беларусь, 2004, рэж. Аляксандар Кананові ч.
Камэдыя.
Недарэка-жаніх пафарбаваны ў незмывальныя колеры... Найлепшая беларуская кінакамэдыя за апошнія 20 гадоў.

**АР**

## КІНО НА DVD

Master Records
**«Гарбатая гара».**
Мэлядрама, ЗША, рэж. **Энг Лі.**
У ролях: **Гіт Лэджэр, Джэйк Гіленхаал**
Гісторыя каханьня. Паміж двума каўбоямі. Прыз Вэнэцыянскага кінафэсту, «Залаты глёбус», намінацыі на «Оскар».
**Менск, вул. Кісялёва, 12, 643-21-08**

**...пасьля публікацыі карыкатур на прарока ў газэце «Згода» ісламскія краіны пачалі байкатаваць экспарт зь Беларусі.**



«Пасьля таго як жыхары гэтай усходняй краіны абвясьцілі байкот беларускаму экспарту, грамадзянская вайна набыла прымітыўны фармат».

**...пракуратура адэкватна ўспрыняла словы прэзыдэнта аб тым, што яго хакейная каманда — «палітычная арганізацыя».**




— За што цябе загрэблі?

— Палітычны я. Павязалі за ўдзел у незарэгістраванай палітычнай арганізацыі — «Хакейная каманда прэзыдэнта».

**...Казулін, рыхтуючы выступ на БТ, абіраў варыянты.**




Малюнкі і тэксты Лёліка Ушкіна

## У НУМАРЫ


### Віктар Лукашэнка



стане старшынём Бабруйскага гарвыканкаму? **Старонка 4.**

### ДзДз: чаго не хапала мне як носьбіту расейскай мовы



Інтэрвію з паэтам Дзьмітрыем Дзьмітрыевым. **Старонка 22.**

### Кішка



Алесь Белы пра крывянку ў рубрыцы «Наша страва». **Старонка 34.**

### Калі б...



Фантазіі Лёліка Ушкіна на тэмы суровай рэчаіснасьці. **Старонка 47.**

### Генадзь Айгі



Вялікі паэт у перакладах Андрэя Хадановіча. **Старонка 41.**


## ЖАРТЫ

Увага! Новы сэрвіс! Зрабі сюрпрыз сваім сябрам!

Спраўныя маладыя людзі пераставяць мэблю, ператрасуць бялізну, вынесуць старыя паперы.

Зьвяртацца на тэлефон даверу КДБ.

* * *

Унук пытаецца ў дзеда:

— Дзед, ты на вайне быў?

— Ну!

— Што ну?

— Ну ня быў!

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Нікіфару С. з tut.by.** Беларускі Дзень абаронцы Айчыны — гэта Дзень беларускай вайсковай славы 8 верасьня. Мяняць традыцыю, пераносячы гэтае сьвята на 3 сакавіка, няма сэнсу.

**Юр'ю Ю.** «Уздымаючы сьцягі Алістэра Кроўлі»: на тэму першае часткі многа рэфлексаваў Славамір Адамовіч, на тэму другой — Адам Глёбус. Ці ёсьць сэнс паўтарацца?

## «НН» 100 ГАДОЎ З ВАМІ

**В. Лугаўцы,** Мін. губ., Барыс. пав. Тутака ёсьць адзін вельмі скупы гаспадар. Вось пасватаўся да яго дачкі адзін хлапец: усё пайшло гладка, і меліся ўжо ехаць да шлюбу. Ажно бацька дзяўчыны, раздумаўшы, сказаў маладому, што пасагу ня дасьць. І вясельле расстроілася, і дзяўчына чуць не зарэзалася, бо хлапца крэпка любіла. Так за грошы марнуецца шчасьце людзей.

**Лугаўскі чалавек**

З **Хаценчыцкай воласьці** Вялейск. пав., Віленск. губ. Як я знаю, выехала ў Амэрыку 16 душ, аб чым і паведамляю, як прасілі ў№3 «НН».

**Ю.Д.**

**«НН». 1911. №9—10. 10 сакавіка.**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІНШАВАНЬНЕ

**Віцебскія літаратары** сардэчна віншуюць зь юбілеем паэтку Марыю Баравік і зычаць юбілярцы шчодрага плёну ў творчасьці, добрага здароўя, моцы духу!

### КАНТАКТЫ

**Спадару Лявону** з Гомелю просьба ператэлефанаваць Алесю ў Менск (не магу знайсьці ваш тэлефон)

**Маладая гард-кор каманда** «K+FA» запрашае менчукоў і гасьцей гораду на прэзэнтацыйны канцэрт сваёй творчасьці. Ён адбудзецца 3 сакавіка а 19–й у канцэртнай залі «ХДН» (вул.Бельскага, 15). Уваход вольны

### КНІГІ

**Распаўсюд. Абмен.** Гісторыя, фальклёр, постмадэрнізм, літаратура, псыхалёгія, канфэрэнцыі, круглыя сталы, кнігі, аўдыё, пошта, Інтэрнэт. E–mail: alesknigi@mail.ru; 220030, Менск, а/с 195

**Прапаную**: Лёсік «Збор твораў», «Беларускі клясычны правапіс», «Нашу Ніву» (факс. выд.), «Матэматычную энцыкляпэдыю», дзіцячыя кніжкі, пісаныя клясычным правапісам, камплект падручнікаў па старабеларускай, старарускай мовах і іншае. Т.: 753–91–96

**Прапаную кнігі**: «Быкаў на Свабодзе», «Беларуска-польскі размоўнік», Байкоў, Некрашэвіч «Беларуска-расейскі слоўнік» 1926 г., «Статут ВКЛ 1529 г.» Вільня 2004, вялікі фармат, Кацар «Беларускі арнамэнт», энцыкляпэдыя «Беларуская міталёгія» ды іншае. Т.: 753–70–05

**Новыя ды факсымільныя** выданьні «Нашае Нівы», ARCHE», «Спадчына» (старыя нумары), рэдкія слоўнікі, кнігі, энцыкляпэдыі, фільмы ды музыка на CD на Румянцава, 13 (ТБМ). Панядзелак — пятніца (15.00 — 20.00). Т.: 707–40–01

### ПРАЦА

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры, мове. Зьвяртацца загадзя пасьля 17–й. Т.: 235–18–72, Юрась

Дэмбскаму Віктару.
Каханы Віця!
З нагоды твайго Дня нараджэньня хачу табе пажадаць любові, супакою і радасьці.
Няхай Бог адорыць цябе ласкамі, якія ты патрабуеш.
Твая Інэса.

Прыватныя абвесткі ў «НН» (ня больш за 15 словаў) дасылайце поштай (а/с 537, 220050 Менск), праз e–mail (nn@promedia.by) або разьмяшчайце на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!


**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| фотарэдактар | Арцём Лява |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**


© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 112. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2821. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 23.00 01.03.2006.

Замова № 1194.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а